Акадэмія Навук Беларускай ССР
Ордэна дружбы народаў
Інстытут Літаратуры імя Янкі Купалы

## А. Л. Верабей

# Максім Танк і польская літаратура

Мінск
«Навука і тэхніка»
1984

ББК 83. 3
Бел 7 В 31

Рэдактар
М. М. Арочка, доктар філалагічпых навук
Рэцэнзенты
В. П. Рагойша, І. С. Шпакоўскі, кандыдаты філалагічных навук

Верабей А. Л.

Максім Танк і польская літаратура.— Мн.: Навука і тэхніка, 1984.— 120 с.

85 к.

У манаграфіі вядзецца размова аб традыцыях польскага рамантызму XIX ст. у паэзіі Максіма Танка, аналізуюцца ўзаемаадносіны творчасці беларускага паэта з польскай літаратурай 20-30-х гадоў XX ст. і сучаснай, даследуюцца пераклады Максіма Танка з польский паэзіі і пераклады яго твораў на польскую мову, даецца ацэнка працам польскіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў, прысвечаным творчасці паэта.

Разлічана на навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, аспіраптаў і ўсіх тых, хто цікавіцца пытаннямі літаратурных сувязей і тэорыяй мастацкага перакладу.

4603010202—042
М 126—81 ------ ББК 83. 3
Бел 7+83.3 IN
М316—84

© Выдавецтва «Навука і тэхніка», 1984.

## УСТУП

У апошнія гады параўнальнае вывучэнне літаратур стала адным з асноўных напрамкаў савецкага літаратуразнаўства. На сучасным этапе, калі адбываюцца працэсы інтэнсіўнага ўзаемазбліжэння і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур, перад беларускімі літаратуразнаўцамі стаіць задача ўсебакова даследаваць беларускую літаратуру ў параўнальна-супастаўляльным плане ў першую чаргу з суседнімі рускай, польскай, украінскай і літоўскай літаратурамі. Гэта дазволіць раскрыць новыя старонкі яе развіцця, глыбей высветліць некаторыя істотныя моманты яе гісторыі, больш дакладна вызначыць яе ролю і месца ў сусветнай літаратуры.

Беларуская літаратурная навука прыкметных поспехаў дасягнула ў галіне паланістыкі. Больш поўна вывучаны сувязі беларускай і польскай літаратур XIX і пачатку XX ст., у меншай ступені — 20-30-х гадоў, кантакты гэтых літаратур у пасляваенныя гады і на сучасным этапе. Таму вывучэнне творчасці М. Танка ў параўнальным плане з польскай літаратурай набывае асаблівую актуальнасць і значнасць.

У беларуска-польскіх літаратурных адносінах апошніх пяцідзесяці гадоў творчасці М. Танка належыць асабліва важная роля. Гэта абумоўлена моцнымі сувязямі паэта з перадавой польскай культурай, яго перакладчыцкай працай, а таксама шматлікімі перакладамі яго твораў на польскую мову. Узаемадзеянне паэзіі М. Танка з польскай літаратурай — адна з самых яркіх старонак беларуска-польскіх літаратурных адносін XX ст. Тым не менш у беларускім літаратуразнаўстве вывучэнне сувязей паэзіі Танка з польскай літаратурай не было прадметам спецыяльнага даследавання.

Праўда, у працах «Паэзія змагання», «Зорны спеў» У. Калесніка, «Паэзія праўды» Р. Бярозкіна, «Паэзія Максіма Танка» Д. Бугаёва, «Паэтыка Максіма Танка» В. Рагойшы, «Галоўная служба паэзіі» М. Арочкі характарызаваліся некаторыя аспекты сувязей М. Танка з рускай, украінскай і польскай літаратурамі. Але ў гэтых даследаваннях разглядаліся ў асноўным сувязі творчасці паэта з суседнімі літаратурамі ў давераснёўскі час. Беларускія крытыкі выказалі цікавыя меркаванні пра творчую вучобу М. Танка ў першай палавіне 30-х гадоў у рускіх і польскіх паэтаў XIX ст., пра ўзаемадзеянне яго творчасці з рускай і польскай рэвалюцыйнай паэзіяй, пра адносіны паэта да еўрапейскіх авангардысцкіх кірункаў 20-30-х гадоў. Далейшы крок у распрацоўцы гэтага пытання быў зроблены В. Гапавай у

артыкулах «На шляхах братэрства і барацьбы»[1] і «Максім Танк-перакладчык славянскіх паэтаў»[2].

Шэраг крытычных артыкулаў пра творчасць М. Танка з'явіўся ў польскім друку 30-х гадоў, а таксам а ў перыядычных выданнях народнай Польшчы. Некаторыя з іх выклікаюць асаблівую цікавасць, яны закранаюць істотныя і важныя моманты беларуска-польскіх літаратурных адносін.

Сувязі М. Танка з польскай літаратурай вельмі даўнія, багатыя і разнастайныя. Пачынаючы з 20-30-х гадоў, калі паэт жыў у былой Заходняй Беларусі, і па сённяшні дзень на яго духоўнае жыццё аказвае прыкметны ўплыў польская літаратура.

Узаемадзеянне творчасці М. Танка з польскай літаратурай трэба разглядаць строга гістарычна, як састаўную частку беларуска-польскіх літаратурных адносін, якія існавалі ў мінулым і плённа развіваюцца ў цяперашні час.

---

[1] Садружнасць літаратур.— Мн., 1968, с. 28-71.

[2] Старонкі літаратурных сувязей.— Мн., 1970, с. 5-59.

# АБ ТРАДЫЦЫЯХ ПОЛЬСКАГА РАМАНТЫЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

На творчасць М. Танка значны ўплыў зрабіла польская літаратура. Яшчэ ў дзіцячыя гады будучы паэт пазнаёміўся з творамі рускіх класікаў і з творчасцю Шаўчэнкі. З 1916 па 1922 г. ён разам са сваімі бацькамі жыў у Маскве. Пісьменнік успамінае: «Першая кніга, якая пакінула незабыўнае ўражанне, была кніга М. Гогаля «Вечера на хуторе близ Диканьки». Потым Пушкін, Лермантаў, Някрасаў, Шаўчэнка... Я любіў вершы. Ведаў цэлыя паэмы на памяць. Пару сшыткаў з перапісанымі вершамі прывёз з сабой нават на радзіму, дзе ў той час ужо гаспадарылі пілсудчыкі»[1].

Сувязі М. Танка з польскай літаратурай маюць глыбокія карэнні. Так, у 1922-1926 гг. ён вучыўся ў Шкленікоўскай і Сваткаўскай польскіх пачатковых школах, за час вучобы ў якіх «прачытаў амаль усе кнігі ў школьнай бібліятэцы: Міцкевіча, Славацкага, Сянкевіча, Крашэўскага, Ажэшкі, Канапніцкай»[2].

У беларускім календары за 1925 г. упершыню прачытаў наступныя радкі Я. Купалы:

...Карчмы ды астрогі,
Крыжыкі, бярозкі:
Гэта наша доля,
Доля нашай вёскі...[3]

Гэты верш быў напісаны як бы пра заходнебеларускую вёску. У душы хлопчыка разам з песнямі і казкамі маці, разам з Пушкіным, Някрасавым, Шаўчэнкам, разам з польскімі класікамі заняла сваё месца мілагучная і блізкая яму паэзія Я. Купалы.

У аўтабіяграфічных «Лістках календара» паэт піша: «Паэзія павінна адкрываць новае. Інакш яна перастане быць паэзіяй. А новае трэба шукаць на жыццёвых шляхах не толькі свайго, але і іншых народаў»[4]. Безумоўна, на характар даверасnёўскай творчасці, у якой ён працягваў і развіваў беларускія літаратурныя і фальклорныя традыцыі, уплывала заходнебеларуская рэчаіснасць. Аднак у пошуках новых ідэйна-мастацкіх каштоўнасцей паэт звяртаўся таксама да

---

[1] Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў.— Мн., 1963, с. 468.
[2] Там жа, с. 469.
[3] Купала Янка. Зб. тв.: У 7-мі т.— Мн., 1973, т. 2, с. 74.
[4] Танк Максім. Зб. тв.: У 6-ці т.— Мн, 1981, т. 6, с. 267. У далейшым творы М. Танка і яго пераклады з польскай паэзіі, за выключэннем асобна агавораных, даюцца па гэтаму выданню. У дужках том і старонка.

вопыту рускай, польскай, украінскай, літоўскай і ўвогуле сусветнай паэзіі.

У давераснёўскай творчасці М. Танк імкнуўся стварыць канкрэтна-гістарычную карціну рэчаіснасці. Аднак рамантычны пачатак у тагачасных творах паэта вынікаў як з імкнення рамантызаваць гераічную барацьбу ў Заходняй Беларусі, так і з асаблівасцей таленту М. Танка (рамантыка па светаўспрыманню і рэаліста ў паказе жыцця), а таксама з умоў, у якіх развівалася заходнебеларуская літаратура. Усё гэта, у тым ліку і задачы, якія ставіў перад творчасцю М. Танка новы час, вызначала асаблівасці танкаўскай паэзіі, уплывала на характар і ступень засваення паэтам ідэйна-эстэтычных традыцый.

Рэвалюцыйнай лірыцы М. Танка была блізкай у першую чаргу творчасць прагрэсіўных польскіх рамантыкаў А. Міцкевіча і Ю. Славацкага. Толькі адносіны паэта да творчасці прагрэсіўных польскіх рамантыкаў былі шмат у чым крытычнымі. З аднаго боку, М. Танка прывабліваля мастацкая і агульначалавечая каштоўнасць твораў гэтых аўтараў, у якіх яны найбольш поўна выявілі думкі і мары польскага народа, рэвалюцыйны дух свайго часу, з другога — на шляху да стварэння новых форм мастацтва ён свядома адштурхоўваўся ад традыцыйнай паэтыкі. М. Танк, рэвалюцыйны паэт і вопытны прафесійны рэвалюцыянер, не мог поўнасцю прыняць ідэі польскага рамантызму XIX ст., таму што ён не ставіў, як польскія паэты-рамантыкі, нацыянальную свабоду вышэй за сацыяльную. У сваей творчасці 30-х гадоў паэт выступаў за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне народа Заходняй Беларусі.

Творы прагрэсіўных польскіх рамантыкаў былі для М. Танка, па-першае, узорам мастацкай дасканаласці, па-другое, рэвалюцыйныя і патрыятычныя матывы іх паэзіі былі сугучнымі і блізкімі давераснёўскай творчасці М. Танка. Беларускі паэт выказваў пастаянную зацікаўленасць да паэтычнай спадчыны А. Міцкевіча. Гэта абумоўлена не толькі тым, што творчасць польскага паэта з'яўляецца глыбока народнай, вызначаецца паўнатой адлюстравання рэчаіснасці, чалавечых думак і пачуццяў, але і тым, што ён нарадзіўся ў Беларусі, правёў тут дзіцячыя і юнацкія гады; у «Баладах і рамансах», другой і чацвёртай частках «Дзядоў» і «Пане Тадэвушы» выкарыстоўваў беларускі фальклор, у «Гражыне», «Конрадзе Валенродзе» і іншых творах звяртаўся да гістарычных падзей з жыцця беларускага народа, у «Пане Тадэвушы» стварыў цудоўныя малюнкі беларускай прыроды.

Як і для кожнага мастака, для М. Танка імкненне прадоўжыць традыцыі сведчыла пра жаданне авалодаць высокім майстэрствам. Праўда, у асобных яго вершах першай палавіны 30-х гадоў

назіраецца знешняе засваенне гэтых традыцый («Новы год», «У дарозе», «Сфінкс»).

Верш «Новы год», напрыклад, па свайму стылю блізкі да балад і асобных вершаў А. Міцкевіча. Ён пераклікаецца і з так званай «вялікай» імправізацыяй Конрада з трэцяй часткі «Дзядоў»:

Вось дванаццаць прабіла,
Сарваўся з сну вязеиь,
Глядзіць у акно.
І здаецца яму:
Дзесь праз сняжыстыя хмары
Іграюць агні-пажары,
Чуюцца молатаў удары,
Бачыць ён нейкія твары,
Як мары...[1]

Думаецца, мае рацыю У. Калеснік, калі піша: «Герой-вязень з яго галюцынацыямі пад Новы год мае штосьці агульнае з Густавам, Конрадам, Кардыянам і іншымі героямі старога польскага рамантызму. Танк настолькі быў зліты з заходнебеларускай рэчаіснасцю, што інстынктам адчуваў яе эмацыянальны каларыт — рэвалюцыйную рамантыку. Але яму не хапала сродкаў перадаць гэта, і ён збіваўся на рамантычную рыторыку або дэманічнасць»[2].

Названым вышэй вершам М. Танка ўласцівы адначасова элементы паэтыкі як рамантычнай паэзіі XIX ст., так і пралетарскай паэзіі XX ст., аб чым сведчаць хоць бы наступныя вобразы: гіганта ўдар, разбіты ланцуг ападаў, сусветны пажар і інш. Верш «У дарозе», напрыклад, напісаны ў тым жа рытміка-інтанацыйным ключы, што і асобныя раздзелы паэмы М. Чарота «Босыя на вогнішчы». Аднак у ім малады паэт выкарыстоўвае таксама, як і А. Міцкевіч у трэцяй частцы «Дзядоў», маналог-песню вязня:

...Кайданаў звон
Зрываўся з рук, як цяжкі стогн
І недзе гаснуў, заміраў...
Адзін з тых вязняў запяяў:
«Раз паднялі трынаццаць гут
Бунтарны сцяг, магутны бунт!»[3]

Паэту быў блізкі таксама і рамантызм «Маладняка». У яго творах выразна адчуваюцца стылявыя асаблівасці паэзіі маладнякоўцаў

---

[1] Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі.— Мн., 1933, с. 75.
[2] Калеснік Уладзімір. Паэзія змагання.— Мн., 1959, с. 28.
[3] Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі, с, 74.

(страсныя заклікі, гіпербалічныя і маштабныя вобразы, імклівы і бадзёры рытм і т.д.). Арыентацыя на іх паэзію прыдавала своеасаблівую афарбоўку творам М. Танка 30-х гадоў («Я — ў кожным пажары», «Моладзі» і інш.).

М. Танк развіваў у сваёй творчасці ў першую чаргу рэвалюцыйныя і патрыятычныя ідэі польскіх рамантыкаў. У А. Міцкевіча ёсць выказванне, што ўся польская літаратура ўзрасла, забуяла і буйна заквітнела пад жыватворным дыханнем любві да радзімы. Ідэяй патрыятызму прасякнута і творчасць самога А. Міцкевіча, яна з'яўляецца скразной у прагрэсіўнай польскай літаратуры XIX і пачатку XX ст. Я. Купала таксама адзначаў, што з-за гэтай сваёй якасці польская літаратура была яму блізкай, таму што блізкім быў гістарычны лёс абодвух народаў, іх імкненне да сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

Вядучым матывам рэвалюцыйнай і дэмакратычнай заходнебеларускай літаратуры было страснае імкненне вызваліць беларускі народ з-пад улады польскіх паноў і ўз'яднаць Заходнюю Беларусь з Савецкай Беларуссю.

Рамантычным ідэалам і верай у лепшую будучыню напоўнены заключныя радкі з «Оды да маладосці» А. Міцкевіча:

Вітаем зару свабоды,
За ёю — сонца збавення![1]
*(Пераклад А. Вялюгіна і С. Дзяргая)*

Рэвалюцыйнай і адначасова глыбока патрыятычнай з'яўляецца дакастрычніцкая творчасць Танка. Яна напоўнена верай у лепшае заўтра, у шчаслівую будучыню свайго народа і ў яго вызваленне. Паэт паспяхова выкарыстоўвае пры гэтым рамантычную сімволіку: «Выарам хутка і сонца!», «Нас асвяці ты сонцам волі», «Сустрэнем новы ўсход зары» і г. д. Для М. Танка творчасць рэвалюцыйных рамантыкаў А. Міцкевіча і Ю. Славацкага была ўзорам грамадзянскага служэння народу. У вершы «Марак» («Колькі разоў глядзіш, як бурлівая хваля») А. Міцкевіч заклікае да актыўнага дзеяння і выступае супраць пасіўнага сузірання:

Лепей яму сярод стыхій беспарадку
Змагацца кожную хвіліну з новымі перашкодамі,
Чым выбрацца на ціхі бераг,
Глядзець на мора і лічыць свае страты.[2]
*(Падрадковы пераклад)*

---

[1] Міцкевіч Адам. Выбраныя творы.— Мн., 1955, с, 9
[2] Mickiewicz Adam. Wiersze.— Warszawa, 1972, c. 164.

Яркім прыкладам служэння сваёй радзіме з'яўляецца таксама і верш Ю. Славацкага «Мой тастамант», дзе ён заклінае жывых не траціць надзеі і ісці адзін за другім на барацьбу дзеля лепшай будучыні:

Я заклінаю: жывыя, надзею не трацце!
Перад народам трымайце асветы паходню.
Трэба памерці — адзін па адным паміраце,
Але руйнуйце варожую сілу вы штодня.[1]
*(Пераклад Ул. Дубоўкі.)*

М. Танк у вершы «Не забывай», выкарыстоўваючы рамантычныя вобразы і прыёмы, заклікае да змагання, да рэвалюцыйнага дзеяння:

Не адступай, брат, у змаганні,
Ідзі далей, як ты ішоў!
У новых бітвах сонца ўстане,
Да новых бітваў будзь гатоў!
Не забывай!
(I, 38)

Літаратуры патрэбны былі моцныя, мужныя характары. М. Танк стварaў іх у сваіх вершах і паэмах.

Рэвалюцыйныя ідэі польскіх рамантыкаў мелі агульначалавечы характар. У пэўнай ступені назіраецца падабенства паміж героем рамантычнай польскай паэзіі і лірычным героем даверaснёўскай творчасці М. Танка. Для беларускага паэта, як і для польскіх рамантыкаў, вызваленне свайго народа звязвалася з вызваленнем усяго чалавецтва. Лірыка М. Танка глыбока інтэрнацыянальная і гуманістычная («Вянок», «Межы», «Знаю — нялёгка ў закутай краіне», «Баян» і інш.).

У «вялікай» імправізацыі з трэцяй часткі «Дзядоў» Конрад сцвярджае:

Ale ta miłość moja na świecie,
Ta miłość nie na jednym spoczęła człowieku
Jak owad na róży kwiecie:
Nie na jednej rodzinie, nie na jednym wieku.
Ja kocham cały naród!
Nazywam się Miljon—bo za miljony
Kocham i cierpię katusze.[2]

---

[1] Славацкі Юльюш. Выбранае,— Мн., 1959, с. 10.
[2] Mickiewicz Adam. Dzieła: Wyd. Jubileuszowe.— Warszawa, 1955, t. 3, c. 161-166. У далейшым творы А. Міцкевіча даюцца па гэтаму выданню. У дужках том і старонка

Такая шырыня лірычнага светаўспрымання была характэрнай для польскага рамантызму ў цэлым.

Творчасць М. Танка прасякнута любоўю да свайго народа. Паэт заклікае да рэвалюцыйнай барацьбы за лепшую будучыню гэтага народа. Так, у лепшых традыцыях рамантычнай паэзіі напісаны многія пейзажныя ўрыўкі з паэмы «Нарач». Напрыклад, «Люблю твае, Нарач, затокі і тоні»:

Люблю твае буры, твае навальніцы.
У іх чую, бы ў песнях, жыццё маладое.
І хочацца блізка грудзьмі прытуліцца
Да чорных ад гневу кіпучых прыбояў.
*(I, 194)*

У гэтым маляўнічым і надзвычай эмацыянальным урыўку паэт, выкарыстоўваючы яркія рамантычныя вобразы, з незвычайнай лірычнай страсцю і пафасам услаўляе паўстанне нарачанскіх рыбакоў. Лірычны герой тут блізкі Конраду з трэцяй часткі «Дзядоў» і герою паэмы «Фарыс» А. Міцкевіча з іх рамантычнымі парывамі, з іх адчуваннем бязмежнасці сілы і волі чалавека.

Беларускі паэт для ўвасаблення сваіх задум знаходзіў у творчасці А. Міцкевіча ідэі, блізкія яго ўласным імкненням. Кожны пісьменнік становіцца сапраўды вялікім мастаком, калі яму ўдаецца найбольш поўна выказаць думкі і мары свайго народа, дух свайго часу. М. Танк здолеў гэта зрабіць.

Аснову рамантычнай паэзіі А. Міцкевіч бачыў у яе народнасці і нацыянальнай самабытнасці. Ён заяўляў, што рамантычнай паэзіяй варта лічыць толькі тую, у якой раскрываецца дух часу і вобраз мыслення і адчування народа. Усім гэтым патрабаванням адпавядала і давераснёўская творчасць М. Танка.

У гісторыі сусветнай літаратуры з'яўленне многіх буйных эпічных твораў было абумоўлена самім часам. Так, свая эпоха выклікала да жыцця «Боскую камедыю» Дантэ, «Фаўста» Гётэ, «Яўгенія Анегіна» А. Пушкіна, «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча, «Новую зямлю» Я. Коласа, «Кветкі Польшчы» Ю. Тувіма, «Усеагульную песню» П. Нэруды і інш. Наступае час, калі мастакам слова неабходна ацаніць і асэнсаваць у эпічнай форме месца свайго народа сярод другіх народаў. Гістарычны лёс свайго народа імкнуўся ўвасобіць М. Танк у паэмах «Нарач», «Журавінавы цвет», «Сказ пра Вяля», «Каліноўскі», «Казка пра Музыку», «Сілаш».

Пры стварэнні эпічных твораў М. Танк мог таксама выкарыстаць вопыт польскай літаратуры. Калі ўлічыць пэўную блізкасць гістарычнага лёсу двух народаў і падабенства творчых задач (патрыя-

тычная тэма, распрацоўка ліра-эпічных форм), якія стаялі перад польскімі рамантыкамі ў 20-40-я гады XIX ст. і перад М. Танкам у 30-я гады XX ст., то зразумелым будзе яго імкненне вырашаць у беларускай літаратуры тыя задачы, якія былі ўзняты А. Міцкевічам у «Пане Тадэвушы», трэцяй частцы «Дзядоў», Ю. Славацкім у «Кардыяне», «Ангелі». «Бянёўскім».

Так, матэрыялам для паэмы «Нарач» М. Танка паслужыла паўстанне нарачанскіх рыбакоў, трэцяя частка «Дзядоў» А. Міцкевіча ўзнікла пад непасрэдным уздзеяннем трагічнага выніку паўстання 1830 г. У падзеях 1823 г., калі былі арыштаваны філарэты, А. Міцкевіч бачыў вытокі паўстання 1830 г. Аднак калі А. Міцкевіч не быў удзельнікам гэтага паўстання і пра яго толькі чуў і чытаў, то М. Танк прымаў актыўны ўдзел у падпольнай рэвалюцыйнай барацьбе на тэрыторыі Заходняй Беларусі. З апавяданняў відавочцаў, знаёмых і асабліва са свайго ўласнага вопыту падпольнай барацьбы ён браў значны матэрыял для адлюстравання паўстання нарачанскіх рыбакоў. Таму трапна падмеціў яшчэ ў 30-я гады С. Бруч, што М. Танк пракладваў у той час дарогу да беларускай трэцяй часткі «Дзядоў»[1].

Сапраўды, гэта драматычная паэма А. Міцкевіча магла служыць для М. Танка своеасаблівым мастацкім узорам. Яна насычана рэвалюцыйнымі падзеямі 1830-1831 гг., як паветра бывае насычана электрычнымі зарадамі перад навальніцай. У «Нарачы» М. Танка гэта навальніца, бура ўжо ва ўсю сілу бушуе. Беларускі паэт на канкрэтным матэрыяле паказаў сам працэс паўстання. Безумоўна, трэцяя частка «Дзядоў» раскрывала падзеі агульнанацыянальнага характару, «Нарач» — прыватнага, лакальнага плана. Тым не менш якраз на шляху да адлюстравання праз прыватнае значных, агульнанацыянальных праблем вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі выявілася творчая вучоба М. Танка ў сваіх папярэднікаў.

Трэцяя частка «Дзядоў» зрабіла ўплыў не толькі на «Нарач», але і ўвогуле на ўсю даверасні ўскую творчасць беларускага паэта. Пра паэму «Нарач» і яе ролю ў творчасці паэта 30-х гадоў можна сказаць тое, што сказаў пра трэцюю частку «Дзядоў» Ю. Пшыбась: «Гэта безумоўна, што трэцяя частка «Дзядоў» займае цэнтральнае месца ў творчасці Міцкевіча, што яго паэтычны дух у ёй раскрыўся найбольш поўна і што адтуль выпраменьваецца і вынікае ўсё, што Міцкевіч стварыў раней і потым»[2].

---

[1] Wiadomości Literackie, 1939, N 31—32, c. 42.

[2] Przyboś Julian. Czytając Mickiewicza.—Warszawa, 1965, c. 123

Паэма «Нарач» М. Танка ў ідэйных і мастацкіх адносінах блізкая трэцяй частцы «Дзядоў» А. Міцкевіча, «Бянёўскаму» Ю. Славацкага, «Дванаццаці» А. Блока, «Босым на вогнішчы» М. Чарота. З названымі творамі збліжае яе ў першую чаргу сам спосаб мастацкага выяўлення: галоўнай дзейнай асобай тут выступаюць народныя масы, мова герояў пазбаўлена яркай індывідуалізацыі, мастацкія вобразы і малюнкі маштабныя, у пэўнай ступені нават абагульненыя і сімвалічныя.

Паэма «Нарач» — гэта не твор тыпу «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча ці «Новай зямлі» Я. Коласа, бо яна не дае ўсебаковага адлюстравання рэчаіснасці, а схоплівае жыццё ў яго ключавых момантах гістарычнага развіцця і разглядае адну пэўную гістарычную падзею — бунт нарачанскіх рыбакоў.

Па спосабу мастацкага адлюстравання найбольш блізкая «Пану Тадэвушу» незавершаная паэма «Сілаш». Калі А. Міцкевіч, апісваючы «шляхецкую гісторыю», раскрыў лёс свайго народа, то М. Танк у «Сілашы» імкнуўся на прыкладзе жыцця свайго героя паказаць жыццё беларускага народа на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. У гэтым плане ён прадоўжыў працу ў паэме «Янук Сяліба», дзе паказаў барацьбу беларускіх партызан з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Паміж творчасцю М. Танка і творамі польскіх рамантыкаў існуе глыбокая, арганічная духоўная сувязь. У вершы «Палякам» паэт піша:

Нам блізкі вашай мовы гук —
Шапэн натхнёны і Міцкевіч.

*(I, 388)*

Для яго польская паэзія існуе ў форме блізкіх і знаёмых гукаў, вобразаў, паняццяў. Убачыўшы возера Свіцязь, М. Танк успамінае радкі з балады «Свіцязь» А. Міцкевіча:

Хто ў навагрудскія трапіць мясціны,
У нетры Плужанскага бору,
Помні: спыніцца тут хоць, на хвіліну,
Глянуць па хвалях прасторы...

*(6, 107)*

У пасляваенныя гады М. Танк піша вершы «На Навагрудскай гары», «Начлег каля Свіцязі», «Вадаспад Адама Міцкевіча», дзе выкарыстоўвае матывы і вобразы, звязаныя з імем польскага паэта.

Мастацкія прыёмы, дэталі, матывы і г. д. А. Міцкевіча можна знайсці ў творах М. Танка рознага часу. Напрыклад, у «Казцы пра Музыку» па свайму інтанацыйнаму гучанню і рытмічнай структуры апісанне ігры Музыкі перад царом блізкае да вядомага апісання ігры Войскага з «Пана Тадэвуша»:

На ўсе лады і пераліўы

Яна ў яго загаварыла:
То звонам жаваранка ў жыце,
То салаўіным свістам чулым,
Трывожнай кнігаўкай ў ракіце
І ў лесе шэраю зязюляй.
Пазней зайграў, як жнеі пелі,
Як вецер шапацеў саломай,
Сівыя хвалі Нёмну пеніў,
І абарваў акордам грому...
А рэха ўсё яшчэ іграла
І толькі змоўкла ў нетрах бору...

*(1, 310-311)*

У А. Міцкевіча:

Dmie znowu: jakby w rogu były setne rogi,
Słychać zmieszane wrzaski szczwania, gniewu, trwogi,
Strzelców, psiarni i zwierząt; aż Wojski do góry
Podniósł róg, i tryumfu hymn uderzył w chmury.
Tu przerwał, lecz róg trzymał; wszystkim się zdawało,
Że Wojski wciąż gra jeszcze, a to echo grało.

*(4, 123)*

М. Танка захаплялі музычнасць і дасканаласць верша польскага паэта, незвычайны палёт думкі і фантазіі. У прыведзеным вышэй урыўку з «Казкі пра Музыку» Танк мог выкарыстаць мастацкія прыёмы і сродкі А. Міцкевіча. Аднак апісанне ігры Музыкі ў яго атрымалася арыгінальным і самабытным. Яно захапляе незвычайнай меладычнасцю і чароўным плаўным рытмам. Аўтар выступае тут не проста як таленавіты вучань, а як варты сапернік і вялікі паэт.

Традыцыі польскай рамантычнай паэзіі ў творчасці М. Танка з'яўляюцца састаўной часткай побач з нацыянальнымі літаратурнымі традыцыямі (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч), традыцыямі рускай (А. Пушкін, М. Лермантаў, М. Някрасаў, У. Маякоўскі, С. Ясенін) і ўкраінскай (Т. Шаўчэнка) літаратур. Нам важна вызначыць не столькі падабенства, сколькі адрозненне паміж паэзіяй М. Танка і творамі паэтаў, у якіх ён вучыўся.

В. Р. Бялінскі пісаў, што «ўплыў вялікага паэта (А. С. Пушкіна.— А. В.) прыкметны на іншых паэтаў не ў тым, што яго паэзія адлюстроўваецца ў іх, а ў тым, што яна ўзбуджае ў іх уласныя іх сілы»[1]. Думка рускага крытыка слушная і ў адносінах да цудоўнага верша М. Танка «Ціха, так ціха», дзе можна знайсці вобразныя, рытмічныя і

[1] Белинский В. Г. Полн. собр. соч.: В 13-ти т.— М., 1954, т. 5. с. 562.

сэнсавыя аналогіі як з санетам «Акерманскія стэпы» А. Міцкевіча, так і з вершам «Я адзін выходжу на дарогу» М. Лермантава:

Ціха, так ціха — ні ветру, ні шуму...
Быццам лес белую думае думу.
...Ледзь пуцяводныя зоры відаць.
Думак бясследна плыве чарада.

Танальнасць заключных радкоў верша блізкая міцкевічаўскаму «мне плыць, плыць і плыць...» (верш «Над водным прасторам чыстым»):

Цяжка ісці, прыстаюць ужо ногі,—
Толькі мне нельга спачыць ля дарогі,
Нельга спыніцца ў дрымотным бары...
Трэба няспынна ісці да зары!

*(1. 71)*

На прыкладзе гэтага верша таксама відаць, што творчае ўспрыманне беларускім паэтам перадавога вопыту дапамагло яму выявіць сваю арыгінальную мастацкую сілу. Гэта не прыніжае нацыянальнай самабытнасці таленту М. Танка, а, наадварот, сведчыць пра яго сталасць і гатоўнасць ствараць арыгінальныя і высокамастацкія творы.

У творчасці М. Танка і ў творах польскіх рамантыкаў можна знайсці іншыя аналогіі. Аднак гэта не з'яўляецца асноўным пры вывучэнні традыцый. І. Франко пісаў: «Толькі тады можна зразумець веліч Шаўчэнкі, калі параўнаць яго з яго папярэднікамі і настаўнікамі, з польскімі і расійскімі: Міцкевічам, Рылеевым, Пушкіным... ён наскрозь індывідуальны і адрозніваецца ад іх нават там, дзе вучыцца ў іх»[1]. Тое ж самае можна сказаць і пра М. Танка. Ён адрозніваецца ад Міцкевіча, Пушкіна і Шаўчэнкі нават там, дзе ў іх вучыцца.

М. Танк падышоў да традыцый польскай рамантычнай паэзіі XIX ст. па-наватарску, прымяняльна да новых гістарычных умоў і да новага гістарычнага часу. Яго сучасная творчасць плённа развіваецца ў цесным узаемадзеянні з паэзіяй А. Міцкевіча і Ю. Славацкага. Але характар гэтага ўзаемадзеяння стаў крыху іншым. Напрыклад, патрыятычная ідэя польскіх рамантыкаў «любві да радзімы» ў сучаснай лірыцы беларускага паэта, відаць, найбольш поўна выяўляецца ў інтэрнацыянальных і грамадзянскіх матывах.

У паэзіі М. Танка 40-70-х гадоў можна выявіць некаторыя паэтычныя прыёмы, сродкі, танальнасць ці маляўнічасць пейзажаў, характэрныя для твораў польскіх паэтаў. Але гэтыя традыцыі сталі арганічнай часткай яго паэзіі.

---

[1] Цыт. па кн.: Пархоменко М. Иван Франко и русская литература.— М., 1950, с. 147.

У апошнія гады назіраецца паглыбленне філасофскіх прынцыпаў у паэзіі М. Танка. І адсюль узнікла ў яго зацікаўленасць да філасафічнай, глыбока інтэлектуальнай творчасці Д. Норвіда. Традыцыі гэтага буйнейшага польскага паэта XIX ст. узбагачаюць сучасную лірыку М. Танка. Таму заканамерным з'явіўся зварот беларускага паэта ў сярэдзіне 60-х гадоў да перакладу верша Я. Бжастоўскай «Норвід». У 1975 г. М. Танк напісаў пранікнёны, змястоўны і глыбокі верш «Ц. Норвід», дзе расказаў пра трагічнае, адзінокае, поўнае нястач жыццё польскага паэта, пра яго непрызнанасць пры жыцці і пра яго славу пасля смерці:

Трэба ж было табе зрокам прарочым
Бачыць і бронзы і велічы марнасць,
Бачыць трыумф свой
за далеччу хмарнай,—
Каб у самотнасць адважыцца збочыць,
Дзверы пытаннем, як гром,
зачыніўшы:
«Чым ты, Сакраце, Афіны праславіў,
Што залаты бюст табе люд паставіў,
Перш атруціўшы?..»
*(4, 671)*

Захапляцца аналогіямі ці супадзеннямі ў творчасці такіх арыгінальных і самабытных мастакоў, як Ц. Норвід і М. Танк, даволі складана. Тым не менш думаецца, што ўнутраная засяроджанасць, аўтаіронія, схільнасць да роздуму і медытацыі, уласцівыя сучаснай лірыцы беларускага паэта, абумоўлены ў пэўнай ступені і яго знаёмствам з творчасцю Ц. Норвіда. Так, назіраецца падабенства ў паэтычнай структуры некаторых вершаў абодвух паэтаў, напрыклад «Чуласць», «Пілігрым» у Ц. Норвіда, «Вы думаеце, гэта — шчасце», «Кесарава — кесару» ў М. Танка.

У Ц. Норвіда («Пілігрым»):

Wy myślicie, że i ja nie Pan,
Dlatego że dom mój ruchomy
Z wielbłądziej skóry...
...Przecież i ja — ziemi tyle mam,
Ile jej stopa ma pokrywa,
Dopokąd idę!..[1]

У М. Танка:

Вы думаеце, гэта — шчасце,

---

[1] Norwid Cyp rіап. Pisma wybrane.— Warszawa, 1968, t. 1, с. 385.

Калі ад дотыку твайго
Ператвараецца ўсё ў песню:
Зямля, трава, вада, агонь,

І хлеб, і соль, і боль, і радасць,
І кожны міг, і кожны час...
Як позна зразумеў, дзівак я,
Тваю трагедыю, Мідас!

*(3, 401)*

У гэтым вершы першая частка з'яўляецца свайго роду тэзай, другая — антытэзай. Тут назіраецца вельмі часта выкарыстоўваемы абодвума паэтамі прыём дыскусіі з уяўным праціўнікам ці субяседнікам. Паэты звяртаюцца да разнастайных параўнанняў і пералічэнняў, што прыдае вершам размоўны, празаічны характар. Аднак яны не страчваюць пры гэтым сваёй паэтычнасці і эмацыянальнай напоўненасці.

Сучасная паэзія М. Танка, як і паэзія Ц. Норвіда, вызначаецца глыбінёй заключанага ў ёй зместу. Блізкія паэтычнай структурай і зместам вершы Ц. Норвіда і М. Танка, калі паэты звяртаюцца да маральных праблем, да праблем сусветнай літаратуры і мастацтва. Ц. Норвід гэтыя тэмы закранае ў вершах «Слава», «Багі і чалавек», «Кентаўры», «Герой», «Літасць», М. Танк — «Класік», «...І іншыя», «Фрэскі», «Гамер», «Аднойчы я ішоў з Дантэ», «Пігмаліён». У названых вершах беларускі паэт дае смелую і арыгінальную трактоўку многім традыцыйным маральным, этычным, філасофскім і эстэтычным праблемам.

У сучаснай творчасці М. Танка вельмі цесна пераплялісся традыцыйнае, папярэдняе і наватарскае, уласнае, ён свабодна выкарыстоўвае вопыт сусветнай і айчыннай літаратур, успрымаючы яго як агульначалавечы набытак.

## НА ШЛЯХАХ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ЯДНАННЯ

30-я гады М. Танку была вельмі блізкай польская літаратура, асабліва польская рэвалюцыйная паэзія. У сваёй аўтабіяграфіі паэт піша: «Тут, у Віліні, у мяне была магчымасць больш грунтоўпа пазнаёміцца з тагачаснай польскай рэвалюдыйнай літаратурай, з творамі пісьменнікаў, якія гуртаваліся каля такіх легальных і напаўлегальных камуністычных часопісаў і газет, як «Нова культура», «Месенчнік літэрацкі», «Левар», «Дзвігня», «Левы Тор», «Облічэ дня», «Папросту», «Сігналы» і іншыя, а таксама з творамі многіх рэвалюцыйных украінскіх і літоўскіх пісьменнікаў»[1]

Сувязі М. Танка з польскімі рэвалюцыйнымі паэтамі тлумачацца агульнай ідэйна-эстэтычнай праграмай, падабенствам творчых біяграфій, а таксама блізкімі садыяльнымі ўмовамі, у якіх развівалася іх творчасць. У той час М. Танк быў асабіста знаёмы і падтрымліваў сяброўскія адносіны з такімі польскімі публіцыстамі, пісьменнікамі і грамадскімі дзеячамі, як Г. Дэмбінскі, С. Ендрыхоўскі, Е. Путрамант, А. Мікулка, Т. Буйніцкі, К. Петрусевіч і інш. У 1935-1936 гг. паэт супрацоўнічаў у польскіх народна-франтавых газетах «Poprostu» і «Karta», якія выходзілі ў Вільні. У «Poprostu» ён вёў спецыяльную «Беларускую калонку», дзе змяшчаліся артыкулы і карэспандэнцыі пра становішча ў Заходняй Беларусі, а таксама падборкі вершаў беларускіх паэтаў.

На літаратурна-грамадскую дзейнасць паэта станоўча ўплывала тое, што ён у сярэдзіне 30-х гадоў звязаў свой лёс з народнафрантавым рухам. Знамянальнай падзеяй у жыцці тагачаснай Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі быў Антыфашысцкі кангрэс работнікаў культуры, які адбыўся 16-17 мая 1936 г. у Львове. На ім прысутнічалі В. Васілеўская, У. Бранеўскі, С. Р. Дабравольскі, Э. Шыманскі, А. Струг і іншыя польскія пісьменнікі. Збіраўся паехаць туды і М. Танк, аднак некаторыя абставіны перашкодзілі гэтаму. Народнафрантавы рух садзейнічаў яднанню прагрэсіўных сіл у барацьбе супраць сусветнага і польскага фашызму, збліжаў культуры і літаратуры.

Біяграфія М. Танка, паэта-рэвалюцыянера, паэта-падпольшчыка, з'яўляецца важным фактарам пры інтэрпрэтацыі яго паэзіі. На характар яго давераснёўскай творчасці наклала адбітак таксама еўрапейская паэзія 20-30-х гадоў.

---

[1] Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў, с. 478.

Хоць творчасць польскіх рэвалюцыйных паэтаў зрабіла прыкметны ўплыў на паэзію М. Танка, тым не менш нельга перабольшваць гэтага ўплыву. Неабходна ўлічваць усю складанасць і супярэчлівасць гэтых сувязей. Тут варта, відаць, гаварыць перш за ўсё пра тыпалагічную агульнасць паміж творчасцю М. Танка і паэзіяй польскіх пралетарскіх паэтаў.

М. Танк, як і буйнейшыя польскія пралетарскія паэты У. Бранеўскі і Б. Ясенскі, праяўляў выключную цікавасць да паэзіі У. Маякоўскага і С. Ясеніна. Акрамя таго, неабходна ўлічваць умовы, у якіх існавала заходнебеларуская літаратура, а таксама задачы, якія стаялі перад гэтай літаратурай. Творчасць М. Танка развівалася ва ўмовах, блізкіх да тых, у якіх існавала беларуская літаратура ў пачатку XX ст. Перад паэтам, як і перад яго папярэднікамі, востра стаяла разам з сацыяльным і нацыянальнае пытанне. М. Танк далей развіў традыцыі беларускіх паэтаў, якія тварылі ў пачатку XX ст. У новых гістарычных умовах ён раскрыў абуджэнне духоўнага жыцця беларускага народа, паказаў рост яго рэвалюцыйнай свядомасці. Ведучы інтэнсіўныя пошукі ў галіне паэтычнай формы, глыбока закранаючы пытанні, якія хвалявалі яго народ і чалавецтва, ён стаў не толькі рэвалюцыйным і нацыянальным паэтам, але і заняў вартае месца сярод выдатных майстроў паэтычнага слова ў славянскіх літаратурах.

На паэзію М. Танка, як і на творчасць Л. Арагона, Н. Хікмета, І. Бехера, П. Нэруды, У. Бранеўскага, Б. Ясенскага і іншых паэтаў, якія імкнуліся авалодаць марксісцкімі ідэямі і метадам сацыялістычнага рэалізму, вялікі ўплыў зрабіла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Імя М. Танка з упэўненасцю можна ставіць побач з імёнамі названых вышэй паэтаў. Як і яны, беларускі паэт жыў ва ўмовах капіталістычнага грамадства, адчуў пэўны ўплыў павеваў еўрапейскай паэзіі 20-30-х гадоў, прынёс у паэзію новы змест, свежыя інтанацыі. Але творчасць М. Танка мае таксама і сваю істотную, адметную асаблівасць. Ужо ў першых друкаваных творах ён заявіў аб сваёй прыналежнасці да сацыялістычнай ідэалогіі і культуры.

М. Танк добра ведаў і цаніў творчасць У. Бранеўскага. Ён пісаў у сваім дзённіку: «Чытаю У. Бранеўскага «Ветракі», «Тры залпы». Падабаюцца мне гэтыя бунтарныя і суровыя вершы» (6, 92). У. Бранеўскаму ў польскай рэвалюцыйнай паэзіі міжваеннага дваццацігоддзя належыць вядучая роля. М. Танк таксама ўзначаліў рэвалюцыйную заходнебеларускую літаратуру.

Асобныя вершы М. Танка ідэйнай накіраванасцю, танальнасцю і вобразнасцю тыпалагічна блізкія вершам У. Бранеўскага. Адчуваючы ўплыў паэтыкі У. Маякоўскага, У. Бранеўскі і М. Танк у сваёй паэзіі

ўсё больш глыбока і арганічна спалучалі страсны публіцыстычны пафас з пранікнёным лірызмам. Зблізкае абодвух паэтаў і тое, што іх лірыцы 30-х гадоў уласцівы былі многія характэрныя рысы паэтыкі класічнай і новай паэзіі.

Безумоўна, само жыццё ў першую чаргу сфарміравала творчасць Танка. Аднак нам здаецца, што лірыка У. Бранеўскага, напоўненая грамадзянскім гучаннем, сацыяльным зместам і рэвалюцыйнай накіраванасцю, таксама ўздзейнічала на паэзію М. Танка. Назіраецца ідэйная роднасць паміж творчасцю абодвух мастакоў. Але кожны з іх — ярка выражаная паэтычная індывідуальнасць.

Да таго часу, калі ў друку пачалі з'яўляцца першыя вершы М. Танка, У. Бранеўскі ўжо стварыў у сваёй паэзіі псіхалагічна глыбокі і жыццёвы вобраз рэвалюцыянера. Яго паэзія канца 20 — пачатку 30-х гадоў прасякнута ідэяй барацьбы за сацыяльнае вызваленне працоўных, гэтай паэзіі ўласцівы канкрэтна-гістарычныя рысы і прыкметы пры адлюстраванні жыцця. Зразумела, што М. Танк не мог не звяртацца да вопыту сгарэйшага таварыша па пяру.

Паэзія М. Танка ішла сваім, адметпым шляхам, хоць яна і ўбірала ў сябе многія рысы новай еўрапейскай паэзіі XX ст., асабліва ў галіне вобразнаеці і рытмікі. Напрыклад, вобразы з верша М. Танка «На шляху дзікіх гусей» («Кудлаты вецер чапляўся за межы, калоссе... Ноч спужаўшыся, белая ноч над зямлёю, зорнаю сцежкай адходзіць — чорны кот крадучыся...»[1]) блізкія вобразам з верша У. Бранеўскага 20-х гадоў «Ветракі», у якім прыкметна адчуваюцца таксама і рысы авангардысцкай паэтыкі («W wiatry wplątane czarne ich ręce chmury wełniste szarpią i drą; wierzby kudłate pędzą w przestrachu, bledną chałupy w czapach ze mchu; włóczą za włosy mgły sponad łąk»).

Ці цэлая страфа з гэтага ж верша польскага паэта;
Wory obłoków sypią im w żarna
rudych wieczorów siarkę i miedź,
miele się mąka gęsta i czarna,
w niebo gwiaździste spada jak w sieć.[2]

У М. Танка ў вершы «Над Прыпяццю»:

Меле гром над полем хмары,
Дождж густы, сцюдзёны сыпле...
*(1, 93)*

У вершы «Вільня» таксама можна знайсці падобныя вобразы:

Сівая хмара сцерла сонца,

[1] Танк Максім. На этапах,— Вільня, 1936, с. 104.
[2] Broniewski Władysław. Wiersze i poematy.— Warszawa, 1962, с. 23.

Вясенні першы дождж заплакаў.
Па чарапіцы і па гонце
Разліўся вечар сінім лакам.

*(I. 98)*

Гэтыя прыклады сведчаць пра аналагічныя пошукі абодвух рэвалюцыйных паэтаў у галіне мастацкай формы.

Некаторыя вершы У. Бранеўскага і М. Танка сваімі ідэямі, інтанацыяй, рытмікай і ўвогуле самой танальнасцю падобныя паміж сабой.

У Бранеўскага (верш «Рабочыя»):

Mosty na zachód i wschód!
I dalej! i dalej! i dalej!
W horyzonty.
Miotami.
Brak tchu!
Kujemy.
My —
milion kowali![1]

У Танка (верш «Акт першы»):

Вуліцы, плошчы ўдоўж, папярок
Звоняць рытмам шалёным.
Сцягі — пажар,
Бунт — крок.
Колькі нас?
Мільёны.

*(1, 67)*

Тут выразна адчуваецца ўплыў на творчасць абодвух паэтаў наватарскай паэтыкі У. Маякоўскага, які выявіўся ў выкарыстанні рэвалюцыйнай вобразнасці, абрывістых імпульсіўных радкоў і строгага чаканнага рытму Верш «Рабочыя» быў першым творам У. Бранеўскага дзе, як слушна заўважыла польская даследчыца Ф. Ліхадзіеўская, «ад агульнага бунту супраць пасляваеннай рэчаіснасці паэт прыйшоў да... салідарнасці з рэвалюдыйным пралетарыятам»[2]. Калі ўзнік «Акт першы», М. Танк вёў інтэнсіўныя пошукі ў галіне зместу і формы. У сваім дзённіку ў лістападзе 1936 г. ён пісаў: «Закончыў «Акт першы». Прабую вызваліцца са старых паэтычных канонаў, з палону пявучасці, традыцыйнай вобразнай сістэмы, хоць

---

[1] Broniewski Władysław. Wiersze i poematy, c. 15-16.
[2] Lichodziejewska Feliksa. Życie i twórczość Władysława Broniewskiego: Władysław Broniewski.—Warszawa, 1966, c. 33.

пакуль што на гэтым шляху ў мяне больш паражэнняў, як удач. Адчуванне крызісу архаічных форм яшчэ нічога не дае. Да новага цяжка знайсці ключы. Можа, іх і не знайду, бо новае само па сабе не існуе. Яго кожны мастак мусіць стварыць» (6, 53).

Як правіла, вобразная і рытміка-інтанацыйная пераклічка назіраецца ў паэзіі У. Бранеўскага 20-х гадоў і ў лірыцы М. Танка першай палавіны і сярэдзіны 30-х гадоў. Пазней паэты пайшлі па шляху пераадолення рамантыка-сімвалічных штампаў, набліжаючыся да канкрэтна-рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці. Аднак рамантычныя і рэалістычныя тэндэнцыі вельмі цесна перапляліся ў творчасці абодвух мастакоў.

Рэвалюцыйную барацьбу паэты паказвалі як жывы і складаны працэс. Іх творы 30-х гадоў прасякнуты верай у садыялістычны ідэал, заклікалі да вытрымкі і мужнасці. У. Бранеўскі ў вершы «Закана-даўцам» піша: «На сілу сілай, сябры, адкажам!» М. Танк у вершы «Да штурму» сцвярджае: «Толькі молатам лепшая доля куецца» і заклікае: «Да штурму гартуйце жалеза і сэрца!» Для ўвасаблення рэвалюцыйных імкненняў пралетарскіх мас паэты выкарыстоўвалі яркія рамантычныя вобразы і сімволіку.

Лірычны герой даверасвёўскай паэзіі М. Танка жыў надзеяй на лепшую будучыню. Так, у вершы «Спатканне» вязень гаворыць свайму бацьку: «Сустрэнем новы ўсход зары». У. Бранеўскі ў вершы «На смерць рэвалюцыянера» піша:

Bo jest życie piękniejsze, nowe,
i życ warto, i umrzeć warto!
Trzeba nieść, jak chorągiew, głowę,
świecić piersią kulami rozdartą.[1]

Верай у лепшае заўтра напоўнены таксама яго верш «Піянерам»:

W pierś niech biją miotem—nie pęknie.
Zatnij usta, choć w ustach krew...
Jeszcze będzie jaśniej i piękniej,
będzie radość i będzie śpiew.[2]

Да мужнасці і рэвалюцыйнай вытрымкі заклікае М. Танк у вершы «Не плач»:

Не плач, наш дзень настане,
Хоць адступілі ўчора.
Зацісні моцна рану!
Хай не смяецца вораг!

---

[1] Broniewski Władysław. Wiersze i poematy, c. 38.
[2] Там жа, с. 39.

(1, 97)

Абодва паэты выступалі за высокамастацкую, ідэйную творчасць, за яе сувязь з жыццём.

У зборнік «Тры залпы» У. Бранеўскі ўключыў верш «Паэзія», у якім выступаў за далучэнне сваёй творчасці да барацьбы. Звяртаючыся да паэзіі, ён піша:

Не патрэбны нам чары вясталкі,
ноч святога агню не пагасіць —
будзь ты сцягам узвеяным, палкім,
будзь паходняй, узнятай над часам![1]

*(Пераклад П. Пестрака)*

Гэты верш быў успрыняты рэвалюцыйнымі заходнебеларускімі паэтамі П. Пестраком, В. Таўлаем, М. Танкам як блізкая ім ідэйна-эстэтычная праграма. В. Таўлай напісаў пра сваю паэзію: «Шумець ёй трэба на сцягах і калыхаць паходы».

М. Танк таксама адстойваў ідэйнасць, рэвалюцыйнасць паэзіі, выступаў за яе сувязь з жыццём народа, з фальклорам. Пра задачы паэта і паэзіі ён пісаў у вершах «Кожны дзень шукаюць», «Як мы пішам?», «Я — ў кожным пажары», «Песня» («Прыйшла з батрацкіх ты сяліб»), «Баян», «Эх, вы, песні», «Пачатак оды» і інш.

Вуснамі сванго героя з верша «Баян» М. Танк заклікае:

І рукой мазольнай
З новай сілай свежай
Распаляйце горны,
Разрывайце межы!

*(1, 53)*

Як і польскі паэт, М. Танк адстойваў паэзію з яе пратэстам і выкрыццём несправядлівасці існуючага ладу.

У 30-я гады лірыка У. Бранеўскага дасягнула свайго росквіту. Ён піша вершы «Дамброўскі басейн», «Балада аб Тэатральнай плошчы», «Заканадаўцам», «Лодзь», «Да сяброў-паэтаў», «Чэсць і граната», «No pasaran!», «Вуліца Мілая», «Зброю да бою», «Польскі салдат» і інш. Па сваёй ідэйнай накіраванасці і паэтычнай структуры гэтыя вершы блізкія такім творам М. Танка 30-х гадоў, як «Не забывай», «У маршы», «Эстрады», «Не плач», «Да штурму» і інш.

В. А. Хораў пісаў: «Для вершаў Бранеўскага характэрны і такія новыя для польскай паэзіі якасці, як «эстрадна-агітацыйная» інтанацыя, увядзенне танічнага верша, асананс, смелыя паэтычныя гі-

---

[1] Бранеўскі Уладзіслаў. Дарогай дзён.—Мн., 1961, с. 31.

пербалы, энергічная рытарычная фраза»[1]. Падобныя ж рысы ўласцівы паэзіі М. Танка 30-х гадоў. Абодва паэты арыентаваліся ў сваіх вершах на інтанацыю і рытмічны лад гутарковай мовы. Іх вершы пры гэтым не страчвалі натуральнасці і паэтычнасці. Так, у «Баладзе аб Тэатральнай плошчы» У. Бранеўскага, як дзень, прысутнічае прывід сышчыка, які «i wietrzy krew, i pieśń mą wietrzy...» У М. Танка:

Кожны дзень шукаюць маю песню
Стражнікі, праклятыя дазорцы,
І не бачаць, што яна палае
Над дзяругай незгасальным сонцам.
*(I 23)*

Блізкасць творчай манеры абодвух паэтаў, іх таленту і светаўспрымання адчуваецца ў так званых «астрожных» вершах: «Спатканне», «Да дня», «Паслухайце, вясна ідзе» М. Танка і «Элегія на смерць Людвіка Варынскага», «Таварышу-вязню», «Месячык вуліцы Павяй», «Магнітагорск, або Размова з Янам» У. Бранеўскага. Тэма ў іх раскрываецца праз лірычнае адчуванне героя ў. Іншы тут і рытм. Ён набывае апавядальны характар. Шырока выкарыстоўваецца бытавая лексіка.

Прыкметная роля ў гэтых творах належыць унутранаму маналогу, споведзі паэта «пра час і пра сябе». Напрыклад, у «Элегіі на смерць Людвіка Варынскага» чытаем:

Вясновае ранне. Як ціха.
Святло разгараецца ў змроку.
І толькі тут дыхаць так цяжка,
І так паміраць тут нялёгка.
*(Пераклад М. Танка, 5, 409)*

М. Танк таксама паспяхова выкарыстоўвае ўнутраны маналог. Безумоўна, матэрыялам для твораў паэта паслужылі суровая заходнебеларуская рэчаіснасць і яго ўласны рэвалюцыйны вопыт. Аднак тут, магчыма, адбілася і знаёмства з паэзіяй У. Бранеўскага. У паэме «Каліноўскі» паэт перадае маналог свайго героя напярэдадні яго пакарання смерцю:

За дзвярмі атупелыя крокі.
Мы ужо!.. не, мінулі... пайшлі...
Цяпер недзе на плёсах далёкіх
Мыюць пер'е зарой жураўлі...
Можа, я з рыштавання убачу
Блізкіх, родных, сваіх сяброў:

[1] Хоров В. А. Владислав Броневский,—М., 1965, с. 53,

Раз апошні прыйдуць развітацца
З сёл, лясоў, з баявых шляхоў.
*(1, 337)*

Абодва паэты паспяхова выкарыстоўваюць у гэтых творах канкрэтныя і рэалістычныя вобразы. Героі іх твораў выступаюць як рэальныя і жывыя людзі.

У вершы М. Танка «Паслухайце, вясна ідзе» бэз, які расцвіў, абудзіў вязня, прыдаў яму сілы і ўпэўненасць у барацьбе, сцвердзіў ідэю неперваможнасці ўсяго жывога, маладога, новага. У Бранеўскага («Магнітагорск, або Размова з Янам») атрымалася таксама нешта аналагічнае: дзве доменныя печы, здадзеныя ў строй у Магнітагорску, як бы далучылі вязняў да свабоднага і шчаслівага свету, сцвердзілі непераможнасць і правільнасць тых ідэалаў, за якія яны змагаліся. Тут, безумоўна, выказана і захапленне індустрыяльнымі поспехамі Краіны Саветаў.

У вершах «Да дня» і «Элегія на смерць Людвіка Варынскага» апісваецца смерць вязняў. У першым выпадку — звычайнага вясковага хлопца, у другім — вядомага польскага рэвалюцыянера. Пра тое, што памёр просты хлопец з Палесся, мы даведваемся па яго апушчанай з нараў, нерухомай белай руцэ. Настала фізічная, але не духоўная смерць. Смерцю Людвіка Варынскага сцвярджаюцца несмяротнасць яго ідэй, веліч яго подзвігу:

— Я мушу... мяне там чакаюць...
І паў ён, заліты крывёю,
Сканаў.
І вярнуўся да краю.
*(Пераклад М. Танка, 5, 410)*

У гэтых творах выявілася таксама адрозненне ў паэтычным стылі абодвух паэтаў. У Бранеўскага ён у большай ступені музычны, у Танка часцей адчуваюцца апавядальныя, размоўныя інтанацыі. Пейзажу ў творчасці польскага паэта належыць крыху іншая роля. У. Бранеўскі падае прыродаапісанні праз успрыманне саміх герояў. У беларускага паэта героі жывуць у цеснай сувязі з пейзажам, як бы раствараюцца ў ім. Аслабла б праўдзівасць у адлюстраванні, калі б М. Танк паказаў вясковых жыхароў інакш. Героі яго вершаў часцей за ўсё паходзяць з вёскі, яны адчуваюць сваю непарыўную сувязь з навакольнан прыродай. Героямі твораў У. Бранеўскага з'яўляюцца пераважна гараджане, рабочыя, інтэлігенты, іх адносіны да прыроды іншыя.

Хмары чорных птушак у небе напамінаюць Варынскаму шрыфт падпольнай друкарні, для хлопца-беларуса пейзаж — гэта канкрэтны свет яго Палесся:

А далёка недзе на Палессі
Сон зімовы скінулі бярозы.
Чулі, як шуміць зялёны шум?
Зацвілі, як снегам, вербы, лозы
Паміж неспакойиых шэрых дум.
*(I, 63-64)*

Як правільна заўважыла Т. П. Агапкіна, праз увесь верш «Месячык вуліцы Павяй» «праходзіць, ствараючы як бы другі, паралельны яго план, матыў месяца, адначасова і звергнуты з прывычнага рамантычнага п'едэстала, «заземлены», «ачалавечаны»... і традыцыйна-прыгожы, абыякавы»[1]. У вершы «Да дня» М. Танка прырода — не проста фон ці паралельны матыў, а актыўная частка духоўнага жыцця зняволенага. У творчасці паэта рэвалюцыйны характар раскрываецца ў сацыяльным і псіхалагічным планах. Рэвалюцыйная тэма пранізвае наскрозь яго інтымную і пейзажную лірыку («З каласамі», лірычныя адступленні ў «Нарачы» і г. д.).

Характэрнай, вызначальнай прыкметай творчасці гэтых паэтаў з'яўляецца тое, што ў ёй выяўляецца шматграннасць унутранага свету лірычнага героя, у ёй зліліся ў адно цэлае публіцыстычны, агітацыйны і лірычны пачаткі.

Польская пралетарская паэзія пашырыла ў 30-я гады свой дыяпазон. У ёй з'явіліся шматлікія вершы пра СССР. З асаблівай сілай выявіўся інтэрнацыяналізм гэтай паэзіі ў гады барацьбы іспанскага народа супраць фашызму («No pasaran», «Чэсць і граната» У. Бранеўскага, «Пажаданні» Л. Шэнвальда, «Мы з вамі!» Л. Пастарнака). Шэраг дасканалых вершаў на гэту тэму напісаў Э. Шыманскі. Адзін з іх («Іспанскую баладу») пераклаў на беларускую мову М. Танк. Беларускі паэт таксама думаў што-небудзь напісаць пра барацьбу гераічнага іспанскага народа. Аднак задуму сваю ён здзейсніў толькі ў 1978 г., калі напісаў паэму «Мікалай Дворнікаў» пра сябра свайго юнацтва, сакратара ЦК камсамола Заходняй Беларусі, які загінуў у Іспаніі.

М. Танк цікавіўся і сачыў за творчасцю У. Бранеўскага. У сваім дзённіку 28 ліпеня 1939 г. ён запісаў: «Вайнтраўб прыслаў у пісьме трывожныя вершы Бранеўскага. Толькі ці паспее набатны голас паэта-трыбуна разбудзіць пільнасць народа, прыспаную рознымі вялікадзяржаўнымі клерыкальнымі ды прафашысцкімі калыханкамі аб еднасці...» (6, 299). Беларускі паэт гаварыў пра вершы У. Бранеўскага, што былі напісаны напярэдадні другой сусветнай вайны.

---

[1] Агапкина Т. П. Владислав Броневский: История польской литературы,—М., 1969, т. 2, с. 329.

Сярод іх быў пранікнёны і глыбока патрыятычны верш «Зброю да бою». Польскі паэт быў не толькі глыбокім лірыкам і самаадданым рэвалюцыянерам, але і вялікім патрыётам сваёй радзімы. Патрыятычную тэму ён пасьпяхова будзе развіваць у сваёй творчасці перыяду другой сусветнай вайны і ў пасляваенны час.

Патрыятычная тэма таксама арганічна прысутнічала ў даверасьнёўскай творчасці М. Танка. Першай і, відаць, галоўнай адзнакай гэтай паэзіі было ўжо тое, што паэт пісаў для беларускага народа, пазбаўленага ў буржуазнай Польшчы многіх правоў. З другога боку, творчасць М. Танка 30-х гадоў глыбока інтэрнацыянальная. Паэт заняў пэўную і выразную пазіцыю ў палітычнай барацьбе. Ён быў паэтам-камуністам, паэтам-змагаром, што забяспечыла яго творчасці жыццяздольнасць і даўгавечнасць.

Прыкметнае месца ў гісторыі польскай літаратуры XX ст. належыць творчасці Б. Ясенскага. Паэмы «Песня пра голад» і «Слова пра Якуба Шэлю» — буйнейшыя паэтычныя творы польскага пісьменніка.

У «Песні пра голад» найбольш ярка выявілася імкненне паэта да рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці, зварот да сацыяльна-палітычных праблем сучаснасці. Тэта паэма адыграла значную ролю ў станаўленні мастацкага метаду пісьменніка.

Не выпадковым з'явіўся пераклад М. Танкам «Спеву машыністаў», урыўка з «Песні пра голад», прысвечанага рабочым Варшавы і Лодзі. Ён з'яўляецца самым значным вершам у тагачаснай польскай рэвалюцыйнай паэзіі. Сваёй цвёрдай, маршавай рытмікай, моцным рэвалюцыйным пафасам «Спеў машыністаў» сцвярджаў новы напрамак у творчасці Б. Ясенскага:

...Прыгожыя, дужыя, чулыя, не нам пад нягодамі гнуцца.
Месца! Ідзе грамада наша, пралетарыяцкі самум!
Дарогу шапкамі вымасціў узвіхраны крок рэвалюцыі...

*(6, 162)*

Пераклад быў зроблены ў 1937 г. Да гэтага часу М. Танк напісаў вершы «Эстрады», «Акт першы», «Да штурму», паэму «Нарач». Па свайму рэвалюцыйнаму зместу яны былі блізкія да ўрыўка «Спеў машыністаў».

Беларускі паэт умеў заўважыць у Б. Ясенскага лепшае, што было створана ім у пачатку 20-х гадоў. У той час у творчасці польскага паэта пачыналі праяўляцца. рысы пралетарскай паэзіі (зборнік «Зямля налева», 1924, сумесна з А. Стэрнам).

Асаблівае захапленне выклікала ў М. Танка паэма Б. Ясенскага «Слова пра Якуба Шэлю». Ствараючы ў паэме мастацкую карціну галіцыйскага паўстання сялян 1846 г. і ацэньваючы дзейнасць яго

кіраўніка Якуба Шэлі, Б. Ясенскі ўступаў у вострую палеміку як з буржуазнымі гісторыкамі, так і са сваімі літаратурнымі папярэднікамі С. Выспянскім і С. Жаромскім, якія таксама пісалі на гэту тэму.

Падобную задачу ставіў М. Танк пры стварэнні вобраза Кастуся Каліноўскага, кіраўніка паўстання 1863-1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Паэт піша ў аўтабіяграфіі: «Неяк сказаў мне Гарасім[1]: «Зрабілі хадэкі з Кастуся Каліноўскага свайго святога. Тут нешта не так. Трэба пра яго прачытаць усе, якія зможаш дастаць, матэрыялы і адбіць у хадэкаў гэтага змагара. Добра было б напісаць пра яго паэму»[2]. Паэт адзначае ў сувязі з гэтым у сваім дзённіку: «Асабліва я рады быў, што ў нас пачынаюць такія людзі, як Паўлік, Гарасім, больш удумліва ставіцца да мінуўшчыны. Ранейшы нігілізм да гісторыі народа шкадліва адбіўся да нашай літаратуры, якая — як ніводная літаратура на свеце — стала агістарычнай» (6, 112).

Паэма М. Танка «Каліноўскі» адыграла станоўчую ролю ў барацьбе супраць поглядаў беларускіх буржуазных нацыяналістаў і польскіх рэакцыйных гісторыкаў, якія тэндэнцыйна асвятлялі гераічнае мінулае беларускага народа. Яна гучала заклікам да барацьбы, да рэвалюцыйнага дзеяння.

Тым не менш у «Каліноўскім» нельга выявіць відавочных уплываў паэмы Б. Ясенскага. Беларускі паэт, як і польскі пры напісанні «Слова», выказваў асаблівую цікавасць да паэмы «Пугачоў» С. Ясеніна. Аднак паэма «Каліноўскі» — самастойны твор, хоць у ім і адчуваюцца рысы паэтычнай структуры «Пугачова».

Паэма «Слова пра Якуба Шэлю» з'явілася пэўным вынікам творчых пошукаў Б. Ясенскага. Вось чаму такім важным для сябе лічыў гэты твор сам Б. Ясенскі, называючы яго «рашаючым этапам унутранага пераадолення» і «першым крокам да сапраўды пралетарскай літаратуры — непасрэднай зброі класавай барацьбы»[3]. Яна зрабіла прыкметнае ўздзеянне на польскую паэзію міжваеннага двадцацігоддзя.

Для беларускага паэта паказальным было майстэрскае выкарыстанне Б. Ясенскім у паэме набыткаў народнай творчасці. Як і польскі паэт, М. Танк часта звяртаўся да народнай паэзіі, да мелодыі, рытмаў і вобразнасці народных песень. У «Слове пра Якуба Шэлю» Б. Ясенскі па-майстэрску і шырока выкарыстоўвае выяўленчыя і рытміка-інтанадыйныя сродкі фальклору. Гэта выявілася ў апісанні вяселля

---

[1] Гарасім— партыйная клічка сакратара ЦК КСМЗБ М. Дворнікава.
[2] Цыт. па кн.: Калеснік Уладзімір. Паэзія змагання, с. 197.
[3] Ясеньский Бруно. Стихи,— М., 1931, с. 5.

Шэлі ці, напрыклад, у сцэне, дзе паказваецца разгром панскіх маёнткаў:

Tańcowali z chłopem pan
milczkiem-boczkiem koło ścian.
Tańczył rządca, tańczył dziedzic,
żaden nie chciał w miejscu siedzieć.

... Tańcowali raz po raz
chłopska kosa, pański pas.
Od ogródka do ogródka
ciekła rowem krew jak wódka.[1]

Гэта адна з цэнтральных сцэн паэмы. Думаецца, М. Танк мог выкарыстаць вопыт польскага паэта пры апісанні бітвы Вяля з княжацкім войскам у «Сказе пра Вяля»:

Ой, сышліся госці тут з палёў шырокіх:
Войска Вяля з войскам князя пагуляць!
І палілася зарой чырвонай брага,
Мёд гарачы, хмельны мёд па барадзе.

...Як зайгралі косы «Юрачку» стальныя,
Узнялі коні капытамі «Крыжачок»,
Як «Лявоніха» над сосны баравыя
Лапцем шэрым узмяцеліла пясок!
*(1, 148-149)*

Абодва паэты, як бачым, шырока выкарыстоўвалі дасягненні народнай творчасці. Аднак М. Танк абавязаны Б. Ясенскаму, відаць, не столькі мастацкімі прыёмамі, колькі падыходам да тэмы і яе вырашэннем у ідэйна-мастацкім плане, што ў сваю чаргу выклікала неабходнасць выкарыстання падобных паэтычных прыёмаў.

Мастацкія вобразы і прыёмы, якія выкарыстоўваюцца ў фальклоры, арганічна ўплятаюцца ў мастацкую тканіну як паэмы Б. Ясенскага, так і многіх твораў М. Танка:

У Б. Ясенскага:

To nie topól w niebo strzela,
to nie pohuk sowi —
Odpowiada Jakub Szela
Panu Jezusowi.[2]

У М. Танка ў паэме «Нарач»:

---

[1] Jasieński Bruno. Utwory poetyckie.—Warszawa, 1960, c. 87.
[2] Тамсама, с. 84.

То не ў лесе стогнуць сосны,
Не шуміць зялёны бор,—
Гэта пашы рэжуць вёслы
Хваль успенены прастор.

Эх ты, доля, доля-гора,
Эх, рыбацкая зямля!
Заліваецца гармонік,
Падсыпаючы вугля.
*(1, 168)*

У прыведзеных радках, як і ў «Слове», імклівы і хуткі рытм. Увогуле ўся другая частка паэмы «Нарач» і асабліва апісанне вечарынкі напісаны ў духу «Слова». Для беларускага паэта ў даным выпадку быў важным сам спосаб выкарыстання мастацка-выяўленчых і рытмічных сродкаў народнай творчасці. Быў узор выкарыстання іх польскім паэтам. Абапіраючыся на традыцыі польскай рэвалюдыйнай паэзіі, паэт стварае арыгінальныя і высокамастацкія паэтычныя творы.

Так, паўстанне нарачанскіх рыбакоў паказваецца ім як нейкі карагод, як нейкае ўрачыстае і таямнічае шэсце на лодках:

Ну, хлопцы,—
ў даль па моры сінім!
У сяло вярнёмся да зары.
...І песню дружна запяялі
на першых лодках рыбакі.[1]

Сутыкненне рыбакоў з прадстаўнікамі ўлады таксама мае карнавальнае адценне:

Шырака стадам згуртованым, шэрым
лодкі плывуць рыбакоў.
Бурна шуміць расшумеўшыся бераг
морам людскіх галасоў.[2]

Паўстанне нарачанскіх рыбакоў М. Танк імкнуўся паказаць пры дапамозе новых сродкаў паэтыкі. Для маладога беларускага паэта каштоўным у галіне асваення эпікі быў вопыт рускіх і польскіх пралетарскіх паэтаў. У «Нарачы», як і ў «Слове», шчодра рассыпаны лірычныя адступленні, якія прыкметна вызначаюць характар абодвух твораў. Сваім гучаннем і роллю ў кампазіцыйнай структуры блізкія

[1] Танк Максім. Нарач. Вільня, 1937, с. 43.
[2] Там жа, с. 50.

паміж сабой таксама пачатковыя і заключныя радкі. У эпілогу паэмы «Нарач» М. Танк піша:

А я хачу сонца засеяць на свеце
і ворагам кінуць у вочы з-пад сэрца
апырсканы кроўю гарачаю верш.[1]

У пралогу «Слова» знаходзім наступнае:

Na ten dzień — pokłon jutru od dzisiaj —
trzepocącą się we krwi jak karp,
na glinianej przynoszę wam misie
tę złą pieśń — mój największy skarb![2]

Абодва паэты, развіваючы традыцыі У. Маякоўскага, ствараюць песні пра суровае рэвалюцыйнае жыццё. Іх зыходныя ідэйныя і эстэтычныя пазіцыі супадаюць.

Хоць інтанацыя, танальнасць і вобразнасць некаторых твораў М. Танка і паэмы Б. Ясенскага блізкія, тым не менш М. Танк вёў самастойныя паэтычныя пошукі. Адштурхоўваючыся ад вопыту як рускіх, так і польскіх паэтаў, ён ішоў сваёй дарогай.

У. Калеснік трапна падмеціў роднасць паміж ранняй паэмай «Як бог весяліўся на ігрышчы» М. Танка і цэнтральнай сцэнай паэмы «Слова пра Якуба Шэлю» Б. Ясенскага — размовай Шэлі з Хрыстом. У М. Танка чытаем:

— А што ў вас за свята? — пытае бог дзеда.
— Ты з печы зваліўся? — стары адказаў.—
Не ведаеш, што тлум учора суседа,
Памешчыка з скуры ўсяго абадраў?

А там і паліцыі морду набілі,
Прагналі ўсіх скуралупаў-купцоў,
А двух секвестратараў мы пачапілі
На вербу, з барознаў ганяць вераб'ёў.

Зато сёння граюць цымбалы і струны —
Прагналі ўсіх крывапійцаў-паноў,
На вузкіх загонах будуем камуну
Без дабрадзеяў паноў і папоў.[3]

Крытык піша: «Тут збольшага мадыфіцыравана, няўмела асучаснена сустрэча Якуба Шэлі з Хрыстом — ключавая сітуацыя паэмы

---

[1] Танк Максім. Нарач — Вільня, 1937, с. 100.
[2] Jasieński Bruno. Utwory poetyckie, c. 48.
[3] ЦДА ЛітССР, ф. 31, вон. 230, спр. 281 (прылажэнне).

Бруна Ясенскага»[1]. І далей: «Хіба маладому Танку не хацелася пераймаць польскіх авангардыстаў? Ён жа... з першых друкаваных радкоў абяцаў выканаць новыя песні, а польская пралетарская «авангарда» дэманстравала рэвалюцыйную навізну ў паэзіі, навізну абсалютную ў змесце і форме. Дык у чым жа справа?»[2]. Няўдачу маладога паэта даследчык бачыць у «прынцыповай неперай").мальнасці для беларускай паэзіі твораў польскіх авангардыстаў». Паводле меркавання крытыка, у беларускай літаратуры не было тых традыцый, якія трэба было разбураць, а ў польскай літаратуры Б. Ясенскі разбураў сваім творам «млодапольскія» традыцыі.

З У. Калеснікам можна згадзіцца толькі часткова. Сам прыём размовы Хрыста з чалавекам ідзе ад біблейскіх традыцый, ён шырока распаўсюджаны ў фальклоры многіх народаў, выкарыстоўвалі яго таксама многія паэты, напрыклад У. Маякоўскі ў «Чалавеку», «Флейце-пазваночніку», «Воблаку ў штанах». Калі гаварыць у даным выпадку пра літаратурныя традыцыі, то неабходна, відаць, адзначыць сувязь з паэмай Б. Ясенскага, якая выклікала ў М. Танка асаблівае захапленне. Тут у першую чаргу ён вучыўся дасканаласці і прастаце паэтычнай мовы, майстэрству выкарыстання фальклору ў мастацкіх мэтах, прымяненню гістарычпага матэрыялу для вырашэння надзённых задач, якія стаялі перад пралетарскай паэзіяй. Імпанаваў беларускаму паэту таксама і палемічны, антырэлігійны характар паэмы Б. Ясенскага. Няўдачу маладога беларускага паэта трэба вытлумачыць перш за ўсё адсутнасцю ў яго літаратурнага вопыту, што прыводзіла часам да чыста знешняга перайманне папярэдніх літаратурных традыцый.

Прыкметнае месца ў польскай рэвалюцыйнай паэзіі міжваеннага дваццацігоддзя належыць В. Вандурскаму і С. Р. Стандэ. Наўрад ці варта знаходзіць падабенства, паралелі ці пераклічку паміж вершамі «Сталярка», «Лета 1923», «Агітатар», «Прэч з канарэйкамі» В. Вандурскага, «Правакатар» С. Р. Стандэ і рэвалюцыйнай творчасцю М. Танка. У даным выпадку хутчэй за ўсё варта гаварыць пра ідэйна-эстэтычную блізкасць, якая не скоўвала індывідуальнасць беларускага паэта, а збліжала яго творчасць з польскай рэвалюцыйнай паэзіяй.

На мяжы 20-30-х гадоў у пралетарскую паэзію прыйшлі Л. Шэнвальд, Л. Пастарнак, Э. Шыманскі, А. Воліца і інш. Росквіт іх творчасці прыпадае на 30-я гады.

Адным з таленавітых польскіх пралетарскіх паэтаў быў Э. Шыманскі. Яго вершы вызначаюцца глыбінёй лірычнага пачуцця і

[1] Калеснік Уладзімір. Зорны спеў. Мн., 1971. с. 18.
[2] Там жа.

страсным публіцыстычным гучаннем. М. Танка збліжае з Э. Шыманскім тое, што яны ў сваёй паэзіі часта карыстаюцца зброяй вострай сатыры, з'едлівай іроніі («Лакаут», «Бюджэт», «Велікодная балада» і інш. Э. Шыманскага, «Адказ», «Пачатак оды», «Гаворацъ, кат памёр», «Эпітафія» і інш. М. Танка). Гэта асаблівасць паэзіі беларускага паэта дазваляе гаварыць і пра яе сугучнасць з творчасцю Л. Пастарнака («Ноччу», «Скажыце мне», «Да аднаго паэта» і інш.). Назіраецца ідэйна-тэматычнае падабенства творчасці М. Танка і Э. Шыманскага (вершы «Спатканне» беларускага паэта і «Бацька і сын» польскага, у якіх яны раскрываюць кожны па-свойму праблему адносін пакаленняў). Асобныя іх лірычнкя вершы па сваёй танальнасці вельмі блізкія («Да маёй маці» Э. Шыманскага і «Над калыскай» М. Танка).

Пра творчасць М. Чухноўскага, эксперыментатара ў галіне паэтычнай формы, М. Танк у сваім дзённіку пісаў: «Мне ж здаецца, што хоць яго вершы арыгінальныя, пранізаныя рэвалюцыйным духам, пахнуць потам і сырой зямлёй — замала маюць у сабе паэзіі. Можа, я памыляюся як чалавек, выхаваны на зусім іншых паэтычных канонах і традыцыях» (6, 73). Запіс зроблены ў лютым 1936 г., у той час, калі ў М. Танка ўжо амаль склаўся ўласны паэтычны стыль. Гэта гаворыць пра тое, што пры ўсёй зацікаўленасці фармальнымі пошукамі польскай паэзіі ён заставаўся мастаком, творчасць якога абапіралася на жыццё свайго народа. Для яго блізкімі і важнымі былі не столькі слоўныя і фармальныя эксперыменты, колькі думкі і пачуцці, якія выяўляла паэзія.

М. Танк выказаў свае адносіны да творчасці В. Скузы, прадстаўніка так званай сялянскай тэматыкі ў польскай паэзіі: «Праўда, я не ўсе яго творы чытаў. Але тое, што знаю, асабліва яго паэмы, перагружана вобразамі, метафарамі» (6, 181). Характэрна, што ў 1938 г., калі ўзнік гэты запіс, паэзія М. Танка вызвалялася ад ускладненай вобразнасці, уласцівай некаторым яго ранейшым творам, станавілася прасцейшай і больш дасканалай. Аднак пазней, у ліпені 1939 г., паэт адзначыць, што радаслоўная творчасці В. Скузы ідзе ад геніяльнага «Слова пра Якуба Шэлю» Б. Ясенскага (6, 280).

Творчасць М. Танка 30-х гадоў і паэзію польскіх рэвалюцыйных паэтаў 20-30-х гадоў жывіла суровая міжваенная рэчаіснасць. Гэта паэзія глыбока народная, грамадзянская і патрыятычная. Аднолькавымі былі гістарычныя і сацыяльныя ўмовы, у якіх яна развівалася, што таксама садзейнічала збліжэнню мастацкіх пошукаў М. Танка і польскіх паэтаў. Важным было і тое, што беларускага і польскіх пралетарскіх паэтаў аб'ядноўвала агульная ідэйна-эстэтычная праграма, заснаваная на марксісцкім светапоглядзе.

Гаворачы пра сувязі творчасці М. Танка з польскай паэзіяй міжваеннага дваццацігоддзя, нельга не закрануць яго адносіны да некаторых новых кірункаў у тагачаснай польскай паэзіі — кракаўскага «Авангарда», варшаўскага «Скамандра» і віленскіх «Жагараў». Ніводная з названых груп не з'яўлялася нечым адзіным цэлым. Паміж іх праграмнымі ўстаноўкамі назіралася як падабенства, так і адрозненне. Праўда, і авангардыстаў, і скамандрытаў, і жагарыстаў аб'ядноўвала тое, што яны вялі эксперыментальныя пошукі новых форм паэзіі. А гэта не магло не зацікавіць М. Танка, які імкнуўся абнавіць не толькі змест, але і форму тагачаснай заходнебеларускай паэзіі. Аднак неабходна ўлічваць, што творчасць польскіх паэтаў, якія ўваходзілі ў названыя групоўкі, і паэзія М. Танка былі выкліканы да жыцця ў пэўнай ступені і рознымі сацыяльна-гістарычнымі ўмовамі.

Як польская, так і беларуская крытыка пісала пра сувязі Максіма Танка з польскім «Авангардам». А. Мікулка, напрыклад, пісаў у 30-я гады: «Тэхнічныя дасягненні (не дзівацтвы!) «Авангарда» Танк здолеў выкарыстаць з карысцю для свайго таленту»[1]. Е. Путрамант у артыкуле «Максім Танк і беларуская паэзія»[2] таксама адзначаў, што быў час, калі паэзія Танка ўбірала рысы, уласцівыя польскаму «Авангарду». Гэта выяўлялася ў ломцы метра і ў падпарадкаванні рытмікі метафары. Але, паводле меркавання крытыка, гэта працягвалася нядоўга, хоць і дазволіла беларускаму паэту па-сапраўднаму ацаніць смелую, пластычную і трапную метафару. С. Сасноўскі ў артыкуле «Новая кніга Максіма Танка»[3] не разглядаў у якасці асобнага пытання ўзаемадзеянне паэзіі М. Танка з польскай авангарднай літаратурай. Ён толькі адзначыў, што творчасці беларускага паэта неўласціва ўскладненая вобразнасць, якая была характэрнай для польскай авангарднай літаратуры. Сучасныя польскія крытыкі таксама закранаюць тэту праблему, аб чым размова будзе ісці крыху далей.

Беларуская крытыка па-рознаму ацэньвае ўплыў польскай авангарднай літаратуры 20-30-х гадоў на творчасць М. Танка. У. Калеснік піша: «Сустрэча Танка з «Маладняком», а таксама з польскай рэвалюцыйнай паэзіяй, поўнай мадэрністычных дзівацтваў, ускладніла яго працу над асваеннем класікі. Але ўвогуле гэта знаёмства прынесла больш карысці, чым шкоды, бо дапамагло паэту знайсці сябе, ухваляючы творчую дзёрзкасць у адносінах да аўтарытэтаў, расшыраючы ўяўленне аб выяўленча-стылявым багацці літаратуры.

---

[1] Mikulko Anatol. Maksim Tank - białoruski Jesienin.- Kurier Wileński, 29 lipca 1939, c. 3
[2] Sygnały, 1939, N 75, c. 5.
[3] Sygnały, 1938 N 50, c. 7.

...І толькі нявопытнасцю, з аднаго боку, і асаблівасцямі рэвалюцыйнай паэзіі пачатку 30-х гадоў, з другога, можна вытлумачыць пэўную падатлівасць на ўплывы»[1].

Гэту думку У. Калесніка аспрэчвае Дз. Бугаёў, спасылаючыся на прызнанне самога М. Танка, які падкрэсліў у размове з крытыкам, што ўплыў «Маладняка» на заходнебеларускую літаратуру нельга ні ў якім разе перабольшваць, нічога супольнага заходнебеларускія паэты не мелі і з віленскімі «Жагарамі». Жагарысты ўвогуле арыентаваліся на Захад. Не апраўдана і супастаўленне з кракаўскім «Авангардам». Там была зусім іншая сістэма вобразаў. М. Танк сцвярджаў, што заходнебеларускія паэты ведалі творчасць прагрэсіўных польскіх пісьменнікаў, але «Авангард» і «Жагары» — гэта зусім іншае[2].

Пра сувязі творчасці беларускага паэта з польскай авангарднай літаратурай пісалі таксама І. Ралько[3] і М. Арочка[4].

Перабольшваць ці, наадварот, адмаўляць уплыў авангардысцкай паэзіі на творчасць М. Танка нельга. Ступень і формы гэтага ўзаемадзеяння па-рознаму праяўляліся ў розныя перыяды творчасці паэта. Пры разглядзе гэтай праблемы трэба падыходзіць строга дыферэндыравана да шматлікіх напрамкаў у тагачаснай польскай літаратуры. Адны з іх былі для паэта прымальнымі, другія — проста незразумелымі і дзівацкімі. Таму трэба, відаць, гаварыць пра агульныя тэндэндыі, характэрныя для яго даваеннай творчасці і для польскай паэзіі міжваеннага дваццацігоддзя.

Пры гэтым трэба ўлічваць светапогляд паэта, асаблівасці яго таленту і ўвогуле характар заходнебеларускай літаратуры. «І ў нас «мадэрнізм»,— адзначае паэт,— не быў мадэрнізмам, а сістэмай вобразаў, вельмі моцна звязаных з рэальным жыццём, з побытам народа. Можа не заўсёды пошукі былі ўдалымі, але паэты заўсёды імкнуліся да праўдзівага, рэалістычнага вобраза...»[5]

Заходнебеларуская літаратура развівалася ў крыху іншых сацыяльна-гістарычных умовах. З'яўляючыся рэвалюцыйнай і рэалістычнай, творчасць М. Танка не магла быць у той жа час віталістычнай, як творчасць скамандрытаў. Непрымальнымі былі для паэта беспраграмнасць і слоўныя эксперыменты паэтаў «Скамандра». У М. Танка была пэўная і выразная праграма. Ён прыходзіў да вываду, «што сапраўд-

---

[1] Калеснік Уладзімір. Паэзія змагання, с. 26.

[2] Бугаёў Дзмітрый. Паэзія Максіма Танка.— Мн., 1964, с. 31.

[3] Ралько Іван. Верша жывое жыццё.— Маладссць, 1963, № 5, с. 125-139.

[4] Арочко Н. Н. Максим Танк: История белорусской советской литературы— Мн., 1977, с. 573-574

[5] Маладосць, 1963, № 5, с. 128.

ная паэзія пачынаецца не ад слоўнай і рытмічнай эквілібрыстыкі, але — ад думкі» (6, 29). Тым не менш у паэзіі скамандрытаў былі такія якасці, якія не маглі не прыцягнуць увагі М. Танка. Гэта тое, што яны імкнуліся развіваць сваю паэзію, не парываючы з нацыянальнай паэтычнай традыцыяй, пераадольваючы адмоўныя бакі млодапольскай паэзіі, а таксама набліжаць паэтычную творчасць да жыцця.

В. П. Ведзіна правільна піша, што «лозунгі цеснай сувязі паэзіі з жыццём, незвычайна сур'ёзныя адносіны да творчага працэсу, увядзенне ў паэзію прамысловага горада як аднаго з асноўных аб'ектаў адлюстравання — усе тыя патрабаванні, якія ставіла перадавое ядро «Авангарда», узятыя самі па сабе, былі прагрэсіўнымі»[1]. «Але ў цэлым,— працягвае далей даследчыца,— «Авангард» не быў рэвалюцыйнай літаратурнай групай. Пераважная большасць яго членаў на словах выступала за набліжэнне літаратуры да патрабаванняў рэчаіснасці, але на справе аддалялася ад рэалістычнага яе адлюстравання, ствараючы свайго роду паэтычныя рэбусы, снабісцка-эстэцкія галаваломкі»[2]. Гэта было непрымальным для М. Танка. Характэрна, што многія польскія паэты ўжо ў канцы 20-х гадоў выступілі з вострай крытыкай асноўных ідэйных і мастацкіх палажэнняў як «Авангарда», так і іншых літаратурных груповак.

Тым не менш група «Скамандр», як і група кракаўскага «Авангарда»,— гэта гісторыя польскай літаратуры не толькі першага дзесяцігоддзя, але і другога. В. П. Шыманскі піша: «Над другім міжваенным дзесяцігоддзем насіліся духі «Скамандра» і «Авангарда». Калі першы быў пасіўным... то дух кракаўскага «Авангарда» вельмі часта вяртаўся да свайго зямнога вобліку ў двайным сэнсе. З аднаго боку, большасць авангардыстаў развівалі свае тэарэтычныя погляды на працягу ўсяго таго перыяду, перш за ўсё Ян Бжанкоўскі і Юліян Пшыбась... З другога боку, «бацыла» сучаснай паэзіі, прышчэпленая самім Пайперам, была бацылай вельмі жывучай. Кожны паэт, які ведаў, што лірыка — гэта пашырэнне бачання, пошукі новых дарог ці проста развіццё, мусіў у першай фазе сваёй творчасці дазволіць той бацыле функцыяніраваць у арганізме, а ў другой фазе як-небудзь яе перамагчы, ці, можа, больш дакладна, прыстасаваць, ператварыць, каб не шкодзіла, а наадварот — памагала»[3].

---

[1] Ведіна В. П. Літературно-громадські зв'язки пролетарських письменників Західноі Украіны і Польшчі 20-30-х років XX ст.— Киів, I960, С, 18.
[2] Тамсама
[3] Szymański W. P. Neosymbolizm.— Kraków, 1973, с. 321.

Творчасць М. Танка развівалася ў цесным узаемадзеянні з прагрэсіўнай польскай паэзіяй 30-х гадоў. Аднак паэт цікавіўся і авангардысцкай паэзіяй. Ён пісаў: «Паэзія наша ўсё яшчэ развіваецца ў нейкай самаізаляцыі ад усіх сучасных авангардысцкіх напрамкаў, якія адмовіліся ад старых рыфмаў, дакучнай меладыйнасці, кананічнай логікі развіцця вобразаў. Трэба будзе пазнаёміцца з творчасцю Пайпера... Адно мне здаецца, што прадстаўнікі авангарда замала ўдзяляюць увагі ідэйнай старане. Можа, наша гісторыя выхавала нас такімі «абмежаванымі», але для нас сапраўдная авангардная літаратура перад усім мусіць быць рэвалюцыйнай» (6, 90-91).

М. Танк разумеў, што, засвойваючы асобныя станоўчыя якасці «Авангарда», неабходна адкідаць адмоўныя, непрымальныя для яго паэзіі: «Стараюся сарыентавацца ў джунглях розных сучасных напрамкаў і школ... У нас часта гаворыцца аб вернасці традыцыям. Сапраўднай традыцыяй павінен быць бунт супроць усяго, што аджыло свой век, бунт супроць розных схем, а не наследаванне адкрыццям мінулага» (6, 271). І далей: «У адным я перакананы, што не літаратурныя напрамкі і школы нараджаюць пісьменнікаў, не літаратурныя напрамкі і школы ствараюць выдатныя творы. Павівальнай бабкай было і будзе — жыццё» (6, 315).

Як бачым, М. Танк хацеў падняць беларускую літаратуру да ўзроўню высокаразвітых тагачасных еўрапейскіх літаратур. З другога боку, той жа польскі «Авангард», ствараючы новую паэтыку, адмаўляў маладапольскія традыцыі ў літаратуры. Многім творам беларускай літаратуры яшчэ з часоў «Нашай нівы» былі ўласцівы слязлівасць і манатоннасць. Як сказаў паэт, старыя рыфмы і дакучная меладыйнасць праніклі і ў заходнебеларускую літаратуру. М. Танк павінен быў усё гэта пераадолець. Аднак неабходна ўлічваць і спецыфічныя нацыянальныя ўмовы, у якіх развівалася заходнебеларуская літаратура. Прачытаўшы В. Хлебнікава, М. Танк зрабіў вывад: «Мне здаецца, што падобнымі эксперыментамі могуць займацца паэты, перад якімі ніколі не стаяла пытанне: быць ці не быць іх мове? Аж зайздросна, што ёсць на свеце пісьменнікі, якіх ніколі не трывожыла гэта праблема» (6, 27-28). Творчасць М. Танка была надзвычай цесна звязана з жыццём, у яго была выразная ідэйна-эстэтычная праграма. Гэта ў значнай ступені выратоўвала ад авангардысцкіх уплываў.

Аднак авангардысцкіх уплываў паэт не пазбег у сваёй творчасці. Найбольш прыкметна яны выявіліся ў паэтычнай форме.

Безумоўна, знаёмства з паэзіяй авангардыстаў, асабліва ў пачатковы перыяд творчасці, пашырала яго ўяўленне пра мастацкія магчымасці літаратуры. І калі паэзія Танка была ў нечым блізкай да поль-

скай авангарднай літаратуры, то гэта блізкасць выяўлялася хутчэй за ўсё ў бунце супраць старой паэтычнай формы і ў барацьбе за новую рэвалюцыйную паэтыку, Відаць, у нейкай ступені пад уздзеяннем знаёмства Танка з тагачаснай польскай паэзіяй, якая ламала ўстаноўленыя класічныя рытмы і метры, узнік у яго творчасці свабодны верш. З'яўленне ў лірыцы паэта першай палавіны 30-х гадоў экстравагантных вобразаў і асацыяцый, якія ўскладнялі ўспрыманне асобных вершаў, варта вытлумачыць як нявопытнасцю, так і ўплывам авангардысцкай паэзіі.

Чытаючы «Лісткі календара», пераконваемся, наколькі складаным, няпростым, а часам і вельмі супярэчлівым быў шлях творчага пасталення паэта. Паказальны ў гэтых адносінах запіс, зроблены ў дзённіку ў 1938 г., тады, калі ўжо, здавалася б, паэт меў уласны паэтычны стыль: «Дзве рэчы пакуль што не змог заваяваць: поўную самабытнасць і незалежнасць» (6, 241). І гэтыя словы сведчаць пра неўтаймаванасць душы мастака, пра яго няпростыя шляхі да пазнання ісціны.

Паэт не прымаў таго, што не было звязана з жыццём, што з'яўлялася часам голай дэкларадыяй ці сухой догмай. Але ён не адмаўляўся ад арыгінальнасці. І на гэтым шляху быў падобны іншы раз на Ясеніна ці Маякоўскага. Ясенінская вобразнасць, інтанацыі выразна адчуваюцца ў наступных радках:

А дзень, зачапіўшыся рыжай чупрынай,
доўга вісеў,
паміраў
на бярозах.[1]

У вершах Танка ранняга перыяду можна было знайсці такія вобразы, як «Ведер кудлаты кульгаючы шэпча», «сінядымныя думкі», «сны каласіста-узорныя» і інш. Праўда, імкненне паэта гаварыць красамоўна і арыгінальна стрымлівала яго «сялянскае» светаўспрыманне. Сваю паэзію ён адрасоўваў простаму народу. Ускладненасць і ўпрыгожванні рабілі яе цяжкай для ўспрымання. Таму паэт імкнуўся да прастаты паэтычнага выказвання, ствараючы вершы, якія былі б зразумелымі і адначасова дасканалымі ў мастацкіх адносінах. У другой палавіне 30-х гадоў верш Танка ўраўнаважыўся, метафара са сродку ўпрыгожвання ператварылася ў сродак пазнання рэчаіснасці («Павязлі цягнікі», «На пероне»).

Сляды ўплыву новай еўрапейскай паэзіі 30-х гадоў, асабліва польскай, можна знайсці ў такіх вершах, як «На шляху дзікіх гусей» ці

---

[1] Танк Максім. На этапах, с. 31.

«Руёй». Аднак істотным і вызначальным быў уплыў на беларускага паэта польскай рэвалюцыйнай літаратуры. І хоць ранні Б. Ясенскі быў футурыстам, а У. Бранеўскі звязаны са «Скамандрам», тым не менш і тады, калі яны сталі рэвалюцыйнымі паэтамі, поўнасцю не адмовіліся ад некаторых прыёмаў сваёй ранняй паэтыкі. Варта ўлічыць, што такія паэты-авангардысты, як М. Чухноўскі, Ю. Пшыбась, Л. Півавар, у асобных вершах востра крытыкавалі капіталістычны лад. Танк праяўляў зацікаўленасць да іх творчасці (6, 72-73, 168-169).

Таму, відаць, трэба гаварыць пра выяўленне ў творчасці Танка 30-х гадоў асноўных рыс авангардызму, уласцівых увогуле міжваеннай польскай паэзіі. І калі лозунгі «Авангарда» Т. Пайпера ці «Скамандра» зжылі сябе нават у польскай паэзіі 30-х гадоў, то паняцці «авангардны», «авангардная літаратура» ў сэнсе «новая літаратура» працягвалі існаваць.

Пры аналізе сувязей М. Танка з польскай літаратурай трэба разгледзець таксама яго адносіны да паэзіі віленскіх польскіх паэтаў Т. Буйніцкага, Е. Загурскага, Е. Путраманта і А. Мікулкі, якія ўваходзілі ў паэтычную групу «Жагары» (1931-1934).

Творчасць названых паэтаў займае прыкметнае месца ў міжваеннай польскай паэзіі. Паэзія М. Танка і жагарыстаў развівалася ў падобных гістарычных умовах. Шмат у чым супадалі іх ідэйныя і мастацкія пошукі. І хоць «Жагары» як літаратурная група перасталі існаваць ужо ў 1934 г., аднак кожны паэт у далейшым развіваў ідэі гэтай групы. М. Танк добра ведаў паэзію жагарыстаў. Яму не маглі не імпанаваць у іх творчасці грамадзянскі неспакой і інтэлектуальнасць лірыкі, імкненне вызваліць сваю паэзію ад ускладненай вобразнасці і тэндэнцыі да прастаты выражэння думак. Паэты жагарысты натхнёна працавалі над удасканаленнем паэтычнай формы. Яны вялі інтэнсіўныя пошукі і па ўзбагачэнню і ўдасканаленню паэтычнай вобразнасці, асабліва метафары.

Творча засвоіўшы вопыт польскіх паэтаў, М. Танк здолеў стварыць уласны паэтычны стыль. Гэта прыкметна выявілася ў вершах, што ўвайшлі ў зборнік «Пад мачтай». Возьмем, напрыклад, верш «Павязлі цягнікі»:

Толькі, гэткую песню
Пачуўшы, вітрыны
Раптам гаслі,
Трывожна крычалі гудкі...
І ляцелі на вёскі
З новай весткай няспынна
Ашалелыя,

З грывай агню
Цягнікі.

*(1, 257-258)*

Паэт звяртаедца тут да ўмоўна-асацыятыўнай вобразнасці. Але адлюстраванне пры гэтым не страчвае сваёй рэалістычнасці.

М. Танк, як і польскія паэты, у пошуках новых, сучасных рытмаў ламаў ранейшыя гладкія і манатонныя рытмы і шырока выкарыстоўваў ломаныя, празаічныя («Чорныя скібы», «Да дня», «На шляху дзікіх гусей» і інш.). Гэта не перашкаджала, а, наадварот, дапамагала даць псіхалагічна дакладны і глыбокі партрэт вязня (верш «Да дня»):

Гэта было так проста,
што нат не пісалі газеты,—
толькі ў актах справы стаяла:
родам з Палесся... год 20...
...аб'ездзіў без білета далёкія старонкі:
Каранова, Горадзень, Вронкі.
Сам быў сярэдняга росту,
чупрына ляжала і крыва і проста,—
потым не спадабалася — знялі.[1]

Верш пазбаўлены тут паэтычных упрыгожванняў, але ён заключае ў сабе вялікі зарад эмацыянальнай энергіі.

У адрозненне ад паэзіі скамандрытаў давераснёўская лірыка М. Танка была пазбаўлена рытарычнай дэкларацыі «слоў-рэчаў». Рытм у яго не затушоўваў сэнсу, а, наадварот, паэтычна завастраў і ўдакладняў змест верша. Да гэтага імкнуліся ў сваёй творчасці таксама віленскія польскія паэты.

Вобразнасць беларускага паэта, хоць часам мела і кніжнае адценне, вельмі часта засноўвалася на фальклорнай аснове і народным светаўспрыманні. Возьмем для прыкладу некаторыя вобразы са зборніка «На этапах»: «песні скутыя жывыя», «разбуджаных дарог», «струны-барозны», «думы, як стада варон», «звон касы сіратлівы», «расцвітаючай расы», «у жоўтым шуме каласоў», «вуголле зор», «дождж заплакаў», «птушкай вецер біўся ў вокны, ныў, шумеў, стагнаў» і інш. Гэта сведчыць, што ў паэта вельмі абвостранае паэтычнае ўспрыманне жыцця і надзвычай праніклівы паэтычны погляд.

Інтэлектуальнае бачанне рэчаіснасці дазволіла жагарыстам паказаць жыццё глыбей і шырэй. Аднак празмерны інтэлектуалізм ускладняў гэту паэзію, рабіў яе зразумелай вузкаму колу чытачоў.

---

[1] Танк Максім. На этапах, с. 97.

М. Танк пісаў для шырокіх народных мае, але яго паэзія не была спрошчанай. Рэвалюцыйны характар, шырыня ахопу жыцця і высокая культура паэтычнай творчасці — вось яе вызначальныя рысы. Усяму гэтаму маглі павучыцца ў М. Танка віленскія польскія паэты.

У сярэдзіне 30-х гадоў прайшла ўжо хваля «Авангарда» і з'явіліся паэты, якія здолелі творча выкарыстаць асобныя авангардысцкія дасягненні, не страчваючы пры гэтым уласнага мастацкага аблічча. На аслабленне ўвагі да авангардысцкіх тэорый у значнай ступені ўплывала таксама тагачасная палітычная сітуацыя ў свеце, калі набліжалася другая сусветная вайна. Таму перад паэтамі на першым плане стаяла задача не столькі вырашыць пытанні паэтыкі, колькі вызначыць сваю пазіцыю. Маладыя польскія паэты асвойвалі новы духоўны змест, а не толькі новыя выяўленчыя сродкі.

Паэты прадчувалі набліжэнне новай вайны. У вышку нарадзіўся катастрафізм лірыкі Ю. Чаховіча, а таксама Е. Загурскага. З другога боку, трагічныя ці песімістычныя перажыванні, асабліва ў творчасці асобных віленскіх паэтаў, вынікалі з гатоўнасці да барацьбы і рашучага пратэсту супраць застаялай рэчаіснасці.

Трагічныя матывы ў такіх вершах М. Танка другой палавіны 30-х гадоў, як «Над курганамі», «У апалены ветрам марозным асіннік», «Руёй», «Бярозе», з'явіліся рэакцыяй паэта на падзеі, якія тады адбываліся (мілітарызацыя Германіі, паражэнне рэспубліканскай Іспаніі, роспуск у 1938 г. Кампартыі Заходняй Беларусі). Магчыма, адбілася ў даным выпадку таксама знаёмства паэта з тагачаснай польскай паэзіяй. Але ў вершах паэта не было матываў роспачы, асуджанасці і безвыходнасці чалавечага існавання. У іх выявілася разнастайнасць лірычнага асэнсавання мастаком рэчаіснасці. Гэта былі хутчэй за ўсё пратэст супраць буржуазнай рэчаіснасці і спроба асэнсаваць месца чалавека ў навакольным свеце.

Рэвалюцыйны характар яго лірыкі не дазволіў збіцца з правільнага і надзейнага шляху. Таму нават у вершах «Межы», «Такая лютая зіма», «Калі пачуеш: я памёр», напісаных вясной 1938 г., калі была распушчана КПЗБ, адчуваюцца жыццесцвярджальны пафас і рэвалюцыйны аптымізм. У вершы «Такая лютая зіма» паэт заклікае:

Глядзіце: струны паржавеюць —
Не вытраце іх і агнём,—
Парвуцца і задрэмлюць сном,
Закалыханыя завеяй.

Даўно ў шалёным карнавале
Зямля трывожная гучыць.

Хутчэй давайце, скрыпачы,
Чырвоны гром сваім цымбаламі

*(1, 276)*

Заходнебеларуская рэвалюцыйная літаратура, асабліва паэзія М. Танка, уздзейнічала на віленскіх польскіх паэтаў, якія выступалі за такую творчасць, што, паводле слоў Е. Загурскага, «павінна быць у элементарным крытычным канфлікце з рэчаіснасцю»[1]. Паэзія М. Танка захапляла іх сваёй незвычайна цеснай сувяззю з жыццём, мастацкай дасканаласцю, грамадзянскім і патрыятычным пафасам, мужнасцю.

Прыкметны ўплыў М. Танка на творчасць віленскіх польскіх паэтаў цяжка выявіць. Сам паэт пісаў: «Мяне цікавяць польскія паэты з Віленшчыны таму, што мы працуем над адным і тым жа матэрыялам, толькі іх больш вабіць зялёны колер гэтай зямлі, а нас — яшчэ і чырвоны» (6, 168). Тут беларускі паэт мае рацыю толькі часткова, бо ў асобных вершах Т. Буйніцкага і Е. Путраманта выразна адчуваюцца грамадзянскія і нават рэвалюцыйныя ноты. Розніца заключаецца ва ўзроўні таленту, у творчай пазіцыі паэтаў.

Падабенства можна знайсці паміж рэвалюцыйнай лірыкай М. Танка і творчасцю Т. Буйніцкага, калі польскі паэт закранае сацыяльныя матывы. Так, у вершы «Плакат» Т. Буйніцкі звяртаецца да простых працаўнікоў з заклікам аб'яднацца і змагацца са «старым светам за праўдзівы воблік радзімы». У вершы «Да паэта» выказваецца страсны пратэст супраць рэжыму санацыйнай Польшчы. Аднак асобныя яго вершы (напрыклад, «Поўнач») атрымаліся абстрактна-сузіральнымі, паэтычныя радкі ў іх расцягнутыя і анісальныя: «Гнеў рук і падымае да неба, пагражаючы. //Рукі цяжка ападаюць,// як рад чорных матык»[2]. У вершах М. Танка «Не плач», «Пачатак оды» мацней і выразней гучыць сацыяльны пратэст, больш натуральны і просты паэтычны радок, глыбей перададзены думкі і пачуцці.

Пошукі, якія вёў М. Танк па ўдасканаленню паэтычнай формы, былі блізкімі аналагічным пошукам у паэзіі віленскіх польскіх паэтаў. У выкарыстанні рыфмаў беларускі паэт зрабіў у заходнебеларускай паэзіі 30-х гадоў па сутнасці рэформу, заснаваную на шырокім прымяненні асанансаў і прыблізных рыфмаў. Да гэтага ж імкнуліся і віленскія польскія паэты ў 30-я гады. М. Танк па-майстэрску выкарыстоўвае алітэрацыю і асананс у вершах «Матыль», «Паслухайце, вясна ідзе», «Вільня» і інш.

---

[1] Цыт па кн.: Szymański W. P. Od metofory do heroizmu.— Krakow, 1967, с. 86.
[2] Bujnicki Teodor. Wiersze wybrane.— Warszawa, 1961, с. 49.

Можна правесці паралель паміж пейзажнымі вершамі «Лісце каштанаў» (1937) М. Танка і «Букі» (1939) Т. Буйніцкага. Польскі паэт добра ведаў творчасць беларускага паэта. Цудоўны пераклад названага верша на польскую мову зрабіў К. А. Яворскі. Відаць, Т. Буйніцкі не мог абысці ўвагай гэты верш:

За шэрым схіленым парканам
Скрыпіць пясок сырых дарог,
Спадае медны ліст каштанаў
На жоўты стоптаны мурог.
*(1. 252)*

Выразна адчуваюцца танкаўскія інтанацыі ў наступных радках верша «Букі»:

Powleczona szkłem i puchem,
potrącona strugą wiatru,
dźwięcznym trzaskiem, szeptem kruchym
dzwoni srebrna gałąź buku.[1]

Т. Буйніцкі напісаў цікавы верш, якому ўласцівы шчыры лірызм. Аднак ён у дастатковай ступені не раскрыў пачуццё захаплення ад прыгажосці навакольнай прыроды. Польскі паэт у заключных радках верша піша: «Гэту прыгажосць прыроды цяжка перадаць... Вярніся дамоў, сядзь і напішы: звоняць сярэбраныя галінкі бука». У М. Танка больш тонка і глыбока перададзены душэўны стан лірычнага героя, у агульных рысах і прыблізна які можна перадаць так: восень — гэта пара замірання прыроды, але сумаваць яшчэ рана, бо чалавек, нягледзячы на ўсе нягоды, можа здзіўляцца і захапляцца жыццём, можа бачыць прыгожае ў навакольным свеце.

Відаць, М. Танк зрабіў уплыў таксама на творчасць Е. Путраманта. Калі ў першым зборніку польскага паэта «Лясная дарога» пераважалі вершы пейзажныя, лірычныя, то ў другім «Гратэск і песні» ён звяртаецца да сацыяльных матываў, піша сатырычныя вершы («Ваенны парад», «Малітва пакораных» і інш.), у якіх назіраецца ідэйная і мастацкая эвалюцыя паэта. У адным з лепшых сваіх вершаў 30-х гадоў «Сябрам-паэтам» Е. Путрамант піша:

Ucz się w lat chwytać wiatru kierunek, kark trenuj,
Bo trzeba będzie szybciej i niżej się kłaniać.[2]

Гэтыя радкі сугучныя танкаўскім («Пачатак оды»)

Мецъ толькі трэба трохі спрыту
Без мазалёў балючых рукі,

---

[1] Там жа, с. 132.
[2] Putrament Jerzy. Wiersze wybrane 1932-1949.— Warszawa, 1951, с. 65.

І трохі больш мякчэйшых скабаў,
І рыбны хвост, каб плыць за модай.
*(1, 267)*

Для польскага паэта тут быў важным сам мастацкі прыём, выкарыстаны М. Танкам, яго падыход да тэмы. Безумоўна, на абодвух паэтаў уплывалі сацыяльна-гістарычныя ўмовы, у іх былі падобныя творчыя задачы.

На паэзію віленскіх польскіх паэтаў, як і на творчасць М. Танка, прыкметны ўплыў зрабіла руская савецкая літаратура. Польскія паэты выступалі ў абарону сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа, падтрымлівалі яго рэвалюцыйную барацьбу, прапагандавалі беларускую літаратуру ў Польшчы. Усё гэта спрыяла дэмакратызацыі і інтэрнацыяналізацыі творчасці жагарыстаў.

Аднак М. Танк сваёй творчасцю прыкметна вылучаўся не толькі сярод заходнебеларускіх, але і сярод віленскіх польскіх паэтаў. Як Я. Купала, Я. Колас і М. Багдановіч у пачатку XX ст., М. Танк у 30-я гады выявіў дух і запатрабаванні свайго часу. У гэтым сіла і вартасць яго паэзіі 30-х гадоў.

## НАМ БЛІЗКІ ВАШАЙ МОВЫ ГУК

М. Танк з'яўляецца адным з актыўных і талемавітых сучасных беларускіх перакладчыкаў. У яго перакладах загучалі на беларускай мове вершы шматлікіх паэтаў Савецкага Саюза, паэтаў краіп сацыялістычнай садружнасці і прагрэсіўньтх сусветных мастакоў слова. Але часцей за ўсё ён перакладае з польскай мовы.

Беларускі паэт выдатна ведае гісторыю і культуру польскага народа, яго мову і літаратуру. Таму зусім заканамерным з'явіўся яго зварот да перакладаў з польскай мовы яшчэ ў 30-я гады. Ужо ў той час М. Танк добра разумеў, што мастацкі пераклад з'яўляецца неабходнай умовай для нармальнага развіцця любой высокаразвітай літаратуры. Свае погляды па гэтаму пытанню ён выказаў у артыкуле «Да справы перакладаў мастацкай літаратуры», дзе адзначаў, што «да самога перакладу неабходна падыходзіць больш паважна, не забываючыся, што гэта не простае рамясло, але адна з тых галін літаратурнай працы, якая вымагае здольнасці вычуцця, веды, апанавання мовы арыгінала і творчага падыходу»[1] М. Танк выступаў у гэтым артыкуле за паглыбленне літаратурных сувязей паміж беларускай і суседнімі рускай, украінскай і польскай літаратурамі.

У сваіх перакладах ён прадоўжыў традыцыі нацыянальнага перакладу, закладзеныя ў пачатку XX ст. Я. Купалам і М. Багдановічам. У М. Танка перакладчыцкая і арыгінальная творчасць цесна ўзаемадзейнічаюць і дапаўняюць адна другую. Мастацкі пераклад становіцца для паэта састаўной і неабходнай часткай творчага працэсу.

У 30-я гады М. Танк перакладаў у асноўным польскіх паэтаў міжваеннага дваццацігоддзя: як з традыцыйнай паэтыкай, так і з наватарскай. Яго творчасці той пары таксама былі ўласцівы многія характэрныя рысы паэтыкі класічнай і новай паэзіі.

У пасляваенныя гады, асабліва ў першай палавіне 50-х гадоў, М. Танк не так інтэнсіўна, як раней, вядзе работу ў галіне паэтычнай формы. Ён не закранае некаторых жыццёва важных, супярэчлівых і складаных праблем, многія яго вершы з'яўляюцца апісальна-публіцыстычпымі і дэкларацыйнымі. У творах таго часу паэт звяртаецца да гістарычнай тэматыкі і фальклорных матываў, піша пра заграніцу, перакладае значныя творы польскай літаратуры (А. Міцкевіча, Ю. Тувіма, У. Бранеўскага і інш.).

Аднак калі новыя тэндэнцыі ў арыгінальнай творчасці паэта выявіліся ў другой палавіне 50-х гадоў, то новыя пошукі ў галіне

---

[1] Калосœ, 1939, кн. 2 (19), с. 91.

паэтычнага перакладу — у сярэдзіне 60-х, калі ён пачаў перакладаць вершы польскіх паэтаў сярэдняга пакалення (Т. Ружэвіча, Б. Драздоўскага, П. Гарасымовіча, Т. Кубяка і інш.).

Сучасная творчасць М. Танка звязана з агульнымі тэндэнцыямі як савецкай, так і перадавой замежнай і асабліва сучаснай польскай паэзіі. Таму ў апошні час ён праяўляе прыкметную зацікаўленасць да перакладаў і польскай мовы і асабліва да сучаснай польскай паэзіі.

## МАКСІМ ТАНК — ПЕРАКЛАДЧЫК ТВОРАЎ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Творы А. Міцкевіча шырока вядомы на беларускай зямлі. У розныя часы іх перакладалі на беларускую мову В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі, Я. Купала, Я. Колас, Б. Тарашкевіч, К. Крапіва, А. Куляшоў, В. Таўлай, П. Пестрак, С. Дзяргай, Ю. Гаўрук, М. Аўрамчык, Я. Семяжон, А. Вялюгін і інш. Вялікая роля ў прапагандзе творчасці польскага паэта належыць М. Танку.

Паэзія А. Міцкевіча прыцягвала і прыцягвае ўвагу многіх беларускіх перакладчыкаў. Заканамерным быў зварот да яе і М. Танка. Традыцыі міцкевічаўскага рамантызму надзвычай моцныя не толькі ў польскай, але і ў беларускай літаратуры. Польскі паэт нарадзіўся на Навагрудчыне, ён многа пісаў пра гэты край, на яго творчасць прыкметны ўплыў зрабіў беларускі фальклор.

Таленавітая лірыка А. Міцкевіча дазваляе перакладчыку выверыць ступень уласнага паэтычнага майстэрства на агульнапрызнаных паэтычных узорах, дапамагае глыбей зразумець вобразна-выяўленчае багацце паэтычнага слова.

Першыя пераклады М. Танка з А. Міцкевіча з'явіліся да 85-годдзя з дня смерці польскага паэта: «Акерманскія стэпы», урывак «Не дбаю, якое праклянцце» з трэцяй часткі паэмы «Дзяды» («Полымя рэвалюцыі», 1940, № 11) і «Бура» («Вольная праца», 19 лістапада 1940).

У пасляваенныя гады, калі стварыліся спрыяльныя ўмовы для пленных кантактаў і ўзаемадзеяння паміж, беларускай і польскай літаратурамі, паэт надрукаваў урывак з чацвёртага раздзела «Пана Тадэвуша» пад назвай «Звярыны лог» («Літаратура і мастацтва», 2 снежня 1945), пераклады з «Крымскіх санетаў» — «Гара Кікінеіс» («Беларусь», 1948, № 12) і «Выгляд гор са стэпаў Казлова», з эпілога да «Пана Тадэвуша», «Хор стральцоў» з паэмы «Дзяды» («Полымя», 1948, № 12), «Да М...» («Прэч з маіх воч!..») («Полымя», 1953, № 10). У кнігу «Выбраныя творы» А. Міцкевіча, выдадзеную да 100-годдзя з дня

смерці паэта, увайшлі новыя пераклады М. Танка — «Лілеі», «Фарыс», «Паліліся мае слёзы...»

М. Танк перакладае самыя прыкметныя і характэрныя творы польскага паэта, якія былі напісаны ім у розныя перыяды творчасці і адрозніваюцца паміж сабой як ідэйна-вобразным сэнсам, так і рытміка-інтанацыйным гучаннем.

«Крымскія санеты» займаюць выключнае месца не толькі ў польскай, але і ў сусветнай літаратуры. Ім уласцівы дасканаласць вершаванай формы і глыбокі ідэйны сэнс.

Спецыфічнасць санетнай формы, асабліва сціласць і завершанасць, стваралі пэўныя цяжкасці для перакладчыка. У значнай ступені справа ўскладнялася і таму, што пераклады рабіліся з блізкай, роднаснай мовы, калі трэба было, не скажаючы сэнсу, перадаць дух арыгінала, захоўваючы пры гэтым самыя тонкія адценні стылю.

Мастацкай дасканаласцю вызначаецца санет «Акерманскія стэпы». На рускую мову гэты твор А. Міцкевіча перакладалі такія вядомыя паэты, як А. Майкаў, А. Фет, І. Бунін, М. Асееў. На беларускай мове санет загучаў у 1922 г. у перакладзе У. Жылкі і ў 1928 г. у перакладзе 10. Гаўрука.

Санет «Акермайскія стэпы» з'яўляецца своеасаблівым уступам да «Крымскіх санетаў». А. Міцкевіч з незвычайнай глыбінёй і сілай перадаў у ім цесную і непарыўную сувязь маляўнічай экзатычнай крымскай прыроды з трывожнымі думкамі, пачуццямі і перажываннямі паэта-выгнанніка:

Stójmy — jak cicho!— słyszę ciągnące żurawie,
Których by nie dościgły źrenice sokoła;
Słyszę, kędy się motyi kołysa na trawie,
Kędy wąż śliską piersią dotyka się zioła.
W takiej ciszy — tak ucho natężam ciekawie,
Że słyszałbym głos z Litwy.— Jedźmy, nikt nie woła!
*(1, 259)*

Адпаведны ўрывак у перакладзе М. Танка:

Як ціха! Спынімся! Я жураvоў лёт чую,
Якіх бы нават сокал быстры не угледзеў;
І як матыль калыша кветку палявую,
Як з шорахам вуж прапаўзае недзе.
У гэткай цішыні так чутка ўсё лаўлю я,
Што чуў бы гук з Літвы.— Ніхто не кліча, едзем!
*(5, 337)*

Радкі верша, то запаволена меладычныя, то абрывіста імпульсіўныя, узбагачаныя алітэрацыяй, ствараюць ураж анне трывожнага

чакання. І як цяжкі працяжны ўздых гучыць заключны радок. Перакладчык вельмі дакладна перадаў гэты заключны міцкевічаўскі радок, такі глыбокі па сэнсу. У перакладзе 1940 г. ён гучаў:

Што чуў бы з Літвы голас. Ніхто не кліча, едзем.

Цікавым з'яўляецца пераклад заключных радкоў санета У. Жылкі і Ю. Гаўрука:

Такі спакой, што, каб паклікаў хто ў Літве,
Пачуў бы я. Дарма! — Ніхто не пазаве.[1]
Застыў і слухаю, напружыўшы аблічча.
Здаецца б голас чуў з Літвы?.. Ніхто не кліча![2]

Пераклады У. Жылкі і Ю. Гаўрука ў параўнанні з перакладам М. Танка 1940 г., магчыма, лепш перадаюць музычнасць верша А. Міцкевіча, але ўступаюць яму ў рытміка-інтанацыйных адносінах. У Іх парныя рыфмы «Літве — не пазаве», «аблічча — не кліча» не адпавядаюць міцкевічаўскай перакрыжаванан «zioła — woła». М. Танк як у пачатковым, так і ў заключным варыянце захаваў перакрыжаваную рыфму «недзе — едзем». А калі слова «голас» замяніў пазней словам «гук», то кампенсаваў тым самым недахоп свайго папярэдняга перакладу, узнаўляючы музычнасць міцкевічаўскага верша, захоўваючы незвычайную глыбіню думак і пачуццяў паэта.

Праўда, М. Танку пры перакладзе такога верша, як «Акерманскія стэпы», не заўсёды спадарожнічаў поспех. Эстэтычна недакладным атрымаўся пераклад, напрыклад, «І як матыль калыша кветку палявую» — «Słyszę, Kędy się motyl Kołysa na trawie». Абвостраны, вельмі напружаны слых і трывожны душэўны стан дазволілі падарожнаму пачуць нават лёгкае і бязгучнае калыханне матылька на травінцы, што перададзена надзвычай музычнай і жывапіснай паэтычнай мовай. У беларускім жа перакладзе матылёк стаў актыўным суб'ектам: ён сам «калыша кветку палявую». Палявую кветку, якая замяніла травінку, таксама нельга лічыць удалай дэталлю, бо прысутнасць палявых кветак у стэпе патрабуе вытлумачэння.

Крытычныя наракнні выклікае пераклад «Як з шорахам вуж прапаўзае недзе» — «Kędy wąż śliską piersią dotyka się zioła». Тут назіраецца вобразнае разыходжанне паміж арыгіналам і перакладам. Каб пачуць гэтыя «шор», «прап», не абавязкова валодаць звышчуткасцю. У гэтым плане, думаецца, цікавым атрымаўся пераклад У. Жылкі: «Як слізкі вуж паўзе і крыецца у змрок», Датыкаецца вуж слізкімі грудзямі не чаго-небудзь, а «zioła», г. зн. зелля, травы, нечага,

[1] Жылка Уладзімір. Вершы,— Мн., 1970, с. 127.
[2] Гаўрук Юрка. Кветкі з чужых палёў.— Мн., 1928, с. 95.

што не выдае шораху. І калі лірычны герой пачуў гэту трывожную цішыню, дык толькі пры гэтай умове ён сапраўды зможа пераканацца ў тым, што на радзіме яго ніхто не кліча.

Безумоўна, узнавіць такія шэдэўры сусветнай лірыкі сродкамі іншай мовы — задача не з лёгкіх. І ў даным выпадку, відаць, варта гаварыць нават пра іх неперакладальнасць.

У іншым рытміка-інтанацыйным ключы падаецца верш «Бура». Хвалюючае і парывістае гучанне, дакладныя і вельмі ўдалыя параўнанні, асацыяцыі, метафары: «енк насосаў», «заходзіць сонца (у А. Міцкевіча — крывавае. — А. В.), з ім апошнія надзеі», «шторм завыў», «геній смерці» ствараюць страшнае і грознае відовішча буры. І ў заключэнне — думкі пілігрыма:

Шчаслівы той, хто тут знясіліўся і паў
Ці ў гэткі час з кім развітацца мае.
*(5, 338)*

У арыгінале:

... szczęśliwy, kto siły postrada,
Albo modlić się umie, lub ma z kim się żegnać.
*(1, 262)*

Гэтыя радкі выклікаюць глыбокі роздум і значныя абагульненні. Надзвычайная жывапіснасць і музычнасць верша А. Міцкевіча адчуваюцца таксама ў перакладах санетаў «Выгляд гор са стэпаў Казлова» і «Гара Кікінеіс».

Калі параўнаць «Крымскія санеты» з папярэднімі «Баладамі і рамансамі», то можна заўважыць, што ў «Крымскіх санетах» мастацкія вобразы становяцца больш канкрэтнымі і рэальнымі. Гэтыя змяненні ў стылі паэта захаваны і ў перакладах М. Танка.

Пры перакладзе балады «Лілеі» паэт выкарыстоўвае традыцыйныя фальклорныя прыёмы і няўскладненыя сінтаксічныя канструкцыі, уласцівыя арыгіналу, што дазволіла творча перадаць ідэйна-мастацкую своеасаблівасць, музычнасць, лёгкасць і натуральнасць міцкевічаўскіх радкоў. Балада створана на аснове народнай песні. Але, як заўважыў Ю. Пшыбась: «Міцкевіч не апрацоўваў, не перабляў, не развіваў зместу народнай песні. Песня ці народнае паданне былі для паэта толькі першым штуршком фантазіі, пачатковым павевам натхнення, якія развівалі думку паэта свабодна, далека аддаляючыся ад убогай асновы песні»[1].

Цяжка пагадзіцца з асобнымі палажэннямі ў выказванні польскага крытыка. Аднак думка яго ў аснове сваёй правільная.

---

[1] Przyboś Julian. Czytając Mickiewicza, c, 48-53

Сапраўды, з песні «Stała się nam nowina, pani pana zabiła» ўзяты матыў забойства рыцара няверанай жонкай, некаторыя вобразы, а таксама асобныя радкі. У баладзе выразна адчуваюцца сінтаксічна-стылістычныя і рытмічныя асаблівасці, уласцівыя ўвогуле народнай песні. Паэт умела прымяніў іх у сваім творы:

Выпадак нечуваны —
Забіла пані пана;
Забіла і хавае
Ля ручая, ля гаю,
Лілеі там саджае,
Саджаючы, спявае:
«Расціце так высока,
Як пан ляжыць глыбока;
Як пан ляжыць глыбока,
Расціце так высока!»
*(5, 326)*

Гэтыя радкі з'яўляюцца як бы запевам да ўсяго далейшага апавядання. Сінтаксічная няўскладненасць паэтычнага радка, размоўная інтанацыя, паралелізмы і паўторы, якія так уласцівы народнай песні, музычнасць балады захаваны ў перакладзе: фальклорны паўтор «ля ручая, ля гаю», рэфрэн «як пан ляжыць глыбока; як пан ляжыць глыбока», такі просты і па-народнаму незвычайны зварот «ды бог з табой, жанчына!», трохкратнасць у апісанні — «чакаюць бацьку дзеці і дзень, другі і трэці». М. Танк данёс беларускаму чытачу і гукапіс балады:

З нажом крывавым нізка
Над ложам ён сагнецца,
І сыпле з вуснаў іскры,
І рве мае ён сэрца.
*(5, 332-333)*

Кароткія, абрывістыя вершаваныя радкі тыпу «Нябожчык? Дзе? Ваш тата?», гукаперайманне «стук, стук!» узмацняюць і нагнятаюць пачуццё страху і непазбежнасці трагічнай развязкі.

Баладзе ўласціва частае ўжыванпе такіх фразеалагічных ці апісальных спалучэнняў, як «wygnać z myśli», «па ustach śmiechu», «snu na źrenicy», «stracił życie». М. Танк замяняе іх дзеясловамі «забыць», «не смяецца»,. «не спіцца», «забіты», што ў пэўнай ступені прыдае рамантычным вобразам рэалістычныя адценні.

Для балады характэрна поўная, багатая рыфма: to ja to — tato, trudno — nudno, grzechu — śmiechu. М. Танк часта выяўляе прыхільнасць як у арыгінальнай творчасці (асабліва сённяшняй), так і ў

перакладной да рыфмы прыблізнай, недакладнай: можа — трывожна, сэрцы — смяецца, манастыр — густы, вецер — здаецца і інш. У перакладзе, як і ў арыгінале, ужыты жаночыя і мужчынскія рыфмы. Міцкевічаўскі сяміскладовік з яго асобнымі адхіленнямі перададзены трохстопным ямбам, што стварае рытміка-інтанацыйны малюнак, блізкі да арыгінала.

Пераклад балады «Лілеі» пазбаўлены апісальнасці, агульных мясцін. Знойдзены ўдалыя лексічныя і вобразныя эквіваленты, лёгкі, свабодны верш. Глыбока перададзены ўнутраны драматызм твора, захаваны каларыт арыгінала, цудоўна ўзноўлены вобразы, матывы і асаблівасці міцкевічаўскага верша.

Прывабіла М. Танка і паэма А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Падзеі, апісаныя ў ёй, адбываюцца на тэрыторыі Беларусі. «Пан Тадэвуш» тыпалагічна блізкі «Новай зямлі» Я. Коласа. Блізкасць іх не столькі ў тым, што там апісваецца адзін і той жа край, але перш за ўсё ў тым, што гэтыя высокамастацкія творы сталі своеасаблівымі энцыклапедыямі жыцця сваіх народаў. У паэме А. Міцкевіча побач з апісаннем жыцця польска-беларускай ваколічнай шляхты дадзены цудоўныя карціны беларускай прыроды. Адну з гэтых карцін, апісанне «матэчніка», цяжкадаступных нетраў беларускай пушчы, пераклаў на беларускую мову М. Танк.

Можна знайсці таксама блізкасць паміж «Панам Тадэвушам» А. Міцкевіча і «Нараччу» М. Танка. Абодвум творам уласцівы не толькі высокамастацкія апісанні прыроды, але і своеасаблівае спалучэнне ў іх эпічнага, лірычнага і драматычнага пачаткаў, любоў да сваёй зямлі, свайго народа. Думаецца, што гэта таксама садзейнічала поспеху перакладчыка.

М. Танк перадаў эпічнае гучанне ўрыўка з паэмы «Пан Тадэвуш», ён улавіў таксама светлы гумар, мяккі лірызм, якія адчуваюцца ў апісанні «звяроў і птушак царства, зелені сталіцы». Лагодную усмешку выклікае сцвярджэнне А. Міцкевіча пра глыбіню балотных азёр, аб якіх «мо не дарма гавораць, што жывуць там чэрці». Натуральна і вельмі блізка да арыгінала передае М. Танк апісанне гэтых азёр.

Вада іржавая ў тых студнях шкліцца мутна,
З глыбі дыміць смурод удушлівы, атрутны
І ад яго губляюць дрэвы лісце, колер;
Трухлявыя, з карой падточанай і хворай,
Схіліўшы нізка вецце, звітае імхамі,
І горбячы ствалы, пакрытыя грыбамі.

Сядзяць каля вады, як нейкія пачвары
Ля сагана свайго, ў якім тут трупа варацць.[1]

Да гэтага ўрыўка з поўным правам можна аднесці словы М. Ф. Рыльскага, аўтара высокамастацкага перакладу паэмы на ўкраінскую мову: «Міцкевічаўскія апісанні — прыроды, касцюмаў, абставін дзеяння і г. д.— уражваюць раскошным багаццем фарбаў, але ім уласціва пры гэтым натуральнасць і перакананаўчасць... Міцкевіч спалучае самыя разнастайныя таны, не баючыся ўпасці ў дысгармонію, як не баіцца гэтага сама прырода, якая ставіць іншы раз побач зусім «супрацьпаказаныя» эстэтыкай колеры і дасягае тым самым нечаканых і прыемных для вока эфектаў»[2].

Класічны міцкевічаўскі 13-складовік М. Танк перадаў шасцістопным ямбам, захоўваючы велічнае гучанне твора і яго рытміка-інтанацыйную блізкасць да арыгінала. Урывак уяўляецца рытмічна цэласным і кампазіцыйна завершаным творам.

Па-майстэрску пераклаў М. Танк паэму А. Міцкевіча «Фарыс». Ён узнавіў зменлівы і дынамічны рытм верша, яго алегорыі, маштабныя вобразы, метафарычнасць, жывапіс словам і надзвычайную дакладнасць у дэталях. Добра перададзена вельмі напружаная і экспрэсіўная ецэна бітвы героя паэмы з ураганам пустыні, у якой услаўляецца мужнасць, смеласць і сіла чалавека. Веліч чалавека, які перамог, трыумф яго волі раскрыты ў наступных радках:

Як радасна ўдаль углядацца вачам!
Сёння бачыць маё вока
Так далёка! Так шырока!
Бачыць нават, што закрыла
Сінява за небасхілам.

Як радасна вольным раскрытым рукам!
Я іх працягнуў, каб абняць свет бясконцы
Ад самага ўсходу да захаду сонца.
*(5, 346)*

Бязмежная сіла творчасці, сіла чалавечай асобы раскрываецца таксама ў так званай «вялікай» імправізацыі з трэцяй часткі «Дзядоў». Прызнанне Конрада «мая любоў не на адным спачыла чалавеку» роднасна адчуваннем героя «Фарыса», калі той хоча «абняць свет бясконцы».

---

1 МіцкевічАдам. Выбраныя творы, с. 249.
2 Рыльский Максим. Поэзия Адама Мицкевича.— М., 1956, с. 75.

У героях польскай рамантычнай паэзіі М. Танку імпануе іх бунтарства і тыранаборства. Яму, рэвалюцыйнаму паэту, яшчэ ў 30-я гады блізкімі былі рамантычны пратэст і актыўнае дзеянне героя «Фарыса». Таму, відаць, ёсць пэўная заканамернасць у перакладах М. Танка з творчасці А. Міцкевіча, калі побач з «Фарысам» мы знаходзім пераклад урыўка «Не дбаю, якое праклящце» з паэмы «Дзяды». У адной з галоўных мясцін паэмы «Дзяды», у так званай «вялікай» імправізацыі, думка паэта дасягае значных духоўных вяршынь, а ў песні Фелікса Кулакоўскага яна вяртаецца да палітычных падзей таго часу, становіцца канкрэтнай, што мы знаходзім і ў перакладзе М. Танка:

Не дбаю, якое праклящце
Спадзе — ці Сібір, ці кайданы,—
Заўсёды, як верны падданы,
Гатоў на цара працаваць я.
Я думаю ў шахце падземнай,

Узрываючы глыбы цяжкія:
З руды маёй зробяць, напэўна,
Сякеру на царскую шыю.

*(5, 346-347)*

У арыгінале:

Nie dbam, jaka spadnie kara,
Mina, Sybir czy kajdany.
Zawsze ja, wierny poddany,
Pracować będę dla cara.

W minach kruszec kując młotem,
Pomyślę: ta mina szara,
To żelazo,— z niego potem
Zrobi ktoś topór na cara.

*(3, 153)*

Слова «цар» у вуснах свабодалюбівай польскай моладзі было напоўнена самым канкрэтным тыранічным зместам. Зняволеныя філарэты гаварылі пра барацьбу з царызмам недвухсэнсава.

М. Танк замяніў апорныя і такія важкія міцкевічаўскія рыфмы «kara — cara» на «праклящце — працаваць я», «цяжкія — шыю», што ў пэўнай ступені расслабіла паэтычны радок. Безумоўна, ад гэтага пераклад нешта страціў у параўнанні з арыгіналам. Але адначасова ён набыў таксама свае, адметныя рысы.

М. Танкам перакладзены імклівы і жывы верш «Хор стральцоў»:

Гэй, ветры, нясіце

Гром стрэлаў да хмар!..
Ідзе паляўнічы —
Ваш друг і ўладар...
Далей жа па сцежках-дарогах, далей,
Па следзе за зверам хутчэй!
*(5, 348)*

Думаецца, апраўданай з'яўляецца замена міцкевічаўскага «król wiatrów i chmur» на «ваш друг і ўладар». Не парушыўшы вобраза, М. Танк прыдаў вершу крыху іншае адценне.

Паэт пераклаў на беларускую мову і вядомую лірычную мініяцюру «Паліліся мае слёзы...»:

Паліліся мае слёзы, як дождж чысты і краплісты,
На маленства, што было анельскім, сельскім,
На юнацтва час мой шумны, неразумны,
А таксама на век сталы, век няўдалы:
Паліліся мае слёзы, як дождж чысты і краплісты...
*(5, 349)*

У арыгінале:

Polały się łzy me czyste, rzęsiste,
Na me dzieciństwo sielskie, anielskie,
Na moją młodość górną i durną,
Na mój wiek męski, wiek klęski;
Polały się łzy me czyste, rzęsiste...
*(1, 417)*

Верш быў напісаны А. Міцкевічам у канцы 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Ён сугучны створаным у той час такім лірычным творам паэта, як «Калі мой труп», «Над воднай прасторай чыстай». Максім Танк перадаў смутак, журбу, адчай і адначасова цяжкі міцкевічаўскі сум. Аднак музычнасці верша ў дастатковай ступені перакладчыку не ўдалося захаваць.

Параўнальныя звароты «як дождж», «што было» ствараюць у перакладзе расцягнутыя free вершаваныя радкі, страчваецца таксама эмацыянальны напал паўтораў «na me», «na moją», «na mój». Праўда, «як дождж чысты і краплісты» — удалы адпаведнік «czyste, rzęsiste». Дакладныя і выразныя ў перакладзе эпітэты, якімі карыстаецца польскі паэт пры вызначэнні свайго дзяцінства, юнацтва і сталага ўзросту.

Шэдэўрам перакладчыцкага майстэрства М. Танка з'яўляецца верш «Да М...» («Прэч з маіх воч!..»). Ён узнік пад уплывам моцнага і трагічнага кахання польскага паэта да Марылі Верашчака (Марыля выйшла замуж за графа Путкамера). Памяць пра сваё першае і

моцнае каханне А. Міцкевіч пранёс праз ўсё жыццё. Для яго каханне да Марылі было як край дзяцінства, як радзіма, пра якія ў выгнанні паэт успамінаў:

Kraj lat dziecinnych!
On zawsze zostanie
Święty i czysty,
jak pierwsze kochanie.

*(4, 381)*

Некалі Кузьма Чорны сказаў, што радзіма пачынаецца там, дзе прайшло маленства. Для А. Міцкевіча радзіма пачалася там, дзе ён правёў дзіцячыя і юнацкія гады, дзе прыняў удзел у руху філаматаў і дзе страціў сваё першае каханне, даверлівае і крыштальна чыстае.

Гэты верш глыбока чалавечны. Ён блізкі пушкінскаму «Я вас кахаў». Такія творы ўспрымаюцца хутчэй душой, чым розумам. Напісаны ў 1823 г., у перыяд росквіту духоўных і творчых сіл паэта, верш у нейкай ступені родnative «Баладам і рамансам». Гэты перыяд творчай біяграфіі А. Міцкевіча знамянальны і тым, што пасля настаўнічання ў абывацельскім Коўне паэт прыехаў у Вільню, дзе зноў сустрэўся з многімі сваімі філамацкімі сябрамі. Гэта быў час, калі ў значнай ступені пад уплывам Ф. Шылера ён напісаў: «Май сэрца і глядзі ў сэрца». І, нарэшце, гэта быў час, калі ён страціў Марылю:

«Прэч з маіх воч!..» — І я знікну без следу.
«Прэч з майго сэрца!» — І сэрца скарыцца.
«Прэч з маёй памяці!» — З гэтым, ты ведай,
Век наша памяць не зможа згадзіцца.

*(5, 339)*

Выяўленчае багацце беларускай мовы дазволіла М. Танку надзвычай дакладна перадаць тонкія і глыбокія душэўныя перажыванні польскага паэта. Перакладчык захаваў шчырасць і прастату верша, яго значную абагульненасць. Тут няма рамантычнай прыўзнятасці і напышлівасці. Звычайнымі словамі і так проста гаворыцца пра каханне. І адначасова яно ўздымаецца на незвычайную вышыню:

Там, дзе страчаліся шчаснай парою,
Дзе расставаліся сумнай хвілінай,
Буду заўжды неразлучным з табою,
Бо ўсюды частку душы я пакінуў.

*(5, 341)*

Багатая і разнастайная творчасць А. Міцкевіча прасякнута глыбокім лірызмам. Ад пачатку да канца лірычны «Эпілог» да «Пана Тадэвуша». У ім паэт як бы падводзіць вынікі сваёй шматгадовай

творчай дзейнасці, выяўляе народнасць сваёй паэзіі, выказвае вялікую мару свайго жыцця:

О, мне дажыць бы да гэткай уцехі,
Каб мае трапілі кнігі пад стрэхі,
Каб, за кудзеляй сялянкі прысеўшы,
Песні любімыя даўнія спеўшы
Пра сіраціну-красуню, якая
Вечарам гнала птушыную стаю,
І пра дзяўчыну, што скрыпку любіла
Ды за ігрою свой статак згубіла,—
Каб і мае ўзялі кнігі сялянкі,
Простыя кнігі, як іх калыханкі.

*(5, 349)*

Дзякуючы высокамастацкім перакладам М. Танка творы польскага паэта і на беларускай мове жывуць сваім паўнакроўным жыццём. Беларускі паэт свабодна валодае сістэмай рамантычнай вобразнасці. Звяртаючыся да першакрыніц народнай мовы, ён уваскрашае фальклорную аснову рамантызму, творча ўзнаўляе мастацкую рэчаіснасць арыгінала.

## МАКСІМ ТАНК — ПЕРАКЛАДЧЫК ПАЭМЫ ЮЛЬЮША СЛАВАЦКАГА «У ШВЕЙЦАРЫІ»

Пераклады твораў Ю. Славацкага не маюць у беларускай літаратуры такой багатай гісторыі, як пераклады з А. Міцкевіча. У 1959 г. да 150-годдзя з дня нараджэння польскага паэта выйшаў на беларускай мове зборнік «Выбранае», куды былі ўключаны некаторыя яго вершы ў перакладах У. Дубоўкі, Я. Семяжона, П. Пестрака, К. Паўтаржыцкага, а таксама паэмы «У Швейцарыі» (пераклад М. Танка), «Бацька зачумленых» (пераклад С. Дзяргая), «Ян Бялецкі» (пераклад П. Макаля і А. Вольскага), «Шанфары» (пераклад К. Паўтаржыцкага), трагедыя «Мазепа» ў перакладзе М. Лужаніна і А. Звонака. Пераклады ў цэлым выкананы на высокім узроўні. Яны даюць беларускаму чытачу выразнае ўяўленне аб глыбіні і багацці паэтычнага таленту Ю. Славацкага.

Паэма «У Швейцарыі» — адзіны пераклад М. Танка з выдатнай спадчыны Ю. Славацкага. Напісана яна ў другой палавіне 30-х гадоў XIX ст. Гэта быў час, калі польскі паэт стварыў самыя значныя і дасканалыя ў ідэйных і мастацкіх адносінах творы — паэму «Бацька зачумленых», «Паэму Пяста Дантышка гербу Леліва пра пекла», вершы

«Гімн» («Сумна мне, божа...»), «Размова з пірамідамі», «Мой тастамант» і інш.

Паэма «У Швейцарыі» — адзін з шэдэўраў не толькі польскай, але і сусветнай літаратуры. У значнай ступені гэты твор аўтабіяграфічны. Увесь ён прасякнуты рамантыкай першага кахання, трагізмам незваротных страт. Прырода, навакольнае асяроддзе з'яўляюцца ў паэме фонам для асноўнага апавядання. У пачатковых фрагментах даюцца геаграфічна акрэсленыя і канкрэтна названыя элементы швейцарскага пейзажу: Аар (Фрагмент II), Рона (III), возера (IV), каплічка Тэля (V і VI), ледзяны грот (VII), Юнгфрау (VIII). У сярэдняй і заключнай частках паэмы гэтыя элементы ствараюць як бы адзін нейкі сінтэтычны краявід.

У перакладзе М. Танка, як і ў арыгінале, ствараюцца не рэалістычныя карціны прыроды, а хутчэй яе абагульненыя рамантычныя вобразы. Прыродаапісанні часам нагадваюць тагачасныя сентыментальныя пейзажы, узорам для якіх паслужыў французскі ідылічны і пастаральны жывапіс XVIII ст.

Ідылічна-рамантычная афарбоўка пейзажу падкрэсліваецца адпаведным падборам элементаў і дэталей. Напрыклад, словы «грот», «каскад», «лавіна» і інш. надаюць паэме ўзвышанае, урачыстае гучанне. М. Танк у сваім перакладзе пакідае гэтыя словы, захоўваючы тым самым вобразна-стылістычныя і экспрэсіўныя асаблівасці паэмы Ю. Славацкага. У беларускай мове кніжныя запазычанні рэзка вылучаюцца, дзякуючы чаму ствараецца лексічная і стылістычная адпаведнасць паміж арыгіналам і перакладам.

Паэме ўласцівы некаторыя адзнакі польскіх ідылій (напісанне любімага імя на пяску, чытанне сентыментальных твораў, наведванне мудрага пустэльніка, які вырашае канфлікты), што надае ёй пэўную стылявую афарбоўку. Таму мае рацыю польскі даследчык Я. Мацяеўскі, які піша, што «гэты твор трэба хутчэй за ўсё трактаваць як даследаванне над тэмай «сентыментальна-рамантычнае каханне»[1].

Паэма «У Швейдарыі» — гэта, па сутнасці, гімн каханню. Як лірычны запеў гучаць пачатковыя радкі («Яна, як мара, знікла залатая»), якія надаюць усяму далейшаму апавяданню характар трагедыйнасці, што, нібы жалобны вэлюм, ахінае ідылічную гісторыю кахання. Тым не менш успаміны аб гэтым каханні прасякнуты невыказнай радасцю. Вось як апісваецца першая сустрэча юнака з дзяўчынай:

Tam ją ujrzałem! i wnet rozkochany,

---

[1] Maciejewski Jarosław. Florenckie poematy Słowackiego.— Wrocław, 1974, s. 116.

Że z tęczy wyszła i z potoku piany,
Wierzyć zacząłem i wierzę do końca;
Tak jasną była od promieni słońca!
Tak pełna w sobie anielskiego świtu!
Tak rozwidniona zrennicą z błękitu![1]

У перакладзе М. Танка:

Тут я яе сустрэў аднойчы рана,
Нібы з вясёлкі яркай, з пены белай
Яна з'явілася неспадзявана.
Здаецца, ў сонцы ўся яна гарэла.
Здаецца, ўся яна была абвіта
Святлом анёльскім і нябёс блакітам.
*(5, 350-351)*

Закаханы юнак абагаўляе дзяўчыну. Дзякуючы яго празмернай экзальтацыі і звышпачуццёвасці каханая становіцца «нябесным анёлам», поўная «анёльскага світання». Што каханая такая, ён пачаў верыць і будзе верыць да канда. Пра смерць яе сказана: паляцела да анёлаў у паднябессе. М. Танк у перакладзе захаваў вобразную характарыстыку дзяўчыны. Праўда, часам словы «анёл», «анёльскі», якія ў арыгінале часта паўтараюцца, замяняе апісальнымі словазлучэннямі тыпу «пасланец, прадвеснік божы», або перадае «czy mnie anieli do nieba zabiorą» — «ці я ўзлятаю ў неба па-над светам» і інш. Мадэрнізуючы асобныя вобразы і дэталі паэмы, перакладчык, аднак, захоўвае яе асноўную лірыка-драматычную танальнасць і гуманістычны пафас.

Вобраз дзяўчыны ў паэме ідэалізаваны, але ён і зямны, рэальны. На нашу думку, гэты вобраз у нечым блізкі і роднасны ідэальна прыгожым і духоўна багатым гераіням вершаў М. Танка «Ave Maria» і «Готыка «Святой Анны». У паэме Ю. Славацкага і ў названых вершах М. Танка гучыць бязмежнае захапленне і зачараванне жыццём, услаўляецца велічнае і прыгожае ў чалавеку. Разам з тым у творах абодвух паэтаў любоў і радасць спалучаюцца з болем, горыччу і глыбокім душэўным сумам.

М. Танк надзвычай уважліва ставіцца да інструментоўкі верша, яго агульнай танальнасці. Так, у шостым фрагменце дакладна перададзены мажорны настрой лірычнага героя паэмы:

Ах, жартаўніца-хваля! Вусны мілай
Яна з маімі вуснамі злучыла,
Хоць толькі сэрцы мы злучыць паспелі.

---

[1] Słowacki Juliusz. Utwory wybrane.— Warszawa, 1969, t. 1, c. 126.

Яна ў праменнях сонечных гарэла.
Нас акружыла серабрыстым колам,
Змяшала, быдцам постаці анёлаў.
*(5, 354)*

У арыгінале:

Ach! fala taka szalona i pusta!
Że połączyła nawet nasze usta,
Choć sercem tylko byliśmy złączeni,
Fala tak pełna ruchu i promieni,
Ze jednym światła objąwszy nas kołem,
Zmięszala niby anioła z aniołem.[1]

У гэтай замалёўцы, як і ў шматлікіх іншых, яскрава выяўляецца сувязь суб'ектыўнага і аб'ектыўнага, калі пейзаж адухаўляецца, перадаецца праз пачуцці і думкі лірычнага героя, душэўны стан якога прадвызначае і само ўспрыманне навакольнага асяроддзя.

У перакладзе, як і ў арыгінале, адчуваецца незвычайная меладычнасць, музычнасць і выразнасць верша. Запаволены рытм, важкія на сэнсу рыфмы, унутраныя паўторы, алітэрацыя, пранікнёны лірычны зачын выяўляюць перажыванні закаханага сэрца.

У сёмым фрагменце перакладчык па-майстэрску выкарыстаў выяўленчыя магчымасці прасодыі беларускай мовы:

Ёсць прад усходам месяца хвіліна,
Калі ў дуброве салаўі змаўкаюць
І нават шэпат лісця замірае,
Ледзь дыхаюць у травах ручаіны,
Нібыта зорка ў час маўклівы гэты
Збіраецца пагаварыць са светам.
*(5, 360)*

У арыгінале:

Jest chwila, gdy się ma księżyc pokazać,
Kiedy się wszystkie słowiki uciszą
I wszystkie liście bez szelestu wiszą,
I ciszej źródła po murawach dyszą;
Jakby ta gwiazda miała coś nakazać,
I o czym cichym pomówić ze światem...[2]

Аднак гукапіс для перакладчыка не стаў самамэтай. Разам з іншымі мастацкімі сродкамі ён паглыбляе ўспрыманне прыроды, выяўляючы пачуцці і перажыванні лірычнага героя.

---

[1] Słowacki Julius z. Utwory wybrane, t. 1, c. 129.
[2] Słowacki Julius z. Utwory wybrane, t. 1, c. 135.

У перакладзе назіраецца пэўны ўплыў уласнага творчага стылю беларускага паэта. Так, першы радок прыведзенага ўрыўка сваім гучаннем і танальнасцю тыпалагічна блізкі танкаўскаму ўрыўку «Ёсць напрадвесні чароўныя раніцы» з паэмы «Нарач». Магчыма, у даным выпадку можна гаварыць пра ўплыў арыгінальнай творчасці М. Танка на пераклад. Другі радок перакладчык у нейкай ступені спрасціў, «прызямліў». У Ю. Славацкага салаўі ўвогуле змаўкаюць. У перакладзе яны змаўкаюць у дуброве. Трэці і чацвёрты радкі перакладу па сваёй эмацыянальна-вобразнай сіле — на ўзроўні арыгінала. Пераклад заключных радкоў — таксама бясспрэчная творчая ўдача перакладчыка. Вартасць і каштоўнасць іх можна параўнаць з цудоўным перакладам А. Куляшова вядомых радкоў М. Лермантава «И звезда с звездою говорит»: «Зорка зорцы голас падае».

У перакладзе М. Танка паэма гучыць запаволена, урачыста, з адценнем элегічнасці і суму. Беларускі перакладчык захаваў экспрэсіўны лад паэмы, даволі дакладна ўзнавіў яе лірыка-філасофскую змястоўнасць, элегічную танальнасць. Ён перадаў ідэальнае, рамантычнае ўяўленне пра прыгажосць, пра гармонію прыроды і чалавека ўсім вобразным ладам, які адпавядае паэтыцы Ю. Славацкага. Праўда, М. Танк часцей, чым Ю. Славацкі, ужывае рытмічныя пераносы, асанансную рыфмоўку (белай — гарэла, сілай — крылах, блакіце — бліскавіца, сінім — вышыні). Гэта пэўным чынам уплывае на якасць перакладу, паслабляе яго музычную аснову. Сілабічны 11-складовік М. Танк перадае пяцістопным ямбам, захоўваючы тым самым рытмічную блізкасць паміж арыгіналам і перакладам.

У перакладзе М. Танка адсутнічаюць клічныя формы, радзей ужываюцца выклічнікі «ах», «о», што ў пэўнай ступені зніжае рамантычны стыль паэмы, яна набывае ў значнай ступені размоўную, апавядальную інтанацыю. У беларускай мове меншы выбар слоў так званага высокага стылю. Таму перакладчык звяртаецца да выяўленчых сродкаў народнай творчасці, дзе знаходзіць дакладныя і трапныя адпаведнікі: позірк-бліскавіца, плач-рыданне, крэсліць-піша, ружы-кветкі, што надаюць вершу задуменна-песенную танальнасць і лірызм.

М. Танк перадаў разнастайнасць і вобразнае багацце верша Ю. Славацкага, захаваў рамантычны пафас твора. У перакладзе адчуваецца пэўны ўплыў уласнай творчай практыкі паэта, што прывяло да «прыземленасці» асобных рамантычных вобразаў Ю. Славацкага, да частых рытмічных пераносаў і размоўнай інтанацыі. Перакладчык плённа выкарыстаў вобразна-выяўленчае багацце беларускага фальклору. У паэме дадзены цудоўныя карціны альпійскай прыроды,

паказана ўзвышанае чыстае каханне, раскрыты пранікнёны сум закаханага сэрца. М. Танк узнавіў дух арыгінала, захаваў ідэйную задуму аўтара — і ў гэтым каштоўнасць яго перакладу.

## МАКСІМ ТАНК — ПЕРАКЛАДЧЫК ПОЛЬСКАЙ ПАЭЗІІ XX СТАГОДДЗЯ

Творчы дыяпазон перакладаў М. Танка з польскай паэзіі XX ст. вельмі шырокі: Л. Стаф, Ю. Тувім, У. Бранеўскі, К. І. Галчынскі, М. Паўлікоўская-Яснажэўская, А. Сланімскі, Я. Лехань, С. Р. Дабравольскі, В. Слабоднік, Л. Пастарнак, С. Пентак, Т. Ружэвіч і інш. Беларускі перакладчык стварае своеасаблівую анталогію польскай паэзіі XX ст.

Прыкметны след у польскай паэзіі гэтага часу пакінуў Л. Стаф. Яго паэзія была паэзіяй няспынных пошукаў, пастаяннага імкнення да дасканаласці. У перыяд міжваеннага дваццацігоддзя Л. Стаф быў адным з прызнаных паэтаў у Польшчы. Ён вельмі любіў прыроду.

Шмат вершаў прысвяціў паэт восені - сваёй любімай пары года.

М. Танк яшчэ ў 30-я гады добра ведаў паэзію Л. Стафа. Напрыклад, пад імжысты асенні дождж яму ўспомніліся радкі з верша польскага паэта «Асенні дождж»:

У шыбы дождж звоніць,
дождж звоніць асенні...

*(6, 171)*

Верш «Асенні дождж» прасякнуты болем, агульным настроем прыгнечанасці і глухой журбы. Манатонны стафаўскі «асенні» рэфрэн, які ўспомніўся беларускаму паэту, сведчыць пра глыбокае засваенне М. Танкам польскай паэзіі. Прывёўшы гэтыя радкі Л. Стафа ў сваім дзённіку, ён пісаў: «Па памяці пачаў перакладаць гэты верш. Трэба будзе падумаць над вершам «Начная сяўба». Сюжэт — ад майго дзеда, які мне калісьці расказваў, як ён вайной сеяў жыта. Толькі не знаю, ці ўдасца мне пра гэта напісаць так, як хацелася б. Часамі гісторыя нараджэння таго ці іншага твора бывае цікавейшая за сам твор» (6, 171). Паэт мог бы паспяхова выкарыстаць у даным выпадку рытміку, строфіку ці нават саму танальнасць верша Л. Стафа. Яму дастаткова было пэўнага штуршка, творчага імпульсу для таго, каб мастацкія вобразы набылі сваю завершанасць.

Перакладзеныя М. Танкам вершы Л. Стафа «Вясна», «Адзін я, сяброў пахаваўшы», «Маці» («У змроку ля акна») і «Міцкевіч» былі напісаны польскім паэтам у пасляваенныя гады, калі ў яго паэзіі намеціўся

новы паэтычны ўзлёт. Лірыка Л. Стафа апошніх гадоў жыцця стала спакойнай, напоўненай філасофскім роздумам.

На схіле сваіх гадоў Л. Стаф напісаў верш «Адзін я, сяброў пахаваўшы», дзе ўдумліва і сур'ёзна падвёў вынікі свайго жыцця:

Zostanie po mnie pusly pokój
I małomówna, cicha sława.[1]

У перакладзе М. Танка:

Па мне кут пусты застанецца
Ды сціплая, ціхая слава.
*(5, 366)*

Перакладчык пайшоў па шляху амаль даслоўнага ўзнаўлення лексікі і вобразнага малюнка арыгінала. Ён знайшоў удалы адпаведнік стафаўскаму «пусты пакой». Выраз «кут пусты» нясе вельмі глыбокі і разнастайны сэнс, які сваю радаслоўную вядзе, відаць, з коласаўскага зачыну ў «Новай зямлі» — «Мой родны кут, як ты мне мілы!..» Для беларускага чытача ён напоўнены значным падтэкстам.

Аднак у перакладзе перадапошні радок вымаўляецца як бы паспешліва, у ім аслаблена інтанацыйнае выдзяленне стрыжнявых слоў «застанецца» і «пусты» (пакой). Дакладная рыфма «brawa — sława» перададзена прыблізна — «свеце — застанецца». Праўда, у перакладзе аслабленую музычнасць арыгінала кампенсуе ўмелае выкарыстанне інтанацыйных сродкаў. Чатырохстопны ямб перададзены трохстопным амфібрахіем, што дазволіла захаваць плаўнае, крыху напеўнае і мінорнае гучанне верша.

З глыбокай лірычнай страсцю і пранікнёным пафасам пераклаў М. Танк цудоўны верш Л. Стафа «Міцкевіч»:

Не ў сілах бронза нежывая
Нам перадаць ні сум вялікі,
Ні як ён жыў здалёк ад краю,
Калі яго ніхто не клікаў.

У арыгінале:

Skrzepły spiżowym swym bezruchem
Pomnik wyrazić go nie zdoła,
Jak cierpiał, żyt w pustkowiu głuchem,
Co milczy: Jedźmy, nikt nie woła!

У апошнім радку гэтай страфы Л. Стаф прыводзіць словы з заключнага радка санета А. Міцкевіча «Акерманскія стэпы». Аднак перакладчык не ідзе тут шляхам даслоўнага ўзнаўлення арыгінала.

---

[1] Staff Leopold. Poezje zebrane.— Warszawa, 1967, I. 2, c. 969.

Апісальны выраз «калі яго ніхто не клікаў» вельмі арганічна ўплятаецца ў мастацкую тканіну твора.

Верш Л. Стафа ў перакладзе М. Танка чытаецца на адным дыханні:

Калі захочаш ты па вершах
Яго знайсці, пакінь надзею,
Не знойдзеш ні ў баладах першых
І ні ў апошняй эпапеі,
Ні там, дзе ў вадзяных глыбінях
Цямнеюць грэбні скал Лазанскіх:
Ні там, дзе думаў пра айчыну,
Дзе рваўся з чараў шарлатанскіх.

Верш, як горная лавіна, набірае сілу, каб прагучаць заключным акордам моцна і пранікнёна:

Жыве ён з анямелым смуткам
І з чэрствым пілігрыма горам
Паміж спакойным Навагрудкам
І цёмным штармавым Басфорам.
*(5, 307)*

У арыгінале:

On cały jest z swym niemym smutkiem,
Ze swym pielgrzymim, twardym bolem
Pomiędzy szarym Nowogródkiem
I czarnym Konstantynopolem.[1]

А. Міцкевіч паўстае тут як «чалавек вялікага трагічнага лёсу і высокага патрыятычнага подзвігу»[2]. Есць выраз «светлы сум Пушкіна». Пра Міцкевіча можна сказаць, што ў яго сум трагічны. М. Танк знаходзіць вельмі ўдалыя і дакладныя лексічныя і вобразныя эквіваленты. Л. Стаф піша «нямы смутак», у перакладзе «анямелы смутак», па-народнаму проста і трапна, усё роўна як «скамянелы», «закачанелы» і г. д. Стафаўскае «pielgrzymim, twardym bolem» М. Танк перадае «чэрствым пілігрыма горам». Чэрствым можа быць хлеб, чалавек, у М. Танка гэты эпітэт набывае яшчэ адно значэнне. У выніку ствараецца вельмі шматгранны, насычаны і глыбокі вобраз. У Л. Стафа «шэры Навагрудак» гучыць як «закінуты», «глухі» і г. д. М. Танк знайшоў сваё і вельмі добрае вызначэнне «спакойны». Апраўданай з'яўляецца дзеля захавання рыфмы замена «чорным Канстанцінопалем» на «цёмным штармавым Басфорам». Тут не парушаецца сэнс

---

[1] Staff Leopold. Poezje zebrane, t. 2, c. 940.
[2] Рыльскнй Максим. Поэзия Адама Мицкевича, с. 85.

верша, хоць ён і набывае крыху іншае адценне. М. Танк па-майстэрску выкарыстоўвае у перакладзе алітэрацыю і асананс, знаходзіць удалыя рыфмы.

З паэтычнай спадчыны Ю. Тувіма М. Танк пераклаў вельмі самотны верш «Невядомае дрэва». а таксама пранікнёны і хвалюючы ўрывак з паэмы «Кветкі Польшчы» пад назвай «Малітва».

Лірыка Ю. Тувіма характарызуецца рытмічнай разнастайнасцю, арыгінальнай вобразнасцю і лексічным багаццем. Паэт сцвярджаў, што рыфму ў вершы ствараюць не літары, а гукі, пры гэтым спасылаўся на думку Ц. Норвіда, што рыфма не ў канцы, а ў сярэдзіме радка, як зоркі, не там, дзе яны свецяць. Пацвярджэннем такой думкі абодвух паэтаў можа служыць пераклад названага верша, дзе М. Танк удала выкарыстаў мастацкія і выяўленчыя магчымасці прыблізнай рыфмоўкі і гукапісу:

Ходзіць у смутку борам, гарою,
Усё не знаходзіць дрэва свайго ён.
*(5, 372)*

У арыгінале:

Błądzi strapiony po czarnym borze,
Drzewa swojego znaleźć nie może.[1]

Беражліва захоўваючы ідэі і вобразы верша, перакладчык знаходзіць удалы эквівалент: борам, гарою — po czarnym borze. Фальклорны паўтор прыдае вершу апавядальную, напеўную інтанацыю. Пры гэтым не страчваецца эмацыянальная і сэнсавая напоўненасць арыгінала, хоць крыху парушаецца яго рытмічная структура.

Па сіле паэтычнай выразнасці і мастацкай дасканаласці ўрывак з паэмы «Кветкі Польшчы» («Малітва»), відаць, самы значны ў гэтым творы. Знаходзячыся на чужыне, польскі паэт шле слова-кліч, слова-плач прыгнечанай польскай зямлі, зняволенаму польскаму народу. Пранікнёна, з незвычайным грамадзянскім пафасам гучаць наступныя радкі:

Вярні нам хлеб з палёў радзімы,
Вярні нам труны з польскіх сосен.
*(5, 381)*

Тут вельмі дакладна ўзноўлены арыгінал:

Przywróć nam chleb z polskiego pola.
Przywróć nam trumny z polskiej sosny.[2]

---

[1] Tuwim Julian. Dzieła.— Warszawa, 1955, t. 1, cz. 1. c. 301.
[2] Tuwim Julian. Dzieła, t. 2, c. 106.

«Малітва» Ю. Тувіма карысталася вялікай папулярнасцю ў акупіраванай Польшчы. Яна стала маніфестам барацьбы патрыётаў, напаўняла іх верай у лепшае заўтра. Сіла гэтага ўрыўка ў глыбокім смутку паэта, які любіць сваю родную зямлю, у адчуванні трагедыі, што здарылася з Польшчай. У «Амерыканскім блакноце» Ю. Тувім пісаў: «Палітыка не з'яўляецца маёй прафесіяй, яна функцыя майго сумлення і тэмпераменту»[1]. Як глыбокае патрыятычнае прызнанне і наказ гучаць наступныя радкі з «Малітвы»:

Няхай вялікай будзе Польшча
Для ўсіх сыноў яе найлепшых!
Дай веліч сэрц, як будзе большай,
Дай веліч сэрц, як будзе меншай.
Нам, між краінаю Свабоды
І чорным логавам тэўтонаў,
Граніцу дружбы дай з Усходу,
І прорву з Захаду, бяздонне.

*(5, 381)*

Мае рацыю М. Жываў, які адзначае, што паэма «Кветкі Польшчы» з'яўляецца тым творам, у які Ю. Тувім «уклаў увесь свой жыццёвы і творчы вопыт, ...выявіў глыбока хваляваўшыя яго ў гады вайны думкі пра лёс свайго народа, пра месца паэта ў барацьбе за свабоду і незалежнасць, пра яго абавязкі і задачы»[2].

Відаць, не выпадковай з'яўляецца цікавасць М. Танка да перакладаў асобных урыўкаў з такіх буйных эпічных твораў, як «Пан Тадэвуш» і трэцяя частка «Дзядоў» А. Міцкевіча, «Усеагульная песня» П. Нэруды і «Кветкі Польшчы» Ю. Тувіма. Тым самым ён працягвае, праўда ужо ў перакладах, эпічную лінію ў сваёй творчасці.

Буйным творам названых паэтаў і паэмам М. Танка ўласцівы размах і шырыня эпічнага апавядання. У іх праз лёс і лірычныя перажыванні герояў раскрываецца гістарычны лёс нацыі і народа. М. Танк перакладае ўрыўкі з самых значных твораў сусветнай літаратуры. Гэта — адказная і цяжкая задача, але паэт бярэцца за яе рашэнне і робіць з гонарам.

У сваім дзённіку М. Танк запісаў: «На стале — незакончаны пераклад верша Віктара Гамуліцкага (1851-1919) «На Белай Русі». Пачатак мне не вельмі падабаецца, але канец гэтага верша прыгожы і прарочы. А быў ён, здаецца, надрукаваны ў 1908 годзе — за шмат год да рэвалюцыі»:

---

[1] Tuwim Julian. Dzieła, t. 3, s. 566.
[2] Живов Марк. Юлиан Тувим,— М., 1963, с. 166.

...О беларускі люд! Калі міне ўсё гора,
Шчасліваю парой
Пачуецца у злучаным славянскім хоры
Свабодны голас твой.

*(6, 77)*

Беларускі паэт не прымае тых радкоў польскага паэта, дзе гаворыцца пра рэлігійнасць, хрысціянскую пакорлівасць і цемнату беларусаў. Але ён салідарны з В. Гамуліцкім там, дзе той прадказвае беларускаму народу шчаслівую будучыню. Тут важны сам прынцып адбору. Пераклад гэтага верша на беларускую мову набываў асаблівы сэнс у буржуазнай Польшчы, дзе нацыянальныя меншасці былі пазбаўлены многіх правоў. Ён з'явіўся ў той час, калі народнафрантавы рух аб'ядноўваў прагрэсіўныя сілы.

Верш В. Слабодніка «Не час спяваць калыханкі» сугучны рэвалюцыйным вершам М. Танка 30-х гадоў:

Не час спяваць калыханкі,
І я табе заспяваю
Аб тым, што не кожны сёння
Мае і вугаль, і хлеб.

*(6, 104)*

У перакладзе, як і ў арыгінале, такі ж парывісты, імклівы і чаканны рытм, напружанае і суровае гучанне.

У 30-я гады М. Танк пераклаў грамадзянскі верш Е. Путраманта «Ваенны парад», дзе адчуваюцца прыкметы новай паэтыкі XX ст., звярнуў увагу на глыбока лірычны, роздумны твор Е. К. Вайнтраўба «Люстра», напісаны свабодным вершам. Гэта лішні раз даказвае тыпалагічнае падабенства паміж паэзіяй М. Танка і творчасцю польскіх паэтаў 30-х гадоў.

У пачатку 1937 г. ён прачытаў цікавы сатырычны верш Ю. Вітліна «Літанія», збіраўся яго перакласці на беларускую мову. Варта нагадаць, што ў апошнім даверасноўскім зборніку М. Танка «Пад мачтай» (1938) прыкметна вызначыўся новы, сатырычны кірунак у яго паэзіі («Адказ», «Раманс», «Пачатак оды», «Гавораць, кат памёр», «Эпітафія»). Для беларускага паэта паказальным было выкарыстанне Ю. Вітлінам традыцыйных мастацкіх прыёмаў пры рашэнні задач сатырычнага плана.

У «Лістках календара» змешчаны шматлікія пераклады М. Танка з польскай мовы, цікавыя меркаванні пра творчасць многіх польскіх паэтаў міжваеннага дваццацігоддзя. Паэт піша: «Пад снегапад пачаў перакладаць цудоўны верш І. Галчынскага «Прывет, Мадонна». Некаторыя строфы яго пераклікаюцца з нашым Янкам Купалам. ...Недзе

яшчэ ў мяне ляжыць перапісаная два-тры гады таму назад паэма І. Галчынскага «Інга Бортш». Усё ніяк не магу сабрацца і перакласці яе. А паэма гэта калісьці была для мяне цэлым адкрыццём» (6, 175-176).

Верш «Прывет, Мадонна» пераклікаецца не толькі з вершамі Я. Купалы, але сваёй танальнасцю і гучаннем блізкі з даверасънёўскай лірыкай М. Танка, асабліва сатырычнымі творамі. Ён мае падабенства і з вершамі пазнейшай пары («Ave Maria» і «Готыка «Святой Анны»), К. І. Галчынскі ў вершы «Прывет, Мадонна» як бы раскрыў душэўны стан М. Танка:

Не пагарджай вянком паэта і хулігана,
Знаёмага з рэдактарамі, з паліцыяй коннай,
Ты ж мая маці, муза, кахана,—
Прывет, Мадонна![1]

І ў перакладзе псіхалагічная глыбіня, незвычайная кандэнсацыя думак і пачуццяў раскрыты жывой, натуральнай мовай.

Гэты верш быў напісаны ў 1929 г. У ім зліліся дзве асноўныя лініі творчасці К. І. Галчынскага — лірычная і сатырычная. Хвалюючае лірычнае пачуццё змяняецца іроніяй, якая пераходзіць у гратэск. Паэт захапляецца вечнасцю жыцця і яго прыгажосцю, сцвярджае немагчымасць пазнаць сэнс жыцця. Тут праяўляецца пратэст, бунт паэта. Адначасова верш напоўнены глыбокім лірычным роздумам.

Як у творчасці К. І. Галчынскага, так і ў творчасці М. Танка 30-х гадоў адбываліся змены, характэрныя для еўрапейскай паэзіі той пары. Гэта праяўлялася ў дэмакратызацыі паэзіі, калі паэты звярталіся да штодзённай тэматыкі, у вызваленні верша ад прывычных рытмічных канонаў, у пазбяганні экстравагантнай рыфмоўкі і вобразнасці.

Праз усю творчасць К. І. Галчынскага праходзяць дзве асноўныя лініі. Першая звязана з паэтам-насмешнікам, другая — з паэтам-гуманістам, паэтам-стваральнікам. Гуманістычная якасць яго паэзіі асабліва яскрава выявілася ў паэме «Віт Ствош», прысвечанай аўтару скульптурных кампазіцый алтара Марыяцкага сабора ў Кракаве. Можна правесці паралель паміж творам польскага паэта і паэмай М. Танка «Люцыян Таполя». Абодва паэты гавораць пра вечнасць, прыгажосць і несмяротнасць сапраўднага мастацтва. Яны раскрываюць вобраз таленавітага мастака, творчасць якога глыбока народная і рэалістычная. У тварэннях Ствоша фантастычныя істоты (чэрці, анёлы) набываюць зусім чалавечыя рысы: анёлы хутчэй маюць падабенства з юнымі пажамі, дэманы ж спалучаюць рысы драпежных птушак з будовай чалавечага цела. Герой паэмы гаворыць:

[1] Танк Максім, Зб. тв.: У 4-х.т.-Мн., 1967, т. 4, с. 331,

Niechaj w moim dziele
Gustują stolarze,
Moi przyjaciele.[1]

У тварэннях Люцыяна Таполі апосталы падобныя на простых людзей, а святая напамінае вясковую прыгажуню. Хімеры маюць многа агульнага з прадстаўнікамі знаці і царкоўнікамі.

І хоць паэзія К. І. Галчынскага цяжкая для пераймання, бо ў яго ярка выражаны індывідуальны паэтычны стыль, тым не менш можна знайсці тыпалагічнае падабенства паміж яго творчасцю і творчасцю М. Танка.

Сувязі, якія існавалі паміж даверасн ёўскай творчасцю М. Танка і міжваеннай творчасцю Ў. Бранеўскага, беларускі паэт плённа развіў на сучасным этапе сваімі мастацкімі перакладамі «Элегія на смерць Людвіка Варынскага», «Я жыў», «Горад мой», «Дрэва ў роспачы», «Вераснёвае сонца», «Паэт». У гэтых творах раскрыты характэрныя рысы паэзіі У. Бранеўскага 30-х гадоў, перыяду другой сусветнай вайны і 50-х гадоў.

Пры перакладзе верша «Элегія на смерць Людвіка Варынскага» М. Танк раскрыў вельмі моцна выражаны лірычны пачатак і агульную ліра-эпічную танальнасць. Верш гучыць як страсны лірычны маналог:

Калі не баішся ты песні,
Што звоніць прыгнечана, глуха,
Калі ты адважны і любіш
Свабодную песню — паслухай.
*(5, 409)*

Перакладаючы гэты верш пра мужнага польскага рэвалюцыянера, М. Танк як бы вяртаецца ў сваё рэвалюцыйнае і суровае юнацтва.

Актуальным у міжваеннай лірыцы У. Бранеўскага было яго імкненне вызначыць ролю і задачы паэта і паэзіі ў жыцці. Сваю ідэйна-эстэтычную праграму ён абвяшчае ў вершы «Паэт»:

Неба — золак астылы,
Бездань мёртвага царства.
У сусвет гэты вылі
Верш, як лыжку лякарства.
*(5, 411)*

У прыведзеных радках, як і ў вершы «Паэзія», У. Бранеўскі адстойвае паэзію, якая павінна служыць зброяй у барацьбе за перабудову грамадства.

[1] Gałczyński Konstanty Ildefons. Dzieła w pięciu tomach.—Warszawa, 1951, t. 2, c. 494.

У гады вайны польскі паэт стварае такія вершы, як «Вераснёвае сонца», «Балады і рамансы», «63», «Дрэва ў роспачы» і інш. Творы паэта гэтага часу насычаны лексікай, вобразамі і рэмінісцэнцыямі з польскай рамантычнай паэзіі, што збліжае іх з вершамі А. Міцкевіча і Ю. Славацкага, напісанымі ў час эміграцыі.

Глыбокім лірызмам і страсным пафасам прасякнуты верш «Вераснёвае сонца»:

Зноў вярнуся я ў Польшчу, дзе шмат верасняў будзе,
Будуць зноў ападаць з дрэў ігрушы і слівы,
Але гляну на неба — і боль сціснe мне грудзі:
Больш пад верасня сонцам я не буду шчаслівым.

*(5, 412)*

Гэтыя радкі нагадваюць інтанацыю верша М. Танка перыяду вайны «Адыходзячы з хаты»: «Чаму ж на расстайных гасцінцах, // Шляхах жураўліных,//Даўно не рацвіўшая сніцца//У полі каліна?» (I, 432). Верш у перакладзе гучыць страсна, эмацыянальна:

Сонца верасня — о, славы дні і цярпення! —
Заўжды будзе праклята ў казнах, песнях...

*(5, 412)*

Паэзія У. Бранеўскага перыяду другой сусветнай вайны перадае глыбокія перажыванні аўтара, раскрывае яго трагізм і трагічны лёс польскага народа. Верш «Дрэва ў роспачы» далей развівае матывы яго лірыкі 20-30-х гадоў («Лістапады», «Вуліца Мілая» і інш.):

Дрэва, што б'ешся чалом аб зямлю
у роспачы дзікай, глыбокай,
адным шумам разам з табою шумлю
я — самы ў жыцці адзінокі.
...Не знаю, калі я ўрасту, ў які грунт,
і дзе злажу косці ў дарозе,
але хай пяе мне пра боль свой, пра бунт
дрэва, падобнае да бярозы.[1]

Як бачым, верш з'яўляецца глыбока патрыятычным. Відаць, можна гаварыць пра агульнасць патрыятычных матываў, якімі прасякнута творчасць У. Бранеўскага і М. Танка перыяду вайны. У вершах «Мы вернемся», «Хмары з захаду», «Пісьмо», «Родная мова» М. Танк з трывогай і болем піша пра знявечаную фашыстамі беларускую зямлю, выказвае веру ў перамогу над ворагам.

Спалучэнне глыбокага лірызму з грамадзянскасцю з'яўляецца таксама характэрнай, адметнай рысай творчасці У. Бранеўскага і М.

[1] Бранеўскі Уладзіслаў. Дарогай дзён, с. 138.

Танка 40-50-х гадоў. Іх паэзія ўсё больш набывае медытатыўны, апавядальны характар. Так, у вершы «Я жыў» польскі паэт гаворыць пра непарыўную сувязь свайго лёсу і лёсу польскага народа, дае ацэнку пражытым гадам, асэнсоўвае сваё месца ў жыцці грамадства:

Мне шкада не пражытай у змаганні
Кожнай хвіліны, якая
Нясе з сабой светлае ранне
І дружбе спрыяе.

*(5, 413)*

Сваім гуманістычным гучаннем, грамадзянскасцю творчасць У. Бранеўскага ўзбагаціла літаратуру народнай Польшчы новым і ідэйна-эстэтычнымі вартасцямі.

Пераклады М. Танка з польскай паэзіі паказваюць, што аўтар часцей за ўсё звяртае ўвагу на творы духоўна блізкіх яму паэтаў. Так, верш С. Пентака «Бабулька і я» сваім зямным, канкрэтным зместам блізкі сучасным вершам М. Танка «Мыццё бабкі Улляны», «Смаленне кабана», «Сустрэча», «Бібліятэка» і інш.

Лірычны герой верша С. Пентака, сустрэўшыся з 90-гадовай бабулькай, сваёй аднавяскоўкай, якая ішла жаць жыта, прыходзіць да вываду:

Мне сорамна было, што я пісаў пра неба,
Пра з'явы розныя, а не пра гэту глебу.

*(5, 443)*

Што вельмі блізка танкаўскаму:

Усе вартасці,
 ісціны
 меру
Я мужыцкім аршынам — працай.

*(4, 8)*

Тут назіраецца блізкасць этычнай канцэпцыі абодвух мастакоў, у аснове якой ляжыць народная ацэнка з'яў рэчаіснасці.

Яркай, прыкметнай і каларытнай фігурай у літаратуры народнай Польшчы з'яўляецца Тадэвуш Ружэвіч. Ён вядомы як паэт, празаік і драматург. Паэзія Т. Ружэвіча намеціла паварот у польскай лірыцы 40-50-х гадоў. У яго вершах няма традыцыйных рыфмы і рытму, на якія абапіраецца класічная польская паэзія. Вызваліўшы, такім чынам, верш з цесных рамак класічнай формы, польскі паэт стварае тым самым большыя магчымасці для свабоднага раскрыцця ідэйнай задумы і зместу. Верш Т. Ружэвіча вельмі просты, амаль мяжуе з прозай, яму ўласцівы непасрэднасць, багацце асацыяцый, лагічнасць і строгасць у выяўленні думак і пачуццяў.

Т. Ружэвіч, як і М. Танк у сучаснай лірыцы, выкарыстоўвае блізкія ці нават аднолькавыя формы эстэтычнага асваення рэчаіснасці. Безумоўна, на перамены ў творчасці беларускага паэта другой палавіны 50-х гадоў зрабілі прыкметны ўплыў змены ў грамадскім жыцці нашай краіны. Паэт працягваў таксама свае пошукі ў галіне паэтычнай формы, пачатыя ім яшчэ ў 30-я гады. Аднак у яго творах апошняга дваццацігоддзя найбольш выразна выявіліся тэндэнцыі, характэрныя для сучаснай еўрапейскай паэзіі. Іх сутнасць заключаецца ў абнаўленні ці нават адмаўленні ад некаторых традыцыйных архаічных форм, якія, як ён піша, сталі «старым і аджыўшым свой час рэквізітам». У апошнія гады паэт адзначае непатрэбнасць арнаментальнага ўпрыгожвання асобных ранейшых сваіх вершаў, выступае за тое,

Каб у наш час
Міжпланетных палётаў
І вершу даць строгую
Форму ракеты
І вывесці беспамылкова на трасу —
Да сэрца.

*(3, 255)*

Т. Ружэвіч таксама выступае за непасрэднасць паэтычнага выказвання. Ён піша: «Твор, на маю думку, павінен бегчы ад стваральніка да чытача па прамой, не затрымліваючыся нават на самых чароўных і з эстэтычнага пункту гледжання прыгожых стылістычных прыпынках»[1]. Пры ўсёй прастаце гэтай паэзіі ўласцівы шматзначнасць зместу і вастрыня ўспрымання рэчаіснасці. Польскі паэт імкнецца, каб яго лірыка была дзейснай, даходлівай і зразумелай чытачам.

Адной з вядучых тэм сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца тэма Вялікай Айчыннай вайны. М. Танк таксама часта звяртаецца да гэтай тэмы. Вопыт вайны выразна выяўляецца і ў перакладзеным ім вершы Т. Ружэвіча «Сведка»:

Ці ж можна аб любві
Пісаць,
Пачуўшы крык закатаваных,
Зганьбаваных.
...Не уваходзь неспадзявана
У мой пакой.
Пабачыш анямелага
Ты сведку той любві,
Якая смерць перамагла.

*(5, 494-495)*

[1] Różewicz Tadeusz. Przygotowanie do wieczoru autorskiego.— Warszawa, 1971, c. 99.

Гэты верш трагічны, ён амаль мяжуе з прозай. Паэт адмаўляецца ў ім ад традыцыйных рытму і рыфмы, адсутнічаюць тут метафары, уласцівыя вершаванай мове. Але ў той жа час гэта верш, бо паэт па-майстэрску выкарыстоўвае строфіку, інтанацыю. Словы паэта выклікаюць глыбокія і багатыя асацыяцыі, думкі, пачуцці. У вершы адчуваецца вялікі напал пачуццяў, унутраны драматызм зместу. Падобныя рысы ўласцівы шматлікім вершам М. Танка («Шыбы старой камяніцы», «Дзе яны?», «Вышыня», «Варшава ў дзень памінак» і інш.). Такім чынам, ідэйна-мастацкія пошукі абодвух паэтаў супадаюць, што сведчыць і пра тыпалагічнае падабенства іх паэзіі.

Т. Ружэвіч выказвае свае думкі і пачуцці драматычна, завострана і ў той жа час выразна, зразумела. М. Танка прывабіла ў Т. Ружэвіча тое, што польскі паэт раскрывае, калі можна так сказаць, чалавечнае ў чалавеку (верш «Як добра»):

Як добра, што сёння з табою
І сэрца мае гэтак б'ецца.
Я думаў, што сэрца
Няма ў чалавека.

*(5, 494)*

Паэт верыць у жыццё пры ўсёй яго складанасці і супярэчлівасці, адчувае прыгожае і ідэальнае ў жыцці, славіць чалавека.

Не ідылічны спакой і сентыментальную задаволенасць, а аптымістычны і жыццесцвярджальны пафас знаходзім у вершы «Ачышчэнне»:

Не саромцеся слёз,
Не саромцеся слёз, маладыя паэты.
Захапляйцеся месяцам,
Месячнай ноччу,

Салаўінаю песняй і чыстым каханнем.
...Наіўныя, у пекла паверыце,
Узрушаныя, у чалавека паверыце.

*(5, 493)*

Вершы Т. Ружэвіча, перакладзеныя М. Танкам, адносяцца да пачатковага перыяду творчасці польскага паэта (40-50-х гадоў). У 60-70-я гады яго паэзія захавала сваю суровую прастату, у ёй выявіўся маральны і філасофскі роздум, паэт пастаянна звяртаецца да трагічных перажыванняў ваеннага часу.

У 60-70-я гады М. Танк стаў праяўляць цікавасць да творчасці тых польскіх паэтаў, якія дэбютавалі ў сярэдзіне 50-х гадоў і якія шмат у чым вызначаюць характар сучаснай польскай паэзіі. Ён часцей за ўсё перакладае інтэлектуальна-філасофскую лірыку, аўтары якой вядуць

смелыя эксперыментальныя пошукі, выступаюць за абнаўленне паэтычнай формы. На характар адбору ўплывае таксама асаблівасць паэтычнага таленту і светаўспрымання самога М. Танка. У галіне паэтычнай формы ён з'яўляецца смелым эксперыментатарам у сучаснай беларускай паэзіі, аўтарам філасофскіх, глыбока інтэлектуальных твораў. Думаецца, што знаёмства М. Танка з дасягненнямі польскіх мастакоў слова станоўча ўплывае на яго паэтычныя пошукі і знаходкі.

М. Танк не выказвае асаблівай зацікаўленасці да творчасці тых аўтараў, якія з'яўляюцца прыхільнікамі класічнага кірунку ў сучаснай польскай паэзіі. Яму блізкія тыя творы, у якіх арганічна спалучаны традыцыйнае і наватарскае.

У 70-я гады, калі наладзіліся цесныя сувязі паміж Саюзам пісьменнікаў БССР і Лодзінскім аддзяленнем Саюза польскіх пісьменнікаў, М. Танк усё часцей звяртаецца да перакладаў паэтаў з Лодзі: Я. Гушчы, М. Ю. Канановіча, І. Сікірыцкага, Т. Хрусцялеўскага. Яны з'яўляюцца актыўнымі прапагандыстамі беларускай літаратуры ў Польшчы.

Я. Гушча, як і М. Танк, у 30-я гады жыў у Вільні, дзе і пачаўся яго творчы шлях. Творчасці Я. Гушчы ўласцівы пранікнёны лірызм і глыбокі роздум. Часта звяртаецца ён да тэмы мінулай вайны і глядзіць на сучаснасць праз прызму свайго ваеннага вопыту. Трывогу і неспакой выклікае ў паэта абыякавасць асобных прадстаўнікоў маладога пакалення да падзей таго часу, да салдат, якія аддалі жыццё за шчаслівую будучыню:

Святая Марыя!
Яны нічога не знаюць
Пра Юрку Дэвойна!
...Калі замярзаў я ад сцюжы,
Ён здымаў з сябе кажушок.
Потым — у парашутным дэсанце.
Потым: Аргем.

*(5, 472-473)*

Перакладзеныя М. Танкам вершы І. Сікірыцкага «Дзяўчына з нутра скрыпкі», «Гагарын», «Ракушка», «На смерць знаёмай сасны», «Драўляны конь», «Перад партрэтам царыцы Тамары», «Пізанская вежа» тэматыкай, вобразнасцю, інтанацыйным гучаннем і страфічнай будовай блізкія сучаснай лірыцы М. Танка.

Думаецца, што на сучасную паэзію лодзінскіх паэтаў робіць пэўны ўплыў творчасць М. Танка, чаму ў значнай ступені садзейнічаюць таксама іх шматлікія пераклады з лірыкі М. Танка. Сляды ўплыву беларускага паэта можна заўважыць у творчасці М. Ю. Канановіча.

Перакладчык шматлікіх сучасных вершаў М. Танка, польскі паэт прысвяціў яму такія вершы, як «На змярканні ля вадапою» і «Збіранне грыбоў».

Вершы М. Ю. Канановіча сваёй страфічнай будовай, манерай раскрыцця думкі і вобразнасцю блізкія сучасным вершам М. Танка. Возьмем, напрыклад, верш «Каму»:

Каму вецер шуміць?
Каму хваля калышацца?
Каму кветка цвіце?
Каму птах будзіць цішу?
...Каму росы ў імгле зіхацяць?
І нарэшце:
Каму б'е сэрца,
А каму звон?

*(Пераклад М. Танка, 5, 464)*

Падобныя анафарычныя зачыны і такое паслядоўнае выкладанне думак асабліва характэрны для вершаў М. Танка апошніх гадоў («Будучыня», «Век», «Бяссонніца», «Калыска», «Гербарый» і інш.).

У некаторых вершах («Вербы», «Дуброўка», «На смерць дзядзькі Антося») М. Ю. Канановіч прачула піша пра беларускую зямлю, гаворыць пра гераізм беларускага народа ў гады вайны.

Як бачым, М. Танк многа і актыўна перакладае з польскай мовы. Творчасць многіх польскіх паэтаў тыпалагічна блізкая яго паэзіі.

Беларускі паэт — актыўны прапагандыст польскай культуры і літаратуры ў БССР. Ён з'яўляецца старшынёй Беларускага аддзялення Таварысгва савецка-польскай дружбы.

Варта ўспомніць, што М. Танк быў мастацкім рэдактарам «Выбраных твораў» А. Міцкевіча (1955), рэдактарам зборніка «Сучасная польская паэзія» (1955), аўтарам уступнага артыкула да зборніка «Горад мільённы і мы» (1972), куды ўвайшлі вершы польскіх паэтаў, якія нарадзіліся ці жылі ў Лодзі.

М. Танк пераклаў таксама аповесць для дзяцей Я. Бранеўскай «Вандроўкі меднага грошыка» (1941), якая потым, у 1956 г., была перавыдадзена, лібрэта оперы С. Манюшкі «Страшны двор» (1952), асобныя польскія вершы беларуска-польскіх паэтаў XIX ст.

Пераклады М. Танка характарызуюцца мастацкай дасканаласцю, у іх назіраюцца беражлівыя адносіны да арыгінала, дакладная перадача зместу, паэтычных вобразаў, багацця рытмікі і мовы.

За пераклады і распаўсюджанне польскай культуры ў СССР галоўнае праўленне Таварыства польска-савецкай дружбы прысудзіла ў 1957 г. М. Танку прэмію ў галіне літаратуры, у 1958 г. беларускі паэт

быў узнагароджаны польскім урадам Афіцэрскім крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы, а ў 1968 г. ён стаў лаўрэатам узнагароды «ZAIKS».

Мастацкі пераклад — толькі частка тых адносін, якія звязваюць творчасць М. Танка з польскай культурай і літаратурай. Многія яго вершы тэматычна звязаны з Польшчай: «Вянок», «Палякам», «На брацкай зямлі», «Шапэн», «На Навагрудскай гары», «Хата гураля», «След лыжаў у Татрах», «У Жэлязовай Волі», «На заходняй граніцы», «Пры вогнішчы», «Начлег каля Свіцязі», «Ля пасёлка Леніна», «Вадаспад Адама Міцкевіча», «Асвянцім», «Над возерам Марское Вока», «Вяртанне Шапэна», «Вавельскія галовы», «Варшава ў дзень памінак», «Ланьцуцкі замак» і многія іншыя. У якасці эпіграфа да некаторых сваіх вершаў ён бярэ словы польскіх аўтараў: «Гальфстрым» (з К. І. Галчынскага), «Калі пакідаеш Радзіму» (з М. Паўлікоўскай Яснажэўскай), «Не хачу спяшацца пакідаць» (з Т. Мацарскага).

Беларускага паэта звязвае цесная дружба з многімі сучаснымі польскімі пісьменнікамі, паэтамі, грамадскімі і культурнымі дзеячамі. Ён неаднаразова наведваў Польшчу. У сваіх вершах, а таксама ў шматлікіх інтэрв'ю і крытычных артыкулах М. Танк выступае за ўмацаванне кантактаў паміж абедзвюма літаратурамі, за дружбу паміж беларускім і польскім народамі.

## ПАЭЗІЯ МАКСІМА ТАНКА Ў ПОЛЬШЧЫ

У перыяд міжваеннага дваццацігоддзя нешматлікімі былі як пераклады беларускіх пісьменнікаў на польскую мову, так і крытычныя артыкулы пра беларускую літаратуру ў польскім друку. Праўда, у 1921 г. Б. Жыранік выдаў «Нарысы па беларускай літаратуры». Пра беларускую літаратуру быў змешчаны таксама артыкул Ю. Галомбэка ў 4-м томе «Вялікай усеагульнай літаратуры» (1933), выйшла асобная праца М. Рудзінскай-Фраеліховай «Нататкі па беларускай літаратуры» (1936). Аднак гэтыя працы часцей за ўсё насілі інфармацыйны характар і асвятлялі ў асноўным развіццё беларускай літаратуры XIX — пачатку XX ст., рэдка закранаючы літаратуру 20-30-х гадоў.

У перыяд міжваеннага дваццацігоддзя на польскую мову былі перакладзены толькі асобныя вершы Я. Купалы, Я. Пушчы, А. Александровіча, М. Васілька, М. Машары і інш. Па сутнасці, толькі ў канцы 30-х гадоў пераклады з паэзіі М. Танка шырока адкрылі польскай грамадскасці беларускую літаратуру.

Упершыню польскія чытачы пазнаёміліся з вершамі М. Танка (праўда, у арыгіналах, транскрыбіраваных лацінкай) на старонках народнафрантавой газеты «Poprostu» (1935-1936). Аднак ужо ў 1937 г. Е. Путрамант спачатку ў віленскай газеце «Kurier Wileński», а потым і ў сваім зборніку паэзіі «Лясная дарога» змясціў пераклад верша «На шляху дзікіх гусей». Гэта быў першы і адзіны твор беларускага паэта, перакладзены на польскую мову Е. Путрамантам.

Актыўнымі перакладчыкамі твораў М. Танка ў 30-я гады былі К. А. Яворскі і Е. К. Вайнтраўб. У 1939 г. у іх перакладах павінен быў з'явіцца зборнік вершаў М. Танка на польскай мове. Але ажыццяўленню гэтай задумы перашкодзіла вайна. Толькі асобныя вершы друкаваліся ў часопісе «Kamena» і ў газеце «Sygnały». Паэму «Каліноўскі» перакладалі ў той час В. Скуза і К. А. Яворскі,[1] паэму «Нарач» — Ю. Лабадоўскі[2]. Відаць, да перакладаў твораў М. Танка на польскую мову звярталіся і іншыя паэты.

Паэзія М. Танка была рана заўважана і высока ацэнена польскімі перакладчыкамі і крытыкамі. Самабытны мастацкі талент паэта, а таксама тое, што ён жыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і быў асабіста знаёмы з віленскімі польскімі паэтамі, садзейнічалі. Папулярнасці маладога беларускага паэта ў Польшчы.

---

[1] Танк Максім. Збор твораў, т. 6, с. 314.
[2] Wiadomości Literackie, 1939, N 16, с. 21.

Цесная дружба звязвала М. Танка з Е. Путрамантам. У сваёй кнізе ўспамінаў «Паўстагоддзя» польскі пісьменнік піша: «Восенню 35 года пазнаёмілі мяне з маладым хлопцам-беларусам, які толькі што выйшаў з турмы. Звалі яго Максім Танк. Зразумела, імя і прозвішча — гэта псеўданімы. Прызвычаены да ідылічна-алегарычнай (і даволі слабай, прынамсі на Віленшчыне) беларускай паэзіі, я аднёсся да гэтага хлопца некалькі пратэкцыянальна.

Але толькі да той хвіліны, калі ён пачаў чытаць свае вершы. Аказалася, што перада мной глыба сапраўднага паэта. Я захапіўся незвычайна: гэта бывае так рэдка. Мы сустракаліся вельмі часта, я атрымаў ад яго ўсе зборнікі, якія толькі выходзілі, а ён выдаў іх шмат, некаторыя яго вершы я ведаў на памяць, адзін пераклаў. Я быў занепакоены толькі адным. Беларуская, «тутэйшая», мова мела для нас, усіх палякаў з Віленшчыны, нейкі вельмі дамашні, свойскі, але і непрыемны прысмак. На гэтай мове звярталюцца да прыслугі...

І вось на гэтай мове пачала цяпер для мяне гучаць сапраўдная паэзія. Не мог вызваліцца ад узрушанасці. Напісаў пра Танка і беларускую паэзію ў Польшчы пару артыкулаў. Адзін упіхнуў, здаецца, праз Чаховіча аж у «Pion»... Пасылаючы яго туды, меў таксама маленькі палітычны разлік. Танку пагражалі паліцэйскія рэпрэсіі, нават Бяроза. Думаў сабе: пасля такіх артыкулаў цяжэй будзе яго схапіць і ва ўсякім разе большая магчымасць потым яго выцягнуць»[1].

«Сапраўдная паэзія»—вось што прывабіла і захапіла Е. Путраманта. Зыходзячы з гэтага, ён і ацэньвае творчасць беларускага паэта ў сваіх артыкулах[2].

М. Танк, прачытаўшы артыкул Е. Путраманта «Літаратурны мікракосмас», піша: «Мне здаецца, недахопам гэтага і іншых артыкулаў Е. Путраманта з'яўляецца пераацэнка заходнебеларускай літаратуры і слабае веданне савецкай, аб якой ён у большасці выпадкаў мяркуе па неаб'ектыўных і тэндэнцыйных аглядах і рэцэнзіях заходнебеларускай прэсы, не маючы магчымасці пазнаёміцца з самімі творамі. Але, нягледзячы на гэта, Е. Путрамант — адзін з першых з усяпольскай трыбуны на ўвесь голас сказаў добрае сяброўскае слова пра нас, адзін з першых звярнуў увагу на змены і працэсы, якія адбываюцца ў нашай літаратуры, звярнуў увагу на яе новыя мастацкія вартасці і дасягненні, на яе грамадскі рэзананс» (6, 153).

---

[1] Putrament Jerzy. Półwieku.— Warszawa, 1964, l. 1, c. 316 317.

[2] Putrament Jerzv. Mikrokosmos literacki. Pion, 1937, N 15, c. 3: Współczesna literatura białoruska.— Głos powszechny. 1937, N 53, c. 6; Maksim Tank i poezja białoruska — Sygnały, 1939, N 75, c. 5.

У артыкуле «Сучасная беларуская літаратура» Е. Путрамант, адзначаючы талент пачаткоўца, гаворыць, што яго вершы неабходна перакладаць на польскую мову. Ён высока ацаніў паэму «Нарач», «якая з пункту погляду сучаснай эпічнасці не мае сабе роўных не толькі ў беларускай літаратуры, але і ў польскай».

У артыкуле «Максім Танк і беларуская паэзія» польскі крытык вызначае месца М. Танка ў заходнебеларускай літаратуры, паказвае характэрныя рысы яго творчасці. У галіне паэтычнай формы, піша Е. Путрамант, беларускі паэт многа ўвагі ўдзяляе «распрацоўцы рэдкай да гэтага часу ў беларускай паэзіі структуры, дзе галоўная роля належыць не рытміцы ці эпіфорыцы, але хутчэй за ўсё фабуле». Крытык адзначае, што М. Танк у пошуках рытмікі ідзе двума шляхамі: з аднаго боку, мадыфікацыя ўсталяваных (напрыклад, у рускай літаратуры) метраў, з другога — пераход ад сілаба-танічнай сістэмы да танічнай, гэта тое, што зрабілі Блок і Маякоўскі ў рускай літаратуры, Каспровіч і паэты групы «Скамандр» у польскай. Ён гаворыць, што тэматычнае багацце творчасці М. Танка дапаўняецца разнастайнасцю паэтычных жанраў.

Е. Путрамант піша, што польскага пісьменніка М. Танк мог бы зацікавіць галоўным чынам з двух бакоў: па-першае, з пункту погляду безумоўнай, агульначалавечай каштоўнасці яго паэзіі, па-другое, з пункту погляду гісторыка-літаратурнага. Далей ён адзначае, што тэмай для параўнальнага аналізу, акрамя названых раней праблем паэтычнага слова, узбагачэння літаратурнай мовы, стварэння новых паэтычных рэсурсаў і г. д., можа служыць і тое, што ў беларускай літаратуры заканчваецца перыяд прарастання, што знікаюць паўтарэнні дасягненняў багацейшых суседзяў і перайманне іх паэзіі, становяцца лішнімі і адпадаюць чужыя ідэйныя і фармальныя падпоркі, што створаны і ўскормлены старэйшымі культурамі новы арганізм стаіць на ўласных нагах.

Е. Путрамант вельмі высока ацэньвае творчасць М. Танка: «Не багата знойдзецца ў польскай паэзіі малюнкаў прыроды, якія маглі б прыгажосцю і дакладнасцю зраўняцца з малюнкамі Танка. Яго паэмы «Нарач» і «Журавінавы цвет» ператвараюць красу наднёманскай зямлі ў паэзію так дасканала, што можна яго супаставіць у гэтым сэнсе з Міцкевічам без боязі якіх-небудзь дыспрапорцый».

Змястоўнымі, напісанымі на дастаткова высокім прафесійным узроўні з'яўляюцца артыкулы С. Сасноўскага «Пясняр Нарачы»[1], дзе ён разглядае паэму «Нарач» і зборнік «Журавінавы цвет», а таксама

---

[1] Sygnały, 1937, N 33, с. 4.

«Новая кніга Максіма Танка»[1], у якім характарызуецца зборнік «Пад мачтай». Прачытаўшы другі артыкул С. Сасноўскага, М. Танк піша ў сваім дзённіку: «Рэцэнзія вельмі цікавая. Асабліва мне каштоўныя заўвагі аўтара. Шкада, што ў нашай беларускай крытыцы няма нікога, хто б глыбока і ўсебакова разбіраўся ў паэзіі і разумеў яе» (6,211).

Пра паэму «Нарач» С. Сасноўскі піша: «Нарач» з'яўляецца творам, бліжэйшым да нашых паняццяў пра паэму, чым усе пасляваенныя польскія публікацыі... Што датычыць агульнай стылявой гармоніі, то можна зрабіць пэўныя агаворкі: апісальна-лірычны матэрыял і апавядальнае дзеянне — гэтыя два галоўныя элементы структуры паэмы — у даным выпадку не заўсёды бываюць належным чынам звязанымі паміж сабой. Дзеянне паэмы не з'яўляецца, урэшце, па-сапраўднаму распрацаваным, яе структура напамінае калекцыю вобразаў, злучаных агульным аб'ектам апісання (наднарачанская беларуская вёска), а не прычыннай сувяззю».

Крытык адзначае, што моцным момантам у паэме з'яўляецца апісальна-лірычны матэрыял. Ён піша: «Дар паэтычнага бачання ў Танка сапраўды незвычайны. Край, сімвалам якога з'яўляецца сасна, бяроза і пясок, набывае ў яго адценне нейкай чароўнай краіны харастваа. Стаім здзіўленыя перад краявідамі, якія дасканала, ведаем, якія... лічылі да гэтага часу шэрымі, беднымі і смутнымі, пазнаём іх і не можам пазнаць, стаім, зачараваныя іх дакладнасцю і красой. Колькі любві да той зямлі, колькі паэтычнага таленту неабходна, каб стварыць такі малюнак, не прыбягаючы да фальшу ці фікцыі. Зямля Нарачы і Нёмана ад Міцкевіча не мела такога вялікага песняра».

Высокую ацэнку дае С. Сасноўскі паэме «Журавінавы цвет» і аднайменнаму зборніку вершаў М. Танка. Даследчык гаворыць: «Ужо пісалі пра падабенства сучаснага стану беларускай літаратуры з некаторымі даўно мінулымі стадыямі старэйшых літаратур, напрыклад польскай ці рускай. Падабенства гэта, вядома, далека не тоеснае, замест паўтарэння асобных стадый развіцця маем тут паскоранае развіццё, маем кумуляцыю асобных перыядаў у адзін. Адсюль падабенства адначасова да некалькіх эпох, перш за ўсё да эпохі зараджэння рамантызму ў Польшчы і да перыяду Аляксандра III у Расіі».

З палажэннямі польскага крытыка можна згадзіцца толькі часткова. С. Сасноўскі мае рацыю, калі гаворыць пра падабенства, але не тоеснасць стану заходнебеларускай літаратуры з перыядам зараджэння рамантызму ў Польшчы. Аднак цяжка згадзіцца з ім тады, калі ён піша пра падабенства заходнебеларускай літаратуры з

[1] Sygnały, 1938, N 50, с. 7

рускай перыяду царавання Аляксандра III (1881-1894). Трэба ўлічыць і той факт, што да 30-х гадоў, калі М. Танк уступіў у літаратуру, за плячамі ў яго была ўжо беларуская літаратура XIX ст., дарэвалюцыйная творчасць Я. Купалы, Я. Коласа і М. Багдановіча, вопыт беларускай савецкай літаратуры.

Польскі крытык трапна заўважыў, што водгук, які знаходзіла заходнебеларуская літаратура сярод галодных, малапісьменных беларускіх сялян, роля, якую яна для іх выконвала, блізкая той ролі, якая належала ў жыцці польскага грамадства XIX ст. польскай рамантычнай паэзіі.

С. Сасноўскі ў рэцэнзіі на зборнік «Пад мачтай» адзначыў перамены, якія выявіліся ў вершах, уключаных у гэты апошні даваснёўскі зборнік беларускага паэта: «Танк валодае вельмі добра асвоенай паэтычнай мовай, вобразнай і выразнай, поўнай натуральных (не штучных, як часта сустракаецца, асабліва ў нашага «Авангарда», кат. С. і Д) метафар...» Пацвярджэннем гэтай думкі польскага крытыка пра перамены ў творчасці беларускага паэта з'яўляецца запіс самога М. Танка, зроблены ў дзённіку 8 ліпеня 1938 года: «Памалу адыходжу ад старой метафары. Шукаю новай. Час перабудовы — самы цяжкі. Пры адсутнасці сур'ёзнай крытыкі і больш патрабавальнага чытача я мог бы яшчэ шмат год пісаць так, як пішу, але я перастаў бы быць цікавым сам для сябе» (6, 288).

С. Сасноўскі дае кароткі аналіз казкам, уключаным у зборнік. Паэму «Каліноўскі» ён разглядае як далейшы крок М. Танка пасля «Нарачы» і іншых паэм па шляху авалодання чыстай эпікай, станоўча ацэньвае ўменне аўтара выкарыстоўваць гістарычныя факты для ідэйна-мастадкіх задач. Крытык знаходзіць аналогію паміж паэмай і творамі польскіх рамантыкаў: «Некалькі сцэн, фактура якіх набліжана да своеасаблівага паэтычнага рэалізму польскіх рамантычных драм (перш за ўсё «Дзядоў» і «Кардыяна»), звязвае ў моцнае цэлае нават не дзеянне ў вузкім значэнні гэтага слова, а прыгожа развіты, цэласны, чароўны паэтычны вобраз».

Большую частку кнігі займаюць лірычныя вершы. Крытык вылучае сярод іх пейзажную лірыку, сатырычныя, інтымныя вершы і вершы, «адрасатам якіх стала... ўсё чалавецтва». С. Сасноўскі піша: «У параўнанні са сваімі папярэднімі кнігамі Танк выступае тут як паэт больш сталы і спакойны. Гэта не заўсёды з'яўляецца ўдачай, у зборніку «Пад мачтай» менш знойдзем цудоўных малюнкаў беларускай зямлі, якія так захаплялі ў паэмах «Нарач» і «Журавінавы цвет», хоць і з'яўляліся яны часцей за ўсё цудоўнымі фрагментамі няроўнага цэлага». Крытык адзначае, што ў новым зборніку лірыка паэта

ўраўнаважылася, ён выступае не толькі з дасканалым фрагментам, але і з добра распрацаванай тэмай. Калі ў паэме «Нарач» і ў зборніку «Журавінавы цвет» адчувалася камернасць яго паэзіі, было мноства паэтычных намёкаў і алегорый, а таксама шматкроп'яў, то ў апошняй кнізе менш гэтых раздражняльных адзнак.

У рэцэнзіі адзначаецца сатырычны талент М. Танка, характэрнымі рысамі якога з'яўляецца «незвычайная пластыка паэтычнай карыкатуры, а таксама дакладкасць і трапнасць накіраваных удараў». С. Сасноўскі выказвае меркаванне пра нізкі ўзровень інтымных вершаў зборніка.

Адметнай рысай вершаў, «адрасатам якіх стала... усё чалавецтва», паводле меркавання крытыка, з'яўляецца не толькі іх дасканаласць, але і тое, што ў іх знаходзяць выяўленне ідэі сапраўды агульначалавечыя, якія яднаюць чалавецтва заўтрашняга дня (верш «Яны»).

С. Сасноўскі вызначае ролю паэтычнай творчасці М. Танка ў гісторыі беларускай літаратуры. Крытык прыводзіць размову, якая адбылася паміж ім і адным здольным «маладым» польскім паэтам. Той, прызнаючы талент М. Танка, поспехі беларускага паэта вытлумачваў маладосцю беларускай культуры: «У Танка лягчэйшая задача, ён мае многа вольнай прасторы, ён павінен яшчэ ўсё зрабіць». Безумоўна, у нейкай ступені польскі паэт меў рацыю. Але поспехі М. Танка былі абумоўлены не толькі гэтым. Крытык правільна адзначыў, што «перавага стратэгічнай пазіцыі Танка заключаецца ў тым, што сваімі чытачамі ён выбраў людзей галодных. У чалавека галоднага больш інтэнсіўныя перажыванні і жаданні, у яго буйнейшае і багацейшае псіхічнае жыццё, усё, што ён атрымлівае, з'яўляецца для яго больш каштоўным... І не мае значэння, чаго такому чалавеку не хапае: хлеба, палітычнай свабоды ці эстэтычных эмоцый».

Сапраўды, народ Заходняй Беларусі меў вострую патрэбу ў такім паэце. У значнай ступені як Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча і іншых беларускіх паэтаў пачатку XX ст., так і М. Танка ў 30-я гады сфарміравалі пэўныя сацыяльныя і гістарычныя ўмовы. Для яго гэта была заходнебеларуская рэчаіснасць. М. Танк быў песняром свайго народа, і паэтычны талент дазволіў яму ідэі і думкі гэтага народа выявіць з незвычайнай паўнатой. Многім заходнебеларускім паэтам пасля 1939 г. цяжка было «пераступіць парог» (В. Таўлай), перайсці ад заходнебеларускай тэматыкі да савецкай, хоць скразной ідэяй рэвалюцыйнай паэзіі была ідэя ўз'яднання Заходняй Беларусі з Савецкай Беларуссю. Пэўныя цяжкасці ў гэтых адносінах адчуў і М. Танк. Вось, напрыклад, што пісаў ён у сваім дзённіку: «Мяне непакоіць цяплічная атмасфера, у якой развіваецца наша сучасная

паэзія. Змаганне з ценямі мінулага не можа загартаваць яе мускулаў»[1]. Ці: «Напісаў некалькі слабых газетных вершаў. Стаю над сваёй пустой студняй паэзіі, з якой вычарпаў усё, і не знаю, як хутка зноў яна напоўніцца жывой бруёй. А можа, не напоўніцца?» (6, 350).

У перадваеннай Польшчы паэмамі М. Танка зацікавілася «Суполка аўтараў-кінасцэнарыстаў», мяркуючы стварыць фільм. Яго паэзію заўважылі не толькі польскія перакладчыкі і крытыкі, але і польская грамадскасць. 15 сакавіка 1936 г. М. Танк выступіў на вечары беларускай паэзіі і песні, які адбыўся ў Вільні ў зале Снядэцкіх, а 18 красавіка 1937 г. чытаў свае вершы і вершы заходнебеларускіх паэтаў на літаратурным вечары ў адваката Б. Кржыжаноўскага перад віленскай польскай інтэлігенцыяй. 3 ліпеня 1939 г. аўтарскі вечар М. Танка адбыўся ў Варшаве ў Саюзе польскіх пісьменнікаў. С. Бруч напісаў заметку аб гэтым вечары пад назвай «Максім Танк, беларускі Ясенін»[2], якую потым з каментарыямі А. Мікулкі надрукаваў «Kurier Wileński»[3].

М. Танк пра гэтыя публікацыі так адазваўся ў сваім дзённіку: «І ў аднаго, і ў другога ёсць шмат цікавых для мяне заўваг. Асабліва здзівіла мяне празорлівасць Ст. Бруча: «Не ведаю, ці Танк напіша беларускую трэцюю частку «Дзядоў», але я ўпэўнены, што пракладзе для яе дарогу...» Як ён падслухаў мае думкі?» (6, 314).

С. Бруч піша: «Дваццацісямігадовы вясковы хлопец з густой віхрастай чупрынай, са смуглым тварам і дзіцячым падбародкам чытаў напеўна-працяжным голасам пейзажныя вершы, часам акідваў слухачоў цвёрдым і халодным паглядам блакітных вачэй, крывіў вусны іранічным і балючым перагібам губ». Далей ён заўважае, што ва ўсіх прысутных узнікла думка пра падабенства М. Танка і С. Ясеніна: «Калі б не было Ясеніна («Русь ты мая...»), не было б і Танка («Беларусь ты мая...»). Месяцавыя метафары рускага паэта знойдзем у шматлікіх новых варыянтах у беларускага паэта». Аднак ён адзначае, што «ўяўная роднасць Ясеніна і Танка хавае істотную паміж імі розніцу ... калі ясенінская вёска пульсуе скрытай рэвалюцыйнай містыкай, то пейзажныя малюнкі Танка пульсуюць беларускім нацыянальным болем, рамантычным сумам, у якіх назіраецца своеасаблівая мешаніна — водгукі Някрасава сплятаюцца з нотамі «Свіцязянкі».

Польскія слухачы ўспрынялі паэзію М. Танка як нешта экзатычнае і незвычайнае. Іначай і не магло быць. І ў той жа час гэтыя слухачы

---

[1] ТанкМаксім. Зб. тв. : У 4-х т., т. 4, с. 495.
[2] Wiadomości Literackie, 1939, N 31-32, с. 42.
[3] Kurier Wileński, 29 lipca 1939, с. 3.

добра адчулі талент маладога паэта. С. Бруч адзначыў і розніцу паміж паэзіяй С. Ясеніна і М. Танка. А параўнанне з лірыкай М. Някрасава і А. Міцкевіча, імкненне беларускага паэта стварыць значны эпічны твор, які меў бы такое ж значэнне і адыграў такую ж ролю ў беларускай літаратуры, як трэцяя частка «Дзядоў» у польскай, сведчыць аб тым, што М. Танк хацеў падняць беларускую літаратуру да тых ідэйна-эстэтычных вышынь, якіх ужо дасягнулі іншыя высокаразвітыя літаратуры.

Паэзія М. Танка не мела патрэбы ў пратэкцыянізме (як аднёсся было да яе Е. Путрамант да знаёмства з ёю), не ўласціва ёй была экзатычнасць (як успрынялі яе польскія слухачы ў Варшаве). Яна ішла сваім шляхам. Гэта паэзія сцвярджала сваё месца сярод іншых літаратур сваёй дасканаласцю і адметнасцю.

Канечне, любая з'ява не можа ўзнікнуць сама па сабе, не можа яна таксама існаваць ізалявана ад іншых з'яў. Але ў той жа час творчасць М. Танка мае свае адметныя рысы. Правільна адзначыў А. Мікулка, што нельга параўноўваць М. Танка з С. Ясеніным на падставе «экзотыкі» вобразаў беларускага паэта і спецыфічнага тону ў яго апісанні вёскі. Сялянскае паходжанне паэта і ўвогуле само жыццё прымушалі М. Танка так пісаць.

А. Мікулка піша: «Танк засвоіў і свабодна валодае паэтычнай тэхнікай, яго параўнанні і метафары з'яўляюцца свежымі, багатымі і ўдалымі. Магчыма, у значнай ступені гэта абумоўлена тым, што паэт добра ведае маладую польскую паэзію». Крытык адзначае, што пра вершы М. Танка неабходна яшчэ напісаць больш прафесійна і значна шырэй.

Пра заходнебеларускую літаратуру змяшчае артыкул у польскай прэсе Е. Вышамірскі, дзе закранае і творчасць М. Танка. М. Танк па гэтай прычыне ў сваім дзённіку піша: «Са спазненнем прачытаў цікавую газетную нататку Выш[амірскага] пра часопіс «Калоссе», дзе вельмі прыхільна ён адзываецца аб маёй паэме «Нарач», піша пра беларускае літаратурнае жыццё ў Вільні, аб патрэбе больш цесных кантактаў паміж польскімі і беларускімі пісьменнікамі. Нататка невялікая, але закранае шмат істотных і вельмі важных спраў... Мне здаецца, у гэтыя прыадчыненыя дзверы варта было б увайсці, хоць бы для абмену думак, хоць бы для таго, каб вынесці нашы набалелыя справы на большы форум, зацікавіць імі шырэйшыя кругі польскай грамадскасці, якая хіба знае больш пра амерыканскіх індзейцаў, чым пра нас» (6, 196).

У польскай прэсе з аглядньімі інфармацыйнымі артыкуламі выступаў П. Ластаўка[1].

Польская літаратурная крытыка 30-х гадоў у значнай ступені здолела дастаткова аб'ектыўна і правільна ахарактарызаваць давераснёўскую творчасць М. Танка, паказаць яе адметныя рысы, змяненні і эвалюцыю.

Кожны з крытыкаў, які пісаў пра М. Танка, адзначаў высокі мастацкі ўзровень яго твораў, з імем М. Танка звязваўся пералом, які наступіў у заходнебеларускай літаратуры. Было адзначана тыпалагічнае падабенства заходнебеларускай з больш багатымі рускай і польскай літаратурамі некаторых перыядаў, праведзена супастаўленне твораў М. Танка з асобнымі творамі польскіх паэтаў. Адзначаючы ў цэлым добразычлівасць і аб'ектыўнасць у ацэнках польскай крытыкі 30-х гадоў творчасці М. Танка, неабходна падкрэсліць, што яна, гаворачы пра сувязі творчасці паэта з нацыянальнымі традыцыямі, часам недаацэньвала іх. Паэзія М. Танка сапраўды мела цесныя сувязі з рускай і польскай літаратурамі. Аднак яна была рэвалюцыйнай і развівалася не толькі як састаўная частка заходнебеларускай літаратуры, але і як састаўная частка беларускай савецкай літаратуры. Мастацкае фарміраванне творчасці беларускага паэта адбывалася пад уздзеяннем фальклорных, беларускіх літаратурных традыцый і традыцый сусветнай літарагуры.

У новых умовах сацыялістычнай садружнасці змянілася сама прырода беларуска-польскага літаратурнага ўзаемадзеяння. У друку народнай Польшчы ў канцы 40 — пачатку 50-х гадоў з'яўляюцца аглядныя крытычныя артыкулы пра беларускую літаратуру беларускіх, а таксама польскіх аўтараў, актывізуюць сваю дзейнасць польскія перакладчыкі.

Узаемаадносіны М. Танка з польскай літаратурай у 40-80-я гады раскрываюць лепшыя старонкі беларуска-польскіх літаратурных сувязей. Як пра моцныя, так і пра слабыя бакі гэтых сувязей даюць уяўленне пераклады твораў М. Танка на польскую мову і ацэнка творчасці паэта польскімі крытыкамі.

У пятым нумары лодзінскай газеты «Wieś» за 1946 г. з'явіліся пераклады К. А. Яворскага з паэзіі М. Танка (VII частка паэмы «Каліноўскі», вершы «Лірнік», «Паслухайце, вясна ідзе», «Абапал лес», «Калі пачуеш», «Думаў: сёння прайду сабе так») і была дадзена біяграфічная даведка пра яго. Летам 1949 г. М. Танк у складзе дэлегацыі савецкіх

[1] Kultura, 1937, N 45, c. 3; Ateneum, 1938, N 6; Ruch słowiański, 1939, N 3-4, c. 61-65; Naród i państwo, 1939, N 23-24, c,. 11-13.

пісьменнікаў і журналістаў наведаў народную Польшчу. Біяграфічныя звесткі ў сувязі з гэтым пра яго дала «Gazeta Krakowska»[1]. У далейшым беларускі паэт неаднаразова наведваў ПНР, у польскім друку пра яго і яго творчасць з'яўляліся нататкі. 6 лістапада 1949 г. ён выступіў на сустрэчы з польскімі пісьменнікамі ў Варшаве[2], 19 лістапада — на III з'ездзе Таварыства савецка-польскай дружбы[3], 28 студзеня 1950 г.— на ўрачыстым адкрыцці помніка А. Міцкевічу ў Варшаве[4]. Інфармацыю пра М. Танка і інтэрв'ю з ім змяшчае кракаўскі друк[5].

У канцы 40 — пачатку 50-х гадоў пра М. Танка пісалі К. А. Яворскі[6], Е. Загурскі[7], Е. Вышамірскі[8]. К. А. Яворскі актыўна ўключыўся ў прапаганду беларускай літаратуры таксама і ва ўмовах народнай Польшчы. Е. Загурскага звязала з М. Танкам дружба яшчэ з даверасністаўскага часу, калі абодва жылі ў Вільні. Пра творчасць М. Танка, пра неабходнасць развіцця беларуска-польскіх літаратурных сувязей Е. Вышамірскі пісаў яшчэ ў 30-я гады. Гэтыя польскія крытыкі гаварылі ў асноўным пра яго дакрасністаўскую творчасць, пісалі пра сувязі М. Танка з віленскімі польскімі паэтамі ў 30-я гады, пра яго пераклады з польскай літаратуры, адзначалі польскую тэматыку ў яго творчасці. Е. Вышамірскі, як і ў 30-я гады, выступаў за ўмацаванне больш цесных літаратурных сувязей паміж абедзвюма літаратурамі. Польская крытыка дала таксама ацэнку творчасці М. Танка 40-х гадоў, пісала пра неабходнасць перакладаў яго паэзіі на польскую мову.

Значнае ажыўленне і цікавасць да Беларусі былі ўзмоцнены шэрагам культурных мерапрыемстваў. Так, восенню 1955 г. у ПНР упершыню былі праведзены Дні беларускай культуры. У сувязі з гэтым польскі друк многа месца адвёў Беларусі, яе гісторыі, эканоміцы, культуры. Ажывілася ў гэты час і польская літаратурная крытыка[9], павялічылася колькасць перакладаў з беларускай літаратуры. Дням беларускай культуры ў Польшчы прысвяцілі амаль цэлыя нумары газета «Życie Literackie» (1955, № 39) і часопіс «Przyjaźń» (1955, № 39). Заўважым, што палякі былі першымі з замежных славянскіх народаў,

---

[1] Gazeta Krakowska, 29 lipca 1949, c. 8.
[2] Odrodzenie, 1949, N 46, c. 2.
[3] Wolność, 1949, N 259, c. 7.
[4] Trybuna Ludu, 1950, N 28, c. 4.
[5] Echo Krakowskie, 1949, N 305, c. 3; 1950 N 32, c. 5; 1950, N 33, c. 5.
[6] Jaworski K. A. Poezja Maksima Tanka.— Wieś, 1946, N 5, c. 2.
[7] Zagórski J. O Maksymie Tanku.— Dziennik Literacki, 1949, N 50, c. 5.
[8] Wyszomirski J. Od Skaryny do Tanka.— Expres wieczorny. Warszawa, 1949, N 322, c. 4.
[9] Tygodnik Demokratyczny, 1955, N 39, c. 6; Wiedza i Życie, 1955, N 11, c. 774; Polonystyka, 1955, N 5 c. 13-20; Poradnik bibliotekarza, 1955, N 8, c. 173-176.

хто ў пасляваенныя гады выявіў такую шырокую зацікаўленасць да беларускай літаратуры.

Аднак пры ўсёй зацікаўленасці да беларускай літаратуры і культуры ў сувязі з яе Днямі ў Польшчы трэба адзначыць, што ў 50-я гады беларуска-польскія літаратурныя сувязі былі на недастаткова высокім узроўні і ў пэўнай ступепі аднабаковымі. Калі, папрыклад, у 50-я гады з'яўляюцца ў Беларусі «Выбраныя творы» А. Міцкевіча, «Выбранае» Ю. Славацкага, анталогія польскай паэзіі XX ст. і інш. (неабходна ўлічыць пры гэтым тое, што беларускі чытач меў магчымасць пазнаёміцца з творамі польскіх пісьменнікаў у рускіх перакладах), то на польскай мове ўбачыла свет значна менш кніг беларускіх аўтараў. У сувязі з гэтым «Trybuna Ludu» пісала: «Трэба прызнаць, што нашы веды пра беларускую культуру і літаратуру значна горшыя. Пераклады з'яўляюцца досыць спарадычна і абмінаюць шэраг істотных літаратурных пазіцый»[1].

Большасць беларускіх кніг, якія выйшлі на польскай мове ў 50-я гады, за выключэннем «Казкі пра Музыку» М. Танка, камедыі К. Крапівы «Пяюць жаваранкі», зборнікаў вершаў Я. Купалы і М. Танка, былі перакладзены не з арыгінала, а з рускага перакладу-пасрэдніка. Безумоўна, якасць перакладаў, асабліва паэзіі, пры гэтым зніжалася. Назіралася такая з'ява і пры перакладах асобных вершаў М. Танка. Зразумела, і ўяўленне польскіх чытачоў пра беларускую літаратуру ў той час было досыць павярхоўным.

У 1958 г. галоўным праўленнем Таварыства польска-савецкай дружбы быў выдадзены зборнік М. Танка «Выбраныя вершы». У прадмове, у прыватнасці, гаварылася: «Гэты нястомны змагар за дружбу народаў Польшчы і Савецкай Беларусі, а разам з тым і славуты паэт вядомы польскім чытачам менш, чым ён таго заслугоўвае»[2]. Аўтар прадмовы і складальнік зборніка (L. Ł.) ставіў перад сабой задачу паказаць не тэматычную разнастайнасць творчасці паэта, ён імкнуўся ўключыць у кнігу лепшыя пераклады яго твораў на польскую мову. Даецца творчая біяграфія М. Танка, гаворыцца пра сувязі беларускага паэта з польскай літаратурай і культурай, пра яго пераклады з польскай паэзіі: «Як творчасць Якуба Коласа і Янкі Купалы, так і паэзія Максіма Танка чэрпае жыццёвыя сокі з барацьбы беларускага народа і яго культуры. Яна характарызуецца незвычайнай прастатой, камунікатыўнасцю пры адначасовым багацці пачуццяў і глыбіні перажыванняў. На яе зрабілі значны ўплыў як народ-

---

[1] Trybuna Ludu, 1955, N 971, с. 1.
[2] Tank Maksym. Wybór poezji.—Warszawa, 1958, с. 1.

ная песня, так і міцкевічаўскія балады і рамансы. ...Яго творчасць глыбока гуманістычная і патрыятычная»[1] У прадмове было напісана, што сваю паэтычную радаслоўную М. Танк вядзе ад А. Міцкевіча. У асноўным правільна адзначаны характар творчасці М. Танка 30-50-х гадоў. Аднак ужо ў сярэдзіне 50-х гадоў у творчасці паэта назіраюцца прыкметныя перамены. Таму складваецца ўражанне, што прадмова напісана са спазненнем. Хоць зборнік і выйшаў у 1958 г., у яго ўвайшлі творы 1936-1951 гг.

Праўда, польская крытыка адразу ж заўважыла перамены, якія адбыліся ў творчасці беларускага паэта ў другой палавіне 50-х гадоў[2]. І хоць спачатку адзначаліся чыста тэматычныя змены, тым не менш быў зроблены першы крок да асэнсавання лірыкі М. Танка той пары.

У Польшчы нават да сярэдзіны 60-х гадоў з творчасці Я. Купалы, напрыклад, часцей за ўсё перакладаліся і вышэй цаніліся вершы дарэвалюцыйнага часу, а М. Танка — даверасвёўскія. Па гэтай прычыне М. Танк пісаў у 1964 г.: «Рэгулярна чытаю польскую прэсу. Яна многа піша пра розныя літаратуры, але пра беларускую — значна менш. І ў нас назіраецца такая ж самая з'ява. А дружба ж наша з'яўляецца такой арганічнай, што не можам не перакладаць з польскай. Усё наша жыццё фарміравалася на фоне тых сувязей. Тым больш трывожыць і раздражняе выпадковасць у справе перакладаў»[3].

Пра недастаткова высокі ўзровень беларуска-польскіх літаратурных кантактаў пісаў у польскім друку і беларускі літаратуразнаўца Адам Мальдзіс[4]. Так, у першай палавіне 60-х гадоў выйшлі на польскай мове толькі тры кнігі беларускіх аўтараў: «Дзень звычайны, убогі» Я. Купалы, «Трэцяя ракета» В. Быкава, «На шляху дзікіх гусей» М. Танка. Праўда, ужо з сярэдзіны 60-х гадоў у Польшчы адбываецца працэс больш паглыбленага і ўсебаковага ўспрымання беларускай літаратуры, што можна заўважыць і ў артыкулах пра М. Танка[5], якія маюць не толькі інфармацыйны, але і праблемны характар. У іх адзначаецца таксама сувязь даверасвёўскай і пасляваеннай творчасці мастака з польскай і рускай літаратурамі, больш падрабязна разглядаецца творчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны і 60-х гадоў. Высока ацэньваючы творчасць М. Танка, польскія крытыкі гавораць таксама пра дэкларацыйнасць і рытарычнасць некаторых яго вершаў[6].

---

1 Tank Maksym. Wybór poezji, c. 6.
2 Świat i Polska, 1957, N 28, c. 19.
3 Przyjaźń, 1964, N 1, c. 11.
4 Maldzis Adam. Literackie kontakty: Białoruś-Polska. — Życie Literackie, 1965, N 30, c. 15.
5 Gazeta Białostocka, 1962, N 233, c. 4; Przyjaźń, 1962, N 16, c. 14.
6 Odgłosy, 1964, N 7, c. 9.

У польскай прэсе 60-80-х гадоў часта з'яўляюцца інтэрв'ю польскіх журналістаў і крытыкаў з М. Танкам[1]. Прызнанні і выказванні паэта дапамагаюць глыбей зразумець яго творчасць, дазваляюць усебакова асэнсаваць яго кантакты з польскай літаратурай і культурай, раскрываюць сучасны ўзровень беларуска-польскіх літаратурных сувязей. А ў сувязях гэтых на працягу апошніх пятнаццаці гадоў адбыліся прыкметныя перамены.

Традыцыйнымі сталі Дні польскай літаратуры ў Беларусі і беларускай у Польшчы, што прыкметна садзейнічае ўмацаванню дружбы паміж двума суседнімі народамі. Так, у сувязі з Днямі беларускай культуры, якія адбыліся ў ПНР у кастрычніку 1982 г., польскія перыядычныя выданні змясцілі шматлікія пераклады з беларускай мовы і артыкулы пра беларускую літаратуру. Адгукнуўся польскі перыядычны друк новымі перакладамі і крытычнымі артыкуламі таксама на 70-годдзе М. Танка. У 1982 г. выйшаў «беларускі» нумар «Przyjaźni», а лістападаўскі штомесячнік «Literatura na Świecie» амаль цалкам прысвечаны творчасці беларускіх пісьменнікаў. Часта змяшчае на сваіх старонках публікацыі па беларускай літаратуры і фальклору славістычны штогадовік «Studia Polorno-Slavica-Orientalia».

З канца 60-х гадоў, калі былі наладжаны цесныя кантакты паміж Лодзінскім выдавецтвам ПНР і выдавецтвам «Беларусь» БССР, у Лодзі выйшлі першыя на польскай мове анталогіі «Беларускія вершы» і «Мае мядзведзі і іншыя беларускія апавяданні», зборнікі «Выбраныя вершы» М. Багдановіча і «Выбраныя вершы» М. Танка, кнігі «Глядзіце на траву», «Ніжнія Байдуны» Я. Брыля, «Хатынская аповесць» А. Адамовіча, «Блакіт і золата дня» У. Караткевіча, «Снежныя зімы» І. Шамякіна, «Ты — гэта ты» Д. Бічэль-Загнетавай, «А хто там ідзе?» Я. Купалы, «А так спявае дудка мілая» Я. Коласа.

У іншых выдавецтвах ПНР выйшлі на польскай мове «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Альпійская балада», «Сотнікаў», «Дажыць да світання», «Круглянскі мост», «Абеліск», «Яго батальён» В. Быкава, «Свет далёкі і блізкі», «Вітражы» Я. Брыля, «Лонва», «Тартак» І. Пташнікава, «Лісткі календара» М. Танка, «Я з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, а таксама «Анталогія беларускай паэзіі».

---

[1] Przyjaźń, 1964, N 1, с. 11; Kultura, 1964, N 9, с. 2; Słowo powszechne, 1964, N 28, с. 1-2; Odgłosy, 1971, N 46, с. 7; Kierunki, 1974, N 44, с. 5-7; Przyjaźń, 1976, N 8, с. 17; Gazeta Współczesna, 1982, N 208.

На польскую мову перакладзены значныя творы беларускай літаратуры. Аднак у Польшчы, на жаль, слаба ведаюць творы Я. Купалы і Я. Коласа, абыдзена ўвагай проза М. Гарэцкага і К. Чорнага.

З беларускіх паэтаў былі выдадзены ў Польшчы толькі Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, М. Танк і Д. Бічэль-Загпетава. Выхад анталогій беларускай паэзіі ў 1971 і 1978 гг., безумоўна, значная падзея ў беларуска-польскіх літаратурных адносінах. Тым не менш яны не могуць даць поўнага ўяўлення пра такіх сучасных паэтаў, як П. Броўка, А. Куляшоў, П. Панчанка,. А. Пысін, Р. Барадулін і інш. Часцей за ўсё перакладаюць творы М. Танка і В. Быкава. У народнай Польшчы з'явіліся наступныя кнігі М. Танка: «Казка пра Музыку» (1944, паўторна ў 1951), «Выбраныя вершы» (1958), «На шляху Дзікіх гусей» (1965), «Выбраныя вершы» (1974), «Выбраныя вершы» (1977), зборнікі дзіцячай лірыкі «Зімовая прыгода» (1968) і «Птушыныя фокусы» (1972), «Лісткі календара» (1977).

У апошнія гады ўзмацнілася цікавасць да твораў М. Танка і з боку крытыкаў. Адбываецца як бы новае асэнсаванне творчасці паэта даверасноўскага часу і больш глыбокі аналіз 40-70-х гадоў.

Як правіла, пайбольш змястоўная і глыбокая ацэнка яго творчасці даецца ў прадмовах да кніг ці ў рэцэнзіях на гэтыя кнігі. Варты ўвагі і такі факт, як з'яўленне ў польскім друку рэцэнзіі на зборнік выбранай лірыкі М. Танка «Ключ жураўліны»[1], дзе былі прадоўжаны добрыя традыцыі даверасноўскай польскай крытыкі, якая пісала ўвогуле пра творчасць М. Танка ці пра кнігі паэта, што выйшлі на беларускай мове.

У польскім друку рэцэнзаваліся «На шляху дзікіх гусей»[2], «Выбраныя вершы» (1974)[3], «Лісткі календара»[4]. З польскіх крытыкаў, якія пісалі пра М. Танка, трэба вылучыць Я. Гушчу, І. Сікірыцкага, Ф. Няўважнага і У. Стохеля. У іх артыкулах больш глыбока і ўсебакова разгледжана як творчасць самога паэта, так і яго сувязі з польскай літаратурай.

Я. Гушча з'яўляецца складальнікам анталогій беларускай паэзіі 1971 і 1978 гг., дзе большасць вершаў беларускіх паэтаў змешчана ў яго перакладах. Да першай ён напісаў прадмову. Я. Гушча актыўна выступае ў друку і з крытычнымі артыкуламі пра творчасць беларускіх паэтаў.

---

[1] Przyjaźń, 1972, N 39, c. 17.
[2] Poglądy, 1967, N 21, c. 15.
[3] Kierunki, 1975, N 20, c. 3.
[4] Przyjaźń, 1977, N 2, c. 17.

У прадмове да зборніка «Выбраныя вершы» (1974) І. Сікірыцкі гаворыць пра цесныя сувязі М. Танка з Польшчай, пра яго пераклады польскай паэзіі. У зборніку большую частку займаюць вершы 50-70-х гадоў, і таму крытык разглядае творчасць паэта гэтага, на яго думку, самага спелага перыяду. Лірыку М. Танка ён вызначае як «своеасаблівы і непаўторны лірычны дзённік, які хвалюе чытача багаццем перажыванняў, інтымнай шчырасцю, непасрэднасцю і майстэрствам у перадачы, здавалася б, самых тонкіх і самых складаных для выражэння пачуццяў, нарэшце, рэдкім уменнем свабоднага карыстання некалькімі своеасаблівымі паэтыкамі, з якіх... кожная з'яўляецца яго ўласнай; акрамя таго, не ў дробязах, а ў незвычайным спалучэнні свежасці і арыгінальнасці вобразаў з іх прастатой»[1].

Крытык гаворыць пра дасканаласць і разнастайнасць сучаснай творчасці М. Танка як па зместу, так і па форме, піша, што яго паэзія арганічна ўбірае ў сябе багацце беларускага фальклору і дасягненні сусветнай літаратуры. Ён піша пра вершы М. Танка, прысвечаныя дзецям.

І. Сікірыцкі адзначае, што «незвычайна багатая творчая індывідуальнасць беларускага паэта і дасканалае майстэрства дазваляюць яму ў аднолькавай ступені раскрываць як свет чыста лірычных уражанняў, так і пераважна з поспехам для сябе ўзбагачаць верш элементамі тонкай іроніі і цёплага, дабрадушнага гумару... Гэты спецыфічны гумар, вельмі часта падказаны паэтыкай беларускага фальклору, прыдае многім вершам Танка асаблівы каларыт і арыгінальнасць»[2]. І далей: «Не азначае гэта, што іншыя знешне простыя творы, у якіх паэт выказваецца пры дапамозе максімальна празаічнай фразы, таксама не хаваюць у сабе здрадлівых пастак. Тыя вершы не пазбаўлены дысцыпліны рытму, але часцей за ўсё заснаваны на складанай мелодыцы, не заўсёды прыдатнай для ідэальнага адлюстравання. І хоць у творах, асабліва апошняга перыяду творчасці Танка, з'явіліся новыя рытмы і новае гучанне, часта зусім адметныя ад традыцыйнай дысцыпліны сілаба-тонікі ці тонікі, аднак танальнасць, якая вынікае з народнай песні, па-ранейшаму дамінуе ў гэтым лірычным запісе. Таму што песня з'яўляецца крыніцай і мерай такой непаўторнай паэтыкі Максіма Танка»[3].

Ф. Няўважны шмат зрабіў апошнім часам у галіне даследавання сувязей польскай літаратуры з усходнеславянскімі літаратурамі. Шэ-

---

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane — Łódź, 1974, c. 7-8.
[2] Tank Maksim. Wiersze wybrane, c. 11.
[3] Там жа, c. 11-12.

раг артыкулаў ён змясціў у польскім друку і пра беларускую літаратуру. У прыватнасці, ім былі напісаны змястоўныя рэцэнзіі на зборнікі вершаў М. Танка «На шляху дзікіх гусей» і «Выбраныя вершы» (1974)[1].

Глыбокі аналіз паэзіі М. Танка і яго сувязей з польскай літаратурай даў Ф. Няўважны ва ўступным артыкуле да «Лісткоў календара» на польскай мове. Крытык звяртае ўвагу на сувязі М. Танка з Польшчай 30-х гадоў: гэта асабістае знаёмства з віленскімі польскімі паэтамі і публіцыстамі, праца ў газеце «Poprostu», удзел у народнафрантавым руху, яго сувязі з левымі польскімі пісьменнікамі, творчыя вечары ў Вільні і Варшаве, уплыў на творчасць беларускага паэта польскай літаратуры і г. д. У давераснёўскі, пасляваенны і ў цяперашні час польскія крытыкі пісалі ці ўспаміналі пра ўплыў на паэзію М. Танка 30-х гадоў рускай і польскай літаратур, гаварылі пра цесныя сувязі яго творчасці з жыццём беларускага народа, з беларускім фальклорам і беларускай літаратурнай традыцыяй. Ф. Няўважны адзначае таксама і сувязі беларускага паэта з польскай рэвалюцыйнай паэзіяй міжваеннага дваццаціголдзя, з творчасцю У. Маякоўскага. Якраз сувязь з рэвалюцыйнай паэзіяй і ўдзел М. Танка ў рэвалюцыйнай барацьбе выратавалі яго, паводле меркавання крытыка, ад уплываў шматлікіх паэтычных школ і кірункаў у польскай паэзіі 20-30-х гадоў. Польскі крытык адзначае, што творчасць М. Танка з'яўляецца арыгінальнай і высокамастацкай, што яна вельмі блізкая польскай літаратуры. Ён піша: «Размова ідзе тут не пра пераклады польскіх паэтаў, хоць гэта праца выканана з уласцівым яму майстэрствам і дастаткова высока ацэнена. Размова ідзе не пра захапленне беларускага паэта нашай рамантычнай паэзіяй, якое можна зразумець, калі пранікнеш у яго біяграфію. Размова ідзе пра больш глыбокія, істотныя сувязі Максіма Танка з польскай культурай і паэзіяй, пра яго роднасць з прагрэсіўным, рэвалюцыйным яе кірункам»[2]. Ф. Няўважны адзначае арганічную і надзвычай цесную сувязь пасляваеннай і сучаснай творчасці М. Танка з давераснёўскай, калі былі закладзены асновы яго будучай творчасці, калі быў выпрацаваны паэтам уласны стыль. Польскі крытык адзначае філасафічнасць сучаснай творчасці М. Танка: «Побач з напеўнымі класічнымі вершаванымі строфамі і памерамі ўсё часцей з'яўляецца верш вольны ці белы, нерыфмаваны,

[1] Nieuważny Florian. Poeta śpiewającej ziemi.— Nowe książki, 1966, N —, c. 663-665, 705; Chleb powszedni i źródlana woda.— 389 Przyjaźń, 1966, N 23, c. 11; Poetycki archipelag Maksima Tanka.— Nowe książki, 1975, N 23, c. 15-17.
[2] Tank Maksym. Kartki kalendarza.— Warszawa, 1977, c. 7.

якi абапiраецца на мелодыю i рытмiку, а таксама паэтычную парадаксальнасць вывадаў»[1].

Добрага слова заслугоўваюць таксама артыкулы Ф. Няўважнага, напiсаныя з нагоды прысуджэння ў 1978 г. М. Танку Ленiнскай прэмii СССР у галiне лiтаратуры, а таксама да 70-годдзя паэта[2].

У першым з iх крытык пiша, што паэзiя М. Танка 40-70-х гадоў вызначаецца не толькi разнастайнасцю праблематыкi i унiверсальнасцю, але i непаўторнай паэтычнай мовай, якая выяўляе як глыбокае лiрычнае пачуццё, так i думку, роздум, тонкую iронiю цi горкi сарказм. Ф. Няўважны адзначае, што беларускi паэт толькi знешне парывае з традыцыйнымi формамi верша. У сваёй паэзii ён дае своеасаблiвае, танкаўскае бачанне свету i людзей. «Яна (паэзiя М. Танка.— А. В.),— пiша Ф. Няўважны,— нясе ў сабе вялiкi зарад агульначалавечых праблем».

I далей: «Максiм Танк, як i ў часы ранняга юнацтва, з'яўляецца прыхiльнiкам паэзii, якая ўздзейнiчае на чытача праз пастаноўку перад iм пытанняў, палемiчнага завастрэння праблем з глыбокiм грамадска-фiласофскiм сэнсам... Паэзiя Танка шчырая i чалавечная, як поцiск далонi блiзкага нам чалавека. Мудрая i горкая, як словы парады бацькi, якi многа спазнаў у жыццi, зыказаныя сыну перад далёкай дарогай. Поўная дабраты i зачараванасцi жыццём, як лясная паляна, якая пахне травамi i напоўнена гудзеннем пчол i чмялёў. Уражлiвая i чуйная на самыя тонкiя змяненнi пачуццяў i перажыванняў, як жанчына, якая кахае i якую кахаюць i якая ўсведамляе сваё шчасце i адказнасць. Па-сапраўднаму народная, арганiчна беларуская, чыстая i празрыстая, як крынiца, i адначасова на дзiва унiверсальная, бо жывiцца сокамi самых вялiкiх дасягненняў сусветнай культуры. Нарэшце, натуральная, упiсаная непрыкметна, але моцна ў жыццё, удзельнiкам i тварцом якога з'яўляецца сам паэт».

У апошнi час польская крытыка iмкнецца даць праблемны аналiз паэзii М. Танка як у адносiнах формы, так i зместу. Па-новаму i глыбей разглядаюцца сувязi яго лiрыкi з польскай лiтаратурай. Аднак часцей за ўсё такiя польскiя вучоныя, як Б. Бялаказовiч, М. Чурак, З. Скiбiнская i iншыя, гавораць пра паэзiю М. Танка ў сувязi з даследаваннем iншых, больш агульных пытанняў[3].

---

[1] NieuważnyFlorian. Wpisana w życie.— Przyjaźń, 1978, N 27,. с. 6; Twórczość Maksima Tanka.— Trybuna Ludu, 1982, N 245, с. 4

[2] Там жа, с. 13.

[3] Przegląd humanistyczny, 1976, N 10/133, с. 43-69; Studia Polono-Slavica-Orientalia. Acta literaria II, 1975, с. 181-211; Literatury słowiańskie o drugiej wojnie światowej. Ossolineum, 1973, t. 1, с. 251-269.

Як пра творчасць М. Танка, так і ўвогуле пра беларускую літаратуру і беларуска-польскія літаратурныя сувязі пішуць у польскім друку (у тым ліку і ў беларускіх выданнях, якія выходзяць у Польшчы) беларускія пісьменнікі і літаратуразнаўцы Я. Брыль, П. Пестрак, А. Мальдзіс, У. Казбярук, Д. Бугаёў, В. Рагойша і іншыя, а таксама сучасныя беларускія пісьменнікі і крытыкі, якія жывуць у Польшчы. Напрыклад, цікавую гаворку пра творчасць беларускага паэта вядзе А. Баршчэўскі ў «Біяграфічных нататках», змешчаных у «Выбраных вершах» (1977) М. Танка. Ён жа з'яўляецца аўтарам уступнага артыкула да «Анталогіі беларускай паэзіі» (1978).

Польская крытыка апошніх гадоў адзначае ідэйна-тэматычную разнастайнасць паэзіі М. Танка, гаворыць пра багацце яе паэтычнай формы, пра цесныя сувязі творчасці паэта з жыццём беларускага народа. Вытокі гэтай творчасці бачацца ў беларускіх літаратурных і фальклорных традыцыях. Польскімі крытыкамі вызначаецца роля М. Танка ў сусветнай паэзіі. Пры ацэнцы сувязей творчасці беларускага паэта з польскай літаратурай разглядаюцца не толькі адносіны з польскім рамантызмам XIX ст. і авангардызмам міжваеннага дваццацігоддзя, але больш падрабязна характарызуюцца сувязі з дэмакратычнай і рэвалюцыйнай літаратурай 20-30-х гадоў, а таксама з сучаснай польскай паэзіяй.

Каб мець больш поўнае ўяўленне пра ўзаемаадносіны М. Танка з польскай літаратурай, неабходна разгледзець пераклады яго твораў на польскую мову.

Творчасць М. Танка карыстаецца выключнай папулярнасцю ў народнай Польшчы. Нельга не згадзіцца з У. Калеснікам, які папулярнасць творчасці М. Танка на польскай зямлі і высокі ўзровень польскіх перакладаў яго вершаў вытлумачвае не толькі працягласцю і багаццем сувязей беларускага паэта з польскімі літаратурамі, але і тым, «што паэтычны вопыт Максіма Танка ўключае многа з лепшых традыцый польскай і еўрапейскай мастацкай культуры, нацыянальная самабытнасць яго паэзіі цесна суадносіцца з агульначалавечым, а вобразна-выяўленчыя структуры, больш чым у каго, пераклікаюцца з эксперыментальнымі вобразамі сённяшняй польскай паэзіі»[1].

Гаворачы пра прапагандыстаў паэтычнага слова М. Танка ў Польшчы, у першую чаргу неабходна назваць К. А. Яворскага. У 1933 г. у Хэлме ён заснаваў часопіс «Kamena», на старонках якога

---

[1] Калеснік Уладзімір. Зорны спеў, с. 146-147.

друкаваліся творы прагрэсіўных паэтаў, значнае месца адводзілася рускай, украінскай і беларускай літаратурам.

К. А. Яворскі пачаў перакладаць творы М. Танка з 1938 г. Пра якасць яго перакладаў паэт так пісаў у сваім дзённіку: «Не знаю, ці быў калі Яворскі ў Беларусі, ці чуў калі нашу мову, але ў сваіх перакладах ён надзвычай дакладна перадае і рытм, і вобразнасць, і гучанне нашых вершаў» (6, 261).

У 1972 г. выйшаў трэці том дванаццацітомнага «Збору твораў» К. А. Яворскага, дзе былі змешчаны пераклады з украінскай, беларускай літаратур і з паэзіі народаў Каўказа. У гэтай кнізе творчасць М. Танка прадстаўлена паэмай «Каліноўскі», двума ўрыўкамі з паэмы «Нарач» («Люблю твае, Нарач, затокі і тоні», «Гарыць агонь, спакойна дрэмле Нарач») і 61 вершам.

У лепшых класічных традыцыях пераклаў К. А. Яворскі ўрывак з паэмы «Нарач». Напрыклад, заключная страфа ўрыўка «Люблю твае, Нарач, затокі і тоні» гучыць так:

Jak lubię twe burze, gdy wkoło sią błyska,
W nich czuję jak w pieśniach młodości porywy...
I chcę się piersiami przytulić tak blisko
Do czarnej od gniewu potężnej twej grzywy.[1]

У перакладзе верш гучыць гэтак жа велічна і ўрачыста, як і ў арыгінале. Гэта сапраўдны гімн магутным азёрным прасторам. Гераічным парываннням рамантычнага героя і яго бунтарнай натуры блізкае і дарагое бурнае, неспакойнае возера, якое ўвасабляе тую неадольную сілу, што гатова зруйнаваць і перайначыць стары свет, ачысціць яго ад зла і несправядлівасці.

Адным з першых перакладаў К. А. Яворскага з паэзіі М. Танка быў верш «Паслухайце, вясна ідзе»:

Słuchajcie: oto wiosna mknie
I w oknie mojem dzwonią kraty.
Wartownik w noce i we dnie
Pilnuje bzu pachnących kwiatów.

У арыгінале:

Паслухайце, вясна ідзе,
Звініць ў маім акне жалеза.
З вінтоўкай стражнік ноч і дзень
Пільнуе куст пахучы бэзу.

Вясна ўрываецца праз турэмныя краты ў камеру зняволенага. Усё навокал яна напоўніла сваім жыватворным дыханнем. Імкненне вяз-

---

[1] Jaworski K. A. Pisma — Lublin, 1972, t. 3, c. 259.

ня да свабоды, да жыцця выклікала ў яго такую балючую і такую значную асацыяцыю: стражнік пільнуе куст расцвіўшага бэзу.

Перакладчык дакладна ўзнавіў гукапіс верша, яго рытміка-інтанацыйную структуру, знайшоў надзвычай удалыя адпаведнікі: «mknie — ідзе», «w noce i we dnie — дзень і ноч». Здавалася б, ён захаваў сэнсавую важкасць і эмацыянальную папоўнєнасць апорнай рыфмы «жалеза — бэзу», адпаведна ў перакладзе «kraty — kwiatów». Сапраўды, вельмі змястоўнае супрацьпастаўленне: краты і кветкі. Здавалася б, «звоняць краты» больш выразнае, чым «звініць жалеза». Але на самай справе танкаўскі вобраз «звініць жалеза» нясе ў сабе значна большую паэтычную напоўненасць (каваць жалеза, звінець жалезам, катаваць жалезам і г. д.). Жалеза з'яўляецца тут нібыта сімвалам усяго нежывога, цвёрдага, жорсткага і страшнага.

У гэтым вершы з асаблівай сілай выявіўся танкаўскі рамантызм. І адначасова паэт выступае тут як суровы рэаліст. Якая горкая ўнутраная іронія закладзена ў сцвярджэнні, што стражнік займаецца нейкай недарэчнай, дзікай і нечалавечай работай: пільнуе куст пахучы бэзу. Нібы перашкаджае ўсяму жывому, новаму і маладому. А ў К. А. Яворскага стражнік пільнуе кветкі. Вядома, кветкі спакуслівыя, іх рвуць, таму іх трэба пільнаваць. Значыць, у перакладзе страчваецца тая сіла алагічнасці, якая скрыта надае вобразу стражніка адмоўны, іранічны і саркастычны характар. У перакладзе, на жаль, гэта не перададзена.

У наступнай страфе думка паэта развіваецца далей:

A te rozkwitły w ognia sznur,
Taki niebieski, wonny, miły;
Na drut kolczasty i na mur
Jak chustę płomień swój rzuciły.

Характэрна, што ў дванаццацітомным Зборы твораў К. А. Яворскага першы радок гучыць так: «Od nich ognisty płynie dur». Але наколькі далёкія і пачатковы варыянт перакладу і заключны ад такога простага і натуральнага арыгінала: «А ён расцвіў, агнём гарыць, такім пахучым, мяккім, сінім...» Добра, нам думаецца, узнавіў гэтыя радкі сучасны польскі перакладчык І. Сікірыцкі:

A bez juz kwitnie — miękkim, jasnym
I sinym ogniem wokół płonie[1].

Вясна прамікае ў камеру ў форме гукаў, пахаў і колераў. Прырода, якая абуджаецца, як бы наступае на калючыя і халодныя муры. І заканчваецца думка паэта ў заключнай страфе:

---

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane, c. 16.

Zbudziłem cicho innych z snu...
Od łez zsiniały oczy kwiatom.
I w chudych rękach tam i tu
Trzeszczały zardzewiałe kraty.[1]

Пераклад вытрыманы ў ранейшай танальнасці. Ён гучыць лёгка і гладка, але не нясе ў сабе таго выбуховага зараду, які заключаецца ў апошніх радках арыгінала:

І недзе хруснула ў худых
Руках іржавае жалеза.
*(1, 247)*

Трапяткі куст расцвіўшага бэзу абудзіў чалавека, прыдаў яму сілу і волю для далейшай барацьбы. У перакладзе К. А. Яворскага, на жаль, гэта не адчуваецца: прыватны выпадак не выйшаў за ўласныя лакальныя межы, не набыў, як арыгінал, належнага мастацкага абагульнення і значнасці.

Безумоўна, перекладаць такія рэдкія і унікальныя рэчы, як «Паслухайце, вясна ідзе», надзвычай цяжка, амаль немагчыма. Таму любыя няўдачы, якія напаткаюць у даным выпадку перакладчыкаў, яшчэ больш выразна выяўляюць сілу такіх твораў, іх геніяльнасць.

Тым не менш К. А. Яворскі пакінуў пасля сябе многа цудоўных перакладаў з паэзіі М. Танка, дзе ён імкнуўся максімальна, амаль даслоўна ўзнавіць лексічную, вобразную і рытміка-інтанацыйную структуру арыгінала. З давераснёўскіх вершаў паэта ён перакладаў у асноўным пейзажныя, напоўненыя глыбокім роздумам, сілаба-танічныя вершы: «У лесе», «Вырai», «Лісце каштанаў», «Пад мачтай», «Над вадой», «Скіну з плеч шырокіх», «Лірнік» і інш., звярнуў увагу на лірычпыя, інтымныя вершы «За пацалункі і за вочы», «З каласамі», «Над калыскай», «Калі пачуеш» і інш. У перакладах К. А. Яворскага М. Танк паўстае як глыбокі, пранікнёны паэт, як майстар пейзажнай, інтымнай і патрыятычнай лірыкі. Так, перакладчык удала ўзнавіў напеўную танальнасць верша «Над калыскай»:

Za oknami wiatru lekki wiew
Wciąż na parkan strząsa liście z drzew.
Mętnie gasną jesienne już dni.
Oj, sokole mój, nie płącz i śpij![2]

У арыгінале:

Вецер дрэвы калыша, кусты,
На паркан атрасае лісты.

[1] Sygnały, 1939, 15 sierpnia, c. 5.
[2] Jaworski K. A. Pisma, t. 3, c. 278.

Мутна гаснуць асеннія дні.
Ой, не плач ты, мой сокал, засні!
*(1, 283)*

Напеўны рытм трохскладовага анапеста ён перадае класічным дзевяцiскладовiкам, што вельмі дакладна ўзнаўляе рытміку арыгінала.

У перакладах К. А. Яворскага загучалі на польскай мове многія вершы М. Танка 40-60-х гадоў («З вяселля», «Селядцы з вершамі», «Маўчанне джунгляў», «З амфары гэтай даўно», «Парог, вычасаны з успамінаў», «Хоць раз у год», «Канюшына» і інш.). У іх адчуваюцца цёплы лірызм і глыбокая філасафічнасць, мяккі гумар і грамадзянскі пафас вершаў беларускага паэта.

Высокамастацкія пераклады даверасьнёўскіх вершаў М. Танка («Пад мачтай», «Руей», «Павязлі цягнікі», «Вільня», «На пероне», «Прайдуць гады» і інш) пакінуў пасля сябе Е. К. Вайнтраўб.

Е. К. Вайнтраўб перакладаў вершы, якія былі блізкія яго ўласным ідэйна-мастацкім пошукам і густу. Характару элегічнай і медытатыўнай лірыкі польскага паэта 30-х гадоў вельмі сугучны глыбока патрыятычны, прасякнуты болем за свой народ, за сваю зямлю верш М. Танка «На пероне». Заключная страфа гэтага верша — цэлая разгорнутая метафара:

Za zachód idą wagony:
Z lnem,
Żytem,
Sośniną i brzozą.
I patrzę, i patrzę spod dłoni
Jak naszą młodość wywożą.[1]

У арыгінале:

На захад ідуць цягнікі —
лён,
жыта,
сасна і бяроза...
Гляджу і гляджу з-пад рукі,
як моладасць нашу вывозяць.[2]

Е. К. Вайнтраўб перакладаў у асноўным глыбока лірычныя вершы М. Танка. Аднак ён даў дудоўны ўзор перакладу сатырычнага верша «Пачатак оды». Характэрна, што ў другім зборніку «Спроба вяртання» (1939) польскі паэт змясціў шэраг вершаў сатырычнага плана.

---

[1] Wejntraub Jerzy Kamil. Wiersze wybrane.— Warszawa, 1953, c. 212.
[2] Танк Максім. Пад мачтай.— Вільня, 1938, c. 47.

М. Танк і Е. К. Вайнтраўб былі асабіста знаёмы, вялі перапіску. Пазней, у 1940 г., польскі паэт адзін з раздзелаў сваёй паэмы «Харал сярод вэрхалу» прысвяціў М. Танку. А зімой 1941 г. ён стварыў лірычны верш «Да Максіма Танка, або Зімовы ліст пра беларускую восень». Памёр паэт у 1943 г. у акупіраванай фашыстамі Варшаве. У 1954 г. М. Танк напісаў верш «Адказ на пісьмо друга», прысвечаны яго памяці. У якасці эпіграфа ўзяты радкі з памянутага верша:

Калі-небудзь стрэнемся зноў.
Мяне Беларусь прывітае
Гулам сваіх трактароў
і песняй пагожага мая...

*(3, 23)*

У 40-70-я гады актыўнымі перакладчыкамі паэзіі М. Танка ў Польшчы з'яўляюдца Л. Левін, Т. Хрусцялеўскі, Б. Жыранік, Я. Гушча, М. Ю. Кананові́ч, І. Сікірыцкі і інш. Іх творы таксама неаднаразова гучалі на беларускай мове.

М. Танк надзвычай нацыянальны і самабытны мастак. Такім ён паўстае ў лепшых перакладах Л. Левіна, напрыклад верш «На шляху дзікіх гусей»:

Sny minione kształt przybrały lotny,
Z brzóz przydrożnych cieniami się splotły.
idę ścieżką w piasku i wybojach.
Kij, wędrownych torba wierszy moich —
Po więzieniach dźwigam swoje brzemię.
Ziemio moja, białoruska ziemio![1]

У арыгінале:

Сны, што мінулі, што засталіся са мною,
З ценьмі бяроз падарожных спляліся.
Іду па шляху пясчаным, няроўным.
Кій і торба песень вандроўных,
І ад астрога і да астрога плятусь —
Беларусь ты мая, Беларусь!

*(1, 99)*

Цікавы ў плане параўнання пераклад гэтага верша, выкананы Е. Путрамантам:

Sny, co minęły, sny, co zostały ze mną,
Z cieniami sosen rozstajnych się splotły.
Kij na plecach i torba pieśni na drogę,
Idę przez wydmy, kałuże, wyboje

---

[1] Tank Maksym. Na szlaku dzikich gęsi, c. 8.

I od celi do celi się wlokę,
Białorusi ty moja.[1]

Е. Путрамант захаваў размоўна-апавядальны характар верша, дакладна перадаў яго рытміка-інтанацыйны малюнак і ўскладненую вобразнасць. Пераклад текстуальна блізкі да арыгінала.

У перакладзе Л. Левіна, хоць і назіраюцца асобныя лексічныя разыходжанні з тэкстам арыгінала, верш гучыць музычна і натуральна. Заключныя ж радкі не страцілі сваёй афарыстычнасці і змястоўнасці. У іх захавана парная рыфма. А клічная форма слова «зямля» з яе вызначэннямі «мая», «беларуская», паўторанымі двойчы,— удалая знаходка перакладчыка. У гэтых радках надзвычайная кандэнсацыя думак і пачуццяў лірычнага героя. Тут адчуваюцца яго роздум і смутак, пяшчота і роспач, захапленне і боль.

Назіраюцца звычайна два прынцыпы падыходу пры перакладзе вершаў М. Танка. Адны перакладчыкі імкнуцца не парушыць сэнс арыгінала, другія стараюцца прыстасаваць яго да густаў і эстэтычных запатрабаванняў свайго чытача. Часам дасягаецца ўдалае спалучэнне гэтых прынцыпаў, як, напрыклад, у перакладах Л. Левіна: «Каб ведалі», «У чыстым полі», «Рукі маці», «Пяе пясок балтыйскіх дзюн», «Шчасце».

Т. Хрусцялеўскі па-майстэрску перакладае сатырычныя вершы, напоўненыя з'едлівым сарказмам, тонкай іроніяй, лагодным гумарам («Адказ», «Пачатак оды», «Роздум караля» і інш.), народнага ці баладнага характеру, сучасныя філасофскія вершы («Добры з ваўка музыка», «Балада», «Касмалогія», «Аднойчы я ішоў з Дантэ» і інш.).

Натуральна і спакойна пачынаецца верш «Пачатак оды»:

Z naręczy kwiatów modrych, białych,
Pleść wianki łatwo i wygodnie —
Wystarczy na to trochę sprytu
I bez odcisków gładkie dłonie...

Але вось інтанацыя змяняецца. Прыхаваная насмешка становіцца здзекліва-саркастычным сцвярджэннем:

I miękki kark — by zgiął się lekko,
I płetwy — abyś płynął z modą...
A wtedy nawet żabi skrzekot
Okrzyczą najwspanialszą odą.

У арыгінале:

І трохі больш мякчэйшых скабаў,
І рыбны хвост, каб плыць за модай,—

[1] Tank Maksym. Wiersze wybrane, c. 15.

Тады напеў балотнай жабы
Ахрысцяць небывалай одай!

Перакладчык не парушае сэнсавай і вобразнай структуры верша. Ён знаходзіць трапныя і дакладныя адпаведнікі (Król wieprzy, tuz obfitych zysków — Свіны кароль ці туз фабрычны, Postawi krzyżyk na nazwisku — I пад табой паставіць клічнік). З незвычайным майстэрствам узнаўляе заключныя радкі:

Oni to końcem nazywją,
Lecz dla mnie — to początek ody[1]

У арыгінале:

У іх канцом гэта завецца,
А ў мяне — пачаткам оды!

*(1, 267)*

Пераклад вытрыманы ў тым жа тоне, што і арыгінал.

Я. Гушча пераклаў: «Лірнік», «Спакойнай ночы!», «Венера Мілоская», «У чыстым полі», «Дзе яны?», «Нарачанскія лодкі» і інш. У «Венеры Мілоскай» ён раскрыў для польскіх чытачоў адну з істотных асаблівасцей паэтычнага таленту М. Танка:

I patrzę, jak stąpa tak lekkim krokiem,
Bez rąk. Czy je błyskawica skruszyła.
Żeby przed nieba i przed ziemi okiem
Piersi swoich nimi nie zasłoniła?![2]

У арыгінале:

Бачу: ідзе яна лёгкай хадою,
Рук няма. Пэўна, маланка скрышыла,
Каб перад небам і перад зямлёю
Імі грудзей сваіх не засланіла.

*(3, 121)*

Паэт глядзіць на багіню вачамі інтэлігента і селяніна, рэаліста і рамантыка, адначасова застаючыся сынам сваёй зямлі.

Аўтарам многіх надзвычай цікавых перакладаў («Мой хлеб надзённы», «Хата з краю», «Хоць раз у год», «Усё пачалося з іголкі» і інш.) з'яўляецца М. Ю. Кананові́ч, які ў асноўным звяртаецца да сучаснай лірыкі М. Танка, да вершаў інтэлектуальна-філасофскіх, роздумных. Часцей за ўсё гэта свабодны верш:

Trzeba,
Choć raz do roku.
Przejść boso bruzdą za pługiem,

---

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane, c. 20.
[2] Там жа, с. 57.

By odnowić
Swą dawną więź z rodziną—
Ziemią, kamieniami, trawą.[1]

У арыгінале:

Трэба,
Хоць раз у год,
Прайсці басанож баразною за плугам,
Каб аднавіць
Сваю даўнюю сувязь з раднёй —
Зямлёй, камянямі, травой.
*(4, 309)*

Свабодны верш М. Танка ў перакладзе М. Ю. Канановіча надзвычай блізкі да арыгінала.

Яшчэ ў 20-я гады пачаў перакладаць беларускую паэзію Б. Жыранік. Ён жа з'яўляецца складальнікам зборніка М. Танка «На шляху дзікіх гусей». З лірыкі паэта Б. Жыранік пераклаў: «Лірнік», «Рукі маці», «Вяртанне Шапэна», «У чыстым полі сваты блудзілі», «Мой хлеб надзённы», «Канцэрт у сене» і інш. Б. Жыранік дасканала ўзнаўляе асобныя мастацкія дэталі, вобразы, рытміка-інтанацыйныя нюансы перакладаемых твораў, захоўваючы пры гэтым іх сэнс і кампазіцыйную структуру.

Адным з актыўных сучасных перакладчыкаў паэзіі М. Танка з'яўляецца І. Сікірыцкі. Са шматлікіх яго перакладаў хочацца вылучыць верш «Ave Maria». Пераклад гэтага лірычнага шэдэўра можна аднесці да ліку творчых удач І. Сікірыцкага, хоць яму не ўдалося пазбегнуць некаторых пралікаў. Уступная страфа ўзноўлена на высокім ўзроўні. Яна гучыць узрушана, эпічна, з адценнем урачыстасці і роздуму, з унутраным адчуваннем нейкага драматызму:

Dzwon katedralny wzywa na Ave.
Z ciasnych zaułków z lewa i z prawa
Cisną się mniszki w czarnych habitach,
Ciągną żałosnym cieniem okryte.
Stara i młoda twarz mnie omija —
Ave, Maryja...

У арыгінале:

Звон кафедральны кліча на Ave.
З цесных завулкаў злева і справа
Гуртам манашкі ў чорным адзенні
Цягнуцца, быццам сумныя цені.

---

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane, c. 188.

Тут і старыя, і маладыя,—
Ave Maria...

У перакладзе амаль даслоўна ўзнаўляецца тэкст арыгінала, вельмі беражліва захаваны рытм і гукапіс, знойдзены ўдалыя лексічныя і вобразныя адпаведнікі. Гэтыя якасці ўласцівы ўвогуле для ўсяго перакладу.

Значная роля ў сэнсаваных і кампазіцыйных адносінах належыць заключным двум радкам строф:

Twarz czarnookiej smutek spowija —
Ave, Maryja...
Pierś jej wysoka i śnieżna szyja —
Ave, Maryja...
Tańcem byś mogła serca podbijać —
Ave, Maryja...

У арыгінале:

Чорныя вочы, бровы густыя,—
Ave Maria!
Смуглыя рукі, грудзі тугія,—
Ave Maria!
Як танцавалі б ножкі такія,—
Ave Maria!

Голас паэта паступова ўзмацняецца, яго пачуцці дасягаюць кульмінацыйнага пункту:

О, як бы жалі рукі такія,—
Ave Maria!
О, як кармілі б грудзі такія,—
Ave Maria!

У перакладзе, на жаль, атрымаўся прыблізны і ў пэўнай ступені запаэтызавана-аслаблены пераказ гэтых радкоў:

Mogłabyś sierpem pyl z kłosów wzbijać —
Ave, Maryja...
Smukłe twe ręcę jęły przewijać —
Ave Maryja...

Выбух лірычных пачуццяў падмяняецца памяркоўным пералічэннем думак паэта. Аднак у заключнай страфе перакладчык шмат у чым кампенсаваў свой часовы пралік:

Być może, szepcząc swoją modlitwę,
Mógłbym zwyciężyć, wygrać tę bitwę.
Lecz ją wezwano; z ciężkim westchnieniem
Mniszka odeszła pod to sklepienie,
Gdzie w mrocznej celi życie jej mija —

Ave Maryja!..[1]

У арыгінале:

Не знаю, можа, мая малітва
Выйграць бы мне памагла гэту бітву,
Але пазвалі яе; манашка
Пайшла за ўсімі, ўздыхнуўшы цяжка,
Над зводы змрочныя і глухія,—
Ave Maria!..

*(3, 129-130)*

Верш прасякнуты болем паэта, але ў той жа час у ім уславляюцца веліч і прыгажосць чалавека, вядзецца барацьба за яго духоўную свабоду, за яго жыццё. Цудоўная алітэрацыя (Не знаю, можа, мая малітва — Być może, szepcząc swoją modlitwę) значныя па сэнсу рыфмы (малітва — бітву, манашка — цяжка, глухія — Maria) адпаведна ў перакладзе (modlitwę — bitwę, westchnieniem — sklepienie, mija — Maryja) пераконваюць, наколькі часам далёкія ці нават супрацьлеглыя па значэнню і блізкія па гучанню словы могуць набыць у пэўным кантэксце асаблівую эмацыянальную выразнасць і стварыць значную кандэнсацыю думкі. У перакладзе надзвычай дакладна перададзены інтанацыйныя і сінтаксічныя паўзы, захаваны таксама літаратурны перанос у трэцім радку.

Бывала, што асобныя вершы М. Танка перакладалі некалькі аўтараў. Напрыклад, верш «Лірнік» -— К. А. Яворскі, Я. Гушча і Б. Жыранік, «Паслухайце, вясна ідзе» — К. А. Яворскі і І. Сікірыцкі, «Каб ведалі» — Т. Хрусцялеўскі і Л. Левін, «Мой хлеб надзённы» — М. Ю. Кангановіч, Б. Жыранік і Л. Левін і г. д. Кожны пераклад па-свойму цікавы і каштоўны.

Ёсць і такія вершы, якія перакладзены толькі адным аўтарам. Некаторыя з іх вытрымалі выпрабаванне часам, і ў перакладзе яны вызначаюцца мастацкай дасканаласцю. Гэта «Павязлі цягнікі» і «Руёй» (пер. Е. К. Вайнтраўба), «Камяні» (пер. Л. Пастарнака) і інш.

Многія паэтычныя радкі М. Танка ў перакладзе на польскую мову чаруюць, як і ў арыгінале, дасканаласцю, глыбінёю думак і пачуццяў, афарыстычнасцю і лёгкасцю гучання, напрыклад «Я гляджу на дываны» (пер. І. Сікірыцкага). Лірычны герой глядзіць на ўсходнія дываны ў лаўцы купца-татарына, і раптам:

A w kącie, w półcieniu, jak gdyby schowane
Kołyszą się niwy kwieciste i bratki...
No, powiedz mi, ile chcesz za te, za lniane —

---

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane, s. 59-60.

Za pieśni i dumki, za bajki mej matki?[1]

Тут лірычны выбух пратэстў, тут захапленне паэта неацэнным, непрадажным, вечным і прыгожым мастацтвам свайго народа. Гэта адна з граней таленту М. Танка, яго творчай манеры. Па сваіх ідэйна-эстэтычных якасцях верш «Я гляджу на дываны» знаходзіцца ў шэрагу такіх твораў, як «Казка пра Музыку», урывак пра музыканта Куліка з паэмы «Янук Сяліба», «Люцыян Таполя» і інш., дзе вырашаецца пытанне аб ролі мастака і мастацтва ў грамадстве.

Захапляюць таксама наступныя радкі з верша «Палякам» у перакладзе І. Сікірыцкага:

Bliski nam waszej mowy dźwięk —
Natchniony Szopen i Mickiewicz.[2]

У арыгінале:

Нам блізкі вашай мовы гук —
Шапэн натхнёны і Міцкевіч.

*(1, 388)*

Ці з верша «Спакойнай ночы» ў перакладзе Л. Левіна:

Wiosenny wieczór. Trele słowicze.
Spokojnej nocy — dziś wszystkim życzę.[3]

У арыгінале:

Вечар вясенні. Месяц над гаем.
Спакойнай ночы! — ўсім я жадаю.

*(2, 438)*

Польскія перакладчыкі праяўляюць асаблівую зацікаўленасць да тых вершаў М. Танка, якія ідэйна і тэматычна звязаны з Польшчай.

Творчасць М. Танка багата і шырока прадстаўлена на польскай мове як у ідэйна-тэматычных, так і ў жанрава-стылявых адносінах. Гэта рэвалюцыйныя вершы давераснёўскага часу і сучасная філасофская лірыка, грамадзянскія, публіцыстычныя і сатырычныя вершы, а таксама творы, моцна звязаныя з фальклорнай традыцыяй.

Аднак на польскай мове не надрукаваны пакуль што поўны пераклад паэмы «Нарач», не перакладзена паэма «Янук Сяліба». Хацелася б таксама ўбачыць больш перакладаў з паэзіі М. Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Шкада, што не перакладзены на польскую мову такія хрэстаматыйныя вершы 30-х гадоў, як «Не забывай», «Эстрады», «Акт першы», «Песня кулікоў», «Да дня» і інш. Верш «Спатканне» быў,

[1] Tank Maksim. Wiersze wybrane, c. 24.
[2] Там жа, с. 27.
[3] Tank Maksym. Na szlaku dzikich gęsi, c. 39.

праўда, перакладзены ў 1948 г. В. Даманскім[1], але на нізкім мастацкім узроўні. Названыя творы асвяцілі б новыя, вельмі істотныя грані таленту паэта, дапамаглі б глыбей зразумець сацыяльныя і нацыянальныя вытокі яго паэзіі. Пры агульным высокім узроўні паэтычных перакладаў М. Танка на польскую мову ў іх, на жаль, назіраюцца часам відавочныя страты ці недахопы.

Характарызуючы пераклады твораў М. Танка на польскую мову, варта звярнуць увагу і на «Казку пра Музыку» ў перакладзе З. Фядэцкага, Я. Мяткоўскага і Т. Монгірда. У творы захавана размоўная, апавядальная інтанацыя, уласцівая арыгіналу. М. Танк, як і А. Міцкевіч у «Баладах і рамансах», смела і ўдала выкарыстоўвае ў «Казцы пра Музыку» мастацкія вобразы і прыёмы беларускага фальклору.

Блізка да арыгінала перададзены дыялог царскіх слуг, якія пачулі ігру Музыкі, а таксама сон Музыкі. Але асабліва дасканала ўзноўлена сцэна ігры Музыкі:

Wnet wszystkie dźwięki jakby żywe
Pod jego ręką przemówiły:
Głosem skowronka w bujnym życie,
To znów słowiczym trelem czułym,
I trwożną wilgą gdzieś w rokicie,
I szarą w gąszczu drzew zazulą,
A potem żniwne pieśni drżały,
Wiatr strzech czuprynił złotą słomę,
Roztrącał w Niemnie pianę białą
I... urwał grę akordem gromu.
A echo długo jeszcze grało,
Aż zmilkło w ciemnym starym borze...[2]

У гэтым урыўку выразна адчуваюцца фальклорныя традыцыі і нацыянальныя літаратурныя, у першую чаргу традыцыі «Сымона-музыкі» Я. Коласа. Аднак, нам думаецца, урывак сваёй мастацкай дасканаласцю, музычнасцю і нават зместам у пэўнай ступені блізкі да вядомага апісання ігры Войскага на розе ў «Пане Тадэвушы» А. Міцкевіча, што таксама магло станоўча ўздзейнічаць на якасць перакладу.

У перакладах на польскую мову М. Танк паўстае як таленавіты, шматгранны і самабытны мастак. Творчасць беларускага паэта

---

[1] Niedziela na wsi, 1948, N 12, c. 6.
[2] Tank Maksym. Bajka o Muzyce.— Warszawa, 1951, c. 19.

прадстаўлена на польскай мове шырока і ўсебакова як па зместу, так і па форме.

Разглядаючы пераклады вершаў М. Танка на польскую мову, можна заўважыць, што ў даверасня ўскі час польскіх перакладчыкаў прываблівалі пераважна творы рэвалюцыйныя, інтымныя і пейзажныя, дзе назіралася цяга да новай вершаванай паэтыкі XX ст., тыя творы, у якіх адчувалася сувязь з паэтыкай вуснай народнай творчасці.

У пасляваенныя гады, прыкладна да пачатку 60-х, перакладаліся ў асноўным тагачасныя сілаба-танічныя вершы і некаторыя давераснеўскія творы. З сярэдзіны 60-х гадоў, па-ранейшаму звяртаючы ўвагу на фальклорную аснову многіх вершаў М. Танка, польскія перакладчыкі часцей за ўсё аддавалі перавагу свабодным, рытмічна разняволеным творам.

У 70-я гады з'явіліся новыя пераклады вершаў 30-х гадоў, перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных гадоў. Адбываецца як бы новае адкрыццё творчасці паэта.

Паэзія М. Танка шырока прадстаўлена ў Польшчы. Пераклады яго твораў пашыраюць сферу ўплыву беларускай літаратуры, садзейнічаюць больш плённаму ўзаемадзеянню беларускай і польскай літаратур.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Сувязі М. Танка з польскай літаратурай багатыя і разнастайныя. Авалодваючы сакрэтамі паэтычнага майстэрства, мастак адчуў прыкметнае ўздзеянне польскай, рамантычнай паэзіі XIX ст. Яму ў першую чаргу была блізкай паэзія прагрэсіўных польскіх рамантыкаў А. Міцкевіча і Ю. Славацкага. Тым не менш адносіны паэта нават да іх творчасці былі шмат у чым крытычнымі. Ён выступаў супраць культу А. Міцкевіча, створанага афіцыйнай Польшчай. У новых гістарычных умовах адстойваў не толькі нацыянальную, але і сацыяльную свабоду свайго народа.

Ствараючы новыя формы мастацтва, паэт, з аднаго боку, свядома адштурхоўваўся ад традыцыйнай паэтыкі, з другога — яго прываблівала мастацкая і агульначалавечая каштоўнасць твораў А. Міцкевіча і Ю. Славацкага.

На характар і ступень засваення М. Танкам традыцый рамантычнай паэзіі (рускай, польскай, украінскай) уплывалі таксама асаблівасці яго таленту (паэта-рэаліста і адначасова паэта-рамантыка), умовы, у якіх развівалася заходнебеларуская літаратура, а таксама агульныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскай паэзіі ў 20-30-я гады. У асобных вершах першай палавіны 30-х гадоў назіраецца знешняе засваенне маладым паэтам розных традыцый: «старой» рамантычнай і «новай» пралетарскай паэзіі.

У 60-70-я гады паглыбіўся філасофскі пачатак у паэзіі М. Танка. Таму ён выяўляе ў гэтыя гады прыкметную цікавасць да філасофічнай, глыбока інтэлектуальнай паэзіі Ц. Норвіда.

У сучаснай паэзіі М. Танка вельмі цесна пераплятаюцца традыцыйнае і наватарскае. Традыцыі польскага рамантызму засвоены ім глыбока, творча, яны арганічна ўвайшлі ў яго паэзію.

Паэзія М. Танка 30-х гадоў развівалася ва ўмовах, блізкіх да тых, у якіх існавала беларуская літаратура ў пачатку XX ст. Аднак у новых гістарычных умовах паэт па-новаму раскрыў праяўленне духоўнага жыцця беларускага народа, паказаў рост яго рэвалюцыйнай свядомасці. М. Танк стаў не толькі рэвалюцыйным і нацыянальным паэтам, але заняў належнае месца сярод выдатных майстроў мастацкага слова ў славянскіх літаратурах.

Даследаванне ў параўнальна-супастаўляльным плане паэзіі М. Танка 30-х гадоў і творчасці буйнейшых польскіх пралетарскіх паэтаў У. Бранеўскага і Б. Ясенскага дазваляе больш дакладна вызначыць ролю і месца М. Танка ў беларускай, а таксама ў прагрэсіўнай еўрапейскай паэзіі 30-х гадоў. Як творчасць гэтых паэтаў, так і

творчасць М. Танка развівалася пад прыкметным уздзеяннем паэзіі У. Маякоўскага і С. Ясеніна.

Існуе тыпалагічная роднасць паміж творчасцю У. Бранеўскага і М. Танка, якая выявілася ў глыбокім спалучэнні страснага публіцыстычнага пафасу і пранікнёнага лірычнага пачуцця. Абодва паэты выступілі сапраўднымі наватарамі ў паэзіі. Гэта выявілася як у тэматыцы, так і ў аратарскіх закліках, няроўным і абрывістым рытме маналогаў. У. Бранеўскі і М. Танк арыентаваліся ў сваёй лірыцы на інтанацыю і рытмічны лад гутарковай мовы. Многія іх вершы адзначаны глыбінёй псіхалагічнага перажывання і эмацыянальнага напружання, праўдзівасцю мастацкіх вобразаў, выразнасцю і разнастайнасцю рытмікі.

У паэзіі Б. Ясенскага беларускага паэта прывабілі тыя яго творы, дзе назіралася імкненне вызваліцца ад футурыстычнай паэтыкі. Блізкія ідэйныя і мастацкія задачы ставілі Б. Ясенскі ў паэме «Слова пра Якуба Шэлю» і М. Танк у сваіх эпічных творах. Вывучэнне ў параўнальным плане «Слова» з даверасregisterнёўскімі творамі М. Танка, асабліва з паэмай «Нарач», дазваляе глыбей зразумець тыя пошукі, якія вёў беларускі паэт у галіне вобразнасці, строфікі, рытмікі, у галіне выкарыстання ў сваёй творчасці фальклору.

Паэт у 30-я гады выказваў цікавасць да паэзіі авангардыстаў, што, асабліва ў пачатковы перыяд творчасці, пашырала яго ўяўленне пра мастацка-выяўленчыя магчымасці літаратуры. У другой палавіне 30-х гадоў мастак творча выкарыстоўваў асобныя паэтычныя прыёмы авангардысцкай паэтыкі. Творчасць М. Танка звязана з жыццём народа і з'яўляецца рэвалюцыйнай. Паэт выступаў за тую паэзію, вартасць якой залежыць «не ад слоўнай і рытмічнай эквілібрыстыкі, але — ад думкі».

Вывучэнне шматлікіх перакладаў М. Танка пашырае наша ўяўленне пра творчую індывідуальнасць мастака. У яго перакладзе загучалі на беларускай мове творы многіх савецкіх і прагрэсіўных замежных паэтаў.

Мастацкі пераклад пачынаючы з 30-х гадоў становіцца арганічнай часткай творчага жыцця М. Танка. Паэт перакладае духоўна блізкія яму вершы. На характар выбару твораў для перакладаў уплываюць асаблівасці арыгінальнай творчасці паэта ў той ці іншы перыяд. У сваіх перакладах М. Танк па-майстэрску ўзнаўляе ідэйна-сэнсавую аснову, вобразную структуру і рытм арыгінала.

Перакладам твораў М. Танка на польскую мову належыць у беларуска-польскіх літаратурных сувязях асабліва важная роля. Творчасць

беларускага паэта была заўважана польскімі перакладчыкамі і крытыкамі ўжо ў другой палавіне 30-х гадоў.

Шматлікія пераклады твораў М. Танка і крытычныя артыкулы пра яго творчасць з'явіліся ў друку народнай Польшчы, выйшлі кнігі паэта.

Творчасць М. Танка шырока і багата прадстаўлена на польскай мове. Яна дае ўяўленне пра ідэйна-тэматычную разнастайнасць і багацце паэтычнай формы яго твораў.

Выключная папулярнасць паэта ў Польшчы тлумачыцца не толькі яго незвычайна цеснымі сувязямі з прагрэсіўнай польскай культурай і літаратурай, асабістым знаёмствам і дружбай мастака з польскімі літаратарамі, шматлікімі перакладамі з польскай паэзіі і пэўнай блізкасцю мастацкіх пошукаў, якія вядуць ён і сучасныя польскія паэты, але і тым, што паэзія М. Тапка з'яўляецца пацыянальнай і адначасова агульначалавечай, яна вызначаецца мастацкай дасканаласцю і высокай паэтычнай культурай. Сапраўдная грамадская актыўнасць, пільная ўвага да сацыяльнага і духоўпага жыцця чалавека, маштабнасць мыслення, імкненне да пастаяннага творчага абнаўлення — вось яе вызначальныя рысы.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

**ЗМЕСТ**

Уступ
Аб традыцыях польскага рамантызму ў творчасці Максіма Танка
На шляхах рэвалюцыйнага яднання
Нам блізкі вашай мовы гук
Паэзія Максіма Танка ў Польшчы
Заключэнне

АНАТОЛИЙ ЛЕОНИДОВИЧ ВОРОБЕЙ

МАКСИМ ТАНК И ПОЛЬСКАЯ ЛИТЕРАТУРА

Издательство «Наука и техника»
На белорусском языке
Рэдактар М. М. Дубоўская.
Мастак А. А. Васільеў.
Мастацкі рэдактар Л. І. Усачоў.
Тэхнічны рэдактар А. В. Скакун.
Карэктар И. В. Кудрэйка.
ІБ № 1351.

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР. Здадзена ў набор 08.12.83. Падпісана ў друк 27.0.1.84. АТ 18541. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Друк. арк. 3,75. Ум. друк. 6,30. Ум. фарб.-адб. 6,51. Ул.-выд. арк. 6,7. Тыраж 1000 экз. Заказ № 1У53. Цана 85 к. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, Лейінскі праспект, 68. Друкарня імя Францыска (Георгія) Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220600. Мінск, Ленінскі праспект, 63.